Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!

Літаратура і мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ПЯТНІЦА, 13 верасня 1985 г. № 37 (3291) ⊙ Выходзіць з 1932 г. ⊙ Цана 10 кап.



Старшы лабарант Інстытута бульбаводства і плодаагароднiцтва Міністэрства сельскай гаспадаркі БССР Г. Глінская і малодшы супрацоўнік Інстытута А. Сямашка збіраюць ураджай у Самахвалавіцкім калекцыйным садзе.

Фота М. МІНКОВІЧА.

Унумары:

Міхась СТРАЛЬЦОЎ

КАЛІ ГАВАРЫЦЬ ПРА ЖАНРЫ

ЧЫТАЦКІ ДЗЕННІК ПІСЬМЕННІКА

●

ПАЭЗІЯ

НОВЫЯ ВЕРШЫ

Валянціна ТАРАСА

Яўгена МІКЛАШЭЎСКАГА

●

Валянціна КУЛЯШОВА

З «КНІГІ ПРА БАЦЬКУ»

●

Пераклады Турсын ЖУРТБАЕЎ

ДРЭВА БУДУЧЫНІ

АПАВЯДАННЕ

●

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

«Мы, народы аб'яднаных нацый...»

З ДАЛЕКІХ І БЛІЗКІХ ДАРОГ

ІНФАРМАЦЫЙНАЕ ПАВЕДАМЛЕННЕ

аб пленуме Цэнтральнага Камітэта Кампартыі Беларусі

У Мінску 11 верасня адбыўся XXIV пленум ЦК Кампартыі Беларусі.

Заслухана інфармацыя аб ходзе выканання партыйнымі арганізацыямі рэспублікі пастановы ЦК КПСС «Аб далейшым паляпшэнні партыйнага кіраўніцтва камсамолам і павышэнні яго ролі ў камуністычным выхаванні моладзі» і рашэнняў XX пленума ЦК КП Беларусі па гэтаму пытанню. З паведамленнем выступіў другі сакратар ЦК КПБ Г. Г. Барташэвіч.

У абмеркаванні пытання прынялі ўдзел В. Ф. Кебіч— другі сакратар Мінскага абкома КПБ; Л. Т. Крашчанок— майстар вытворчага навучання ГПТВ № 57 г. Віцебска; В. В. Гурын — першы сакратар ЦК ЛКСМБ; У. А. Заламай — першы сакратар Баранавіцкага гаркома КПБ; А. М. Зінкевіч — дырэктар племзавода «Рось» Ваўкавыскага раёна.

Па абмеркаванаму пытанню прынята пастанова.

На пленуме выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі М. М. Слюнькоў.

Пленум выключыў кандыдата ў члены ЦК КП Беларусі, былога першага сакратара Мазырскага РК КПБ П. С. Багіно з членаў КПСС за праступкі, несумяшчальныя са званнем камуніста.

ПАВЫШАЦЬ ДЗЕЙСНАСЦЬ СПАБОРНІЦТВА, ШЫРОКА ЎКАРАНЯЦЬ ПЕРАДАВЫ ВОПЫТ

Па выніках Усесаюзнага сацыялістычнага спаборніцтва за паспяховае правядзенне зімоўкі жывёлы, павелічэнне вытворчасці і закупак прадуктаў жывёлагадоўлі ў зімовы перыяд 1984-85 года Беларуская ССР у ліку шасці саюзных рэспублік прызнана пераможцай і ўзнагароджана Ганаровай граматай ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

11 верасня ў Мінску адбыўся рэспубліканскі сход партыйнага, савецкага, прафсаюзнага і камсамольскага актыву сумесна з прадстаўнікамі працоўных калектываў, прысвечаны ўручэнню высокай узнагароды. У прэзідыуме знаходзіліся кіраўнікі Кампартыі Беларусі і ўрада рэспублікі, першыя сакратары абкомаў КПБ і старшыні аблвыканкомаў, перадавікі і наватары сельскагаспадарчай вытворчасці.

Сход адкрыў першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі М. М. Слюнькоў.

З вялікім уздымам быў выбран ганаровы прэзідыум у саставе Палітбюро ЦК КПСС.

На сходзе выступіў член ЦК КПСС, міністр сельскай гаспадаркі СССР В. К. Месяц.

Пад гарачыя апладысменты залы В. К. Месяц уручыў Ганаровую грамату ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ.

Узнагароду прынялі таварышы М. М. Слюнькоў, І. Я. Палякоў, намеснік Старшыні Савета Міністраў БССР А. А. Рэут, сакратар Белсаўпрофа М. І. Рош, першы сакратар ЦК ЛКСМБ В. В. Гурын, аператар машыннага даення племзавода «Карэлічы» Карэліцкага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы Т. У. Чубрык, свінарка калгаса «Чырвоны сцяг» Асіповіцкага раёна, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР В. Р. Лягуцкая, даярка калгаса «Ленінскі шлях» Слуцкага раёна, заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР К. С. Савановіч, дырэктар саўгаса «Ляхавіцкі» Ляхавіцкага раёна, дэпутат Вярхоўнага Савета БССР А. І. Вітко.

Затым на сходзе выступіў першы сакратар ЦК Кампартыі Беларусі М. М. Слюнькоў.

Гарачыя словы ўдзячнасці за высокую ацэнку працы жывёлаводаў, усіх работнікаў сельскай гаспадаркі рэспублікі выказалі старшыня Віцебскага аблвыканкома У. П. Кулакоў, першы сакратар Шчучынскага райкома КПБ В. І. Казяк, аператар машыннага даення саўгаса «Брылёва» Гомельскага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы З. Д. Мохарава, дырэктар саўгаса «Парахонскі» Пінскага раёна Д. Д. Руцкі, галоўны заатэхнік калгаса імя Фрунзе Шклоўскага раёна А. К. Халянкова, старшыня калгаса «Шлях да камунізму» Гродзенскага раёна І. П. Сянько, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі Капыльскага райвыканкома У. В. Сасноўскі. Яны запэўнілі: працаўнікі беларускай вёскі прыкладуць усе сілы, выкарыстаюць набыты вопыт, каб працаваць яшчэ больш эфектыўна.

Удзельнікі сходу з натхненнем прынялі прывітальнае пісьмо Цэнтральнаму Камітэту Камуністычнай партыі Савецкага Саюза, Савету Міністраў СССР.

БЕЛТА.

Удзельнікам і гасцям пятай Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу

Урад СССР сардэчна вітае ўдзельнікаў і гасцей пятай Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу! Яе высакародны дэвіз «Кніга на службе міру і прагрэсу» як нельга лепш выражае гуманную сутнасць сапраўднага прызвання літаратуры — несці людзям веды, багацце чалавечага вопыту, натхненныя духоўныя каштоўнасці, будаваць масты ўзаемнага разумення паміж людзьмі і народамі, адстойваць справядлівасць і мір. Іменна гэтым мэтам служыць савецкая кніга. Яна нясе праўду аб нашай Радзіме ва ўсе куткі планеты — праўду грамадскага прагрэсу і гуманізму.

Цяперашняя Маскоўская кніжная выстаўка-кірмаш праходзіць у асаблівы год — год саракагоддзя Перамогі над фашызмам. Людзі Зямлі ведаюць, наколькі нязмерныя ахвяры, якімі аплачан сённяшні мір. Вялікія страты сусветнай культуры, якія панесла чалавецтва ад фашысцкіх вандалаў, што спальвалі кнігі на кастрах. Урокі гісторыі клічуць усіх нас да найвялікшай адказнасці за лёс свету, за лёс цывілізацыі, за будучыню чалавецтва.

Савецкі Саюз паслядоўна і рашуча выступае за тое, каб аздаравіць міжнародную абстаноўку, адвесці ваенную небяспеку, што навісла над светам, пакласці канец гонцы ўзбраенняў, робіць усё, што ад яго залежыць, каб не ўпусціць любую магчымасць павярнуць развіццё падзей да лепшага.

Кніга, якая мае магутную сілу, адлюстроўвае вопыт і спадзяванні пакаленняў, высакародныя мэты і надзеі, можа многае зрабіць для згуртавання ўсіх сумленных людзей у барацьбе за забеспячэнне міжнароднай бяспекі, за мір і дружбу паміж усімі народамі.

Няхай традыцыйная Маскоўская кніжная выстаўка-кірмаш, што стала адным з пераканаўчых пацвярджэнняў выканання Савецкім Саюзам Заключнага акта Хельсінкскай нарады па бяспецы і супрацоўніцтву ў Еўропе, аб'ядноўвае ўсіх выдаўцоў і распаўсюджвальнікаў кнігі ў барацьбе за ўсталяванне сапраўднага гуманізму, сацыяльную справядлівасць, за поўную і канчатковую ліквідацыю ядзернай пагрозы на ўсім зямным шары.

Савет Міністраў СССР жадае ўдзельнікам і гасцям пятай Маскоўскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу новых поспехаў у супрацоўніцтве на карысць міру і прагрэсу!

САВЕТ МІНІСТРАЎ СССР.

ВЫСТАЎКІ

У Доме кіно адкрылася персанальная выстаўка мастака-пастаноўшчыка студыі «Беларусьфільм» Аляксандра Чартовіча. Прадстаўлена каля 50 работ — эскізаў дэкарацый да кінакарцін, партрэтаў, пейзажаў. Прыцягваюць увагу эскізы дэкарацый і раскадроўкі да такіх вядомых беларускіх стужак, як «Паводка», «Сад», «Дзікае паляванне караля Стаха», «Вянок санетаў», «Сустрэча ў канцы зімы» і іншых. Вядомы А. Чартовіч і як мастак-пастаноўшчык тэлевізійных стужак «Рыжы, сумленны, закаханы», «Гаспадар», «Зацішша».

Выстаўка А. Чартовіча карыстаецца заслужаным поспехам у аматараў жывапісу і ў кінематаграфістаў.

І. КРУПЕНЯ.

●

Выстаўка твораў старшыні Гродзенскага аддзялення Саюза мастакоў БССР скульптара Уладзіміра Церабуна адкрылася ў санаторыі «Летува» горада-курорта Друскінінкай. Яна арганізавана ў рамках культурных сувязей гродзенскіх і літоўскіх мастакоў.

Усе накірункі чалавечага быцця, яго найвялікшыя каштоўнасці—праца, каханне, патрыятызм, радасць жыцця, вернасць гісторыі — аўтар разглядае праз прызму падзей мінулай вайны. Гэта адчуваеш у насычаным грамадзянскім пафасам гісторыка-філасофскім трыпціху «Непераможныя», у прасякнутай мужнасцю і сілай скульптуры «Няскораны», ва ўсхвалявана-стрыманай кампазіцыі «Развітанне славянкі». Уражвае і застаецца ў памяці Маці, якая закрывае сваім целам дзіця, а разам з ім і ўсю зямлю, знявечаную пратэктарамі ваенных машын, гусеніцамі танкаў («Дарогамі вайны»). Узрушае гібель юнай жанчыны на хлебным полі (як на полі бою!) — «Апошняе жніво. Памяці жыхароў вёскі Алексічы, якія загінулі ў жніўні 1943 г.».

У творах мірнай тэматыкі, такіх, як «Летапісец», «Сымон-музыка», «Дрэва жыцця», «Надзея» і інш., гучыць мастакоўскі заклік берагчы і мацаваць мір.

Нечакана ўражваюць малюнкі скульптара, прадстаўленыя на выстаўцы пад агульнай назвай «Ракурс». Здавалася б, звычайныя эскізы-накіды адкрытага чалавечага цела (у пластыцы іх увасабленнем сталі цудоўныя дзяўчаты-алегорыі: «Пачатак», «Ноч», «Поўдзень», «Адпачынак», «Флора»), яны ў кантэксце экспазіцыі набылі самастойнае мастацкае значэнне. Перад гледачом разгортваецца серыя малюнкаў, у якіх праз дынамізм, экспрэсію, незвычайную выразнасць чалавечых фігур, праз амаль занядбаную сучасным мастацтвам прыгажосць чалавечага цела апяваецца радасць жыцця. Атрымліваеш сапраўды эстэтычную асалоду.

Асаблівай адзнакі вартыя прадуманасць экспазіцыі, збалансаванасць структуры гэтай адметнай выстаўкі, якую так і хочацца назваць: «Жыццё: яго радасць і каштоўнасці».

А. ГОСЦЕЎ.

●

Гродзенцы і госці абласнога цэнтра маюць магчымасць пазнаёміцца з выстаўкай жывапісу і графікі мастакоў горада Маладзечна. Сярод твораў, прадстаўленых у экспазіцыі, работы адной са старэйшых мастачак рэспублікі Я. Раздзялоўскай, серыя, якая нарадзілася ў выніку паездак па рэспубліцы і Прыбалтыцы вядомага жывапісца К. Харашэвіча.

Цікавыя пейзажныя імправізацыі паказалі маладыя аўтары А. Пашкевіч і В. Лазоўскі. Выстаўка дазволіла пазнаёміцца і з творчасцю графіка Ю. Герасіменкі-Жызнеўскага. Былі прадстаўлены яго ілюстрацыі да твораў Якуба Коласа, Васіля Быкава, Васіля Зуёнка і іншых пісьменнікаў, а таксама станковыя графічныя аркушы, пейзажы, партрэты, сярод якіх сваёй вобразнай дакладнасцю вызначаецца партрэт краязнаўца Г. Каханоўскага, які жыве ў Маладзечне.

Пераконваюць сваёй непаўторнасцю акварэлі М. Аўчыннікава.

Я. ШУНЕЙКА.

ТВОРЧЫ ВЕЧАР «МАЛАДОСЦІ»

Супрацоўнікі часопіса «Маладосць» рэгулярна сустракаюцца са сваімі чытачамі. Вось і нядаўна ў Доме літаратара адбыўся творчы вечар часопіса, арганізаваны сумесна з Беларускім тэлебачаннем. Пра зробленае, пра планы «Маладосці» на 1986 год расказалі галоўны рэдактар часопіса А. Грачанікаў, адказны сакратар Л. Дайнека, рэдактар аддзела паэзіі Я. Янішчыц, старшы літсупрацоўнік аддзела прозы В. Гігевіч.

Шматлікія ўдзельнікі вечара, настаўнікі, студэнты і школьнікі, вельмі цёпла сустрэлі выступленне народнага пісьменніка Беларусі І. Шамякіна. Ён сказаў, што даўно сябруе з маладзёжным часопісам, у свой час друкаваў у ім аповесць «Ах, Міхаліна, Міхаліна...», усе свае п'есы пра жыццё моладзі прапаноўваў «Маладосці».

Шчырымі воплескамі ўзнагародзіла зала ўсхваляваныя вершы П. Макаля і вершы ягонага маладзейшага таварыша па пяру К. Жука.

На вечары выступілі мастакі А. Марачкін і В. Маркавец, натхнёна спявалі В. Пархоменка і кампазітар У. Буднік. Студэнтка БДУ імя У. І. Леніна А. Сторажава і рабочы мінскага завода імя С. М. Кірава С. Адамовіч прачыталі свае новыя вершы. **Л. КЛІЧАЎСКІ.**

ПАСЯДЖЭННЕ БЮРО СЕКЦЫІ

Больш як 12 гадоў узначальваў секцыю дзіцячай і юнацкай літаратуры СП БССР П. Кавалёў. За гэты час секцыя здзейсніла значную работу па пашырэнні сваёй творчай і арганізацыйнай дзейнасці. Рэгулярна збіраліся сходы, пасяджэнні бюро секцыі, на якіх абмяркоўваліся рукапісы першых кніг маладых аўтараў, рабіліся даклады аб праблемах майстэрства, стылю, мовы, аб творах, якія адлюстроўваюць жыццё піянераў і школьнікаў, подзвіг савецкіх людзей у Вялікай Айчыннай вайне. Заўсёды гэтыя сходы і пасяджэнні праходзілі цікава і змястоўна, бо ў іх прымалі ўдзел такія вядомыя пісьменнікі, як Васіль Вітка, А. Васілевіч, Э. Агняцвет, С. Шушкевіч, П. Кавалёў.

На чарговым пасяджэнні бюро секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры Павел Кавалёў папрасіў, каб яго вызвалілі з пасады старшыні секцыі па стану здароўя. Просьба яго была задаволена.

Першы сакратар праўлення СП БССР Н. Гілевіч, сакратар праўлення Б. Сачанка ад імя праўлення Саюза пісьменнікаў горача падзякавалі П. Кавалёву за клопатную, самаадданую працу на пасадзе старшыні секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры, пажадалі яму плёну ў літаратурнай рабоце.

Старшынёй секцыі дзіцячай і юнацкай літаратуры абраны А. Вольскі.

На пасяджэнні бюро быў абмеркаваны рукапіс кнігі Ф. Казлоўскага, адрасаванай дзецям. У абмеркаванні рукапісу прынялі ўдзел М. Гамолка, А. Клышка, П. Кавалёў, М. Кенька, С. Шушкевіч, У. Машкоў, А. Вольскі.

ПРАДСТАЎЛЯЕ БЕЛАРУСЬ

Больш як пяцьсот кніг самай разнастайнай тэматыкі прадстаўлена ў раздзеле Беларускай ССР на пятай Міжнароднай кніжнай выстаўцы-кірмашы, якая адкрылася 10 верасня ў Маскве. Тут прадукцыя ўсіх дзесяці кніжных выдавецтваў рэспублікі. На стэндах творы К. Маркса і Ф. Энгельса, У. І. Леніна на беларускай мове, кнігі, прысвечаныя перамозе савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, літаратура аб сённяшнім дні рэспублікі.

Асобнае месца займаюць выданні, якія расказваюць аб дасягненнях нацыянальнай навукі і тэхнікі, падручнікі і навучальныя дапаможнікі. Вялікі раздзел адведзен мастацкай літаратуры, кнігам па музыцы, мастацтву, выданням зарубежных аўтараў, выпушчаным у БССР, — у перакладзе на беларускую мову толькі за апошнія гады выйшлі творы пісьменнікаў з 32 краін.

ДЗЕЙНАСЦЬ БЕЛАРУСІ Ў ААН

З кожным годам расце і мацуецца аўтарытэт Беларускай ССР на міжнароднай арэне. Асабліва плённая яе дзейнасць у Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, у якой яна з'яўляецца адной з дзяржаў-заснавальніц. Сёлета дэлегацыя БССР, як вядома, саракавы раз прыме ўдзел у рабоце Генеральнай Асамблеі ААН. І як заўсёды, БССР у сваёй дзейнасці будзе кіравацца мэтамі, задачамі і прынцыпамі, якія вызначаны Канстытуцыяй СССР, вынікаюць з палажэнняў савецкай знешняй палітыкі.

Пра ўдзел Беларускай ССР у рабоце гэтай аўтарытэтнай арганізацыі расказваецца ў кнізе У. Снапкоўскага «Беларуская ССР у ААН (1945—1985)», выпушчанай выдавецтвам «Навука і тэхніка». Аўтар падкрэслівае, што «поспехі Беларускай ССР на міжнароднай арэне, яе шматгранная дзейнасць у ААН — сведчанне трыумфу ленінскай палітыкі КПСС, гістарычных дасягненняў сацыялізму. Яны адлюстроўваюць рост яе аўтарытэту як унутры краіны, так і за яе межамі».

Кніга выдадзена да 40-годдзя (30 жніўня 1945 года) ратыфікацыі Прэзідыумам Вярхоўнага Савета БССР Статута ААН.

М. РАДЗЕНЯ.

ДЭКАДА БАЛГАРСКАЙ КНІГІ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ

Шмат год звязвае цесная дружба працоўных Магілёўшчыны і Габраўскай акругі Народнай Рэспублікі Балгарыі. Магіляўчане і габраўцы абменьваюцца дэлегацыямі, дзеляцца вопытам, дапамагаюць адзін аднаму. Праяўленнем гэтай дружбы стала традыцыйная на Магілёўшчыне дэкада балгарскай кнігі.

Вось і нядаўна на сход грамадскасці, прысвечаны адкрыццю сёлетняй дэкады балгарскай кнігі на Магілёўшчыне, завіталі ў абласную бібліятэку імя У. І. Леніна маладыя рабочыя і студэнты, пісьменнікі і журналісты, кнігалюбы, работнікі бібліятэк і кніжнага гандлю.

Адкрываючы гэтую ўрачыстасць, прарэктар педінстытута імя Аркадзя Куляшова, старшыня гарадской арганізацыі таварыства аматараў кнігі М. Аўласевіч расказаў аб дружбе і культурных сувязях працоўных нашай краіны і братняй Балгарыі, магіляўчан і габраўцаў. Намеснік дырэктара аблкнігагандлю Н. Маханькова сваё выступленне прысвяціла прапагандзе балгарскай кнігі ў рэспубліцы і, у прыватнасці, на Магілёўшчыне. Сакратар абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў І. Аношкін падзяліўся ўражаннямі аб паездцы ў Габрава, расказаў пра сумесную творчую дзейнасць літаратараў Габрава і Магілёва. Аб кніжных навінках у мясцовых магазінах і бібліятэках пра братнюю Балгарыю і балгарскіх пісьменнікаў расказалі работніца абласной бібліятэкі Г. Басалай і таваразнавец В. Васільева.

Тут жа, у зале, была разгорнута кніжная выстаўка «Балгарыя: росквіт літаратуры і мастацтва». Быў наладжаны гандаль кнігамі пра Балгарыю і балгарскіх пісьменнікаў. Дарэчы, многія чытачы набылі толькі што выдадзеную ў Мінску (выдавецтва «Беларусь») кнігу «Ад сэрца к сэрцу» пра дружбу працоўных Магілёўшчыны і Габрава, падрыхтаваную пісьменнікамі і журналістамі Габрава і Магілёва.

А. НОВІК.

ПРЭМ'ЕРЫ

Гродзенскі абласны тэатр лялек паказаў новы спектакль — «Калі квітнее рамонак» па п'есе балгарскага драматурга Рады Москавай. Рэжысура В. Корнева, лялькі і дэкарацыі зроблены па эскізах Л. Быкава, кампазітар — У. Прохараў. Сярод выканаўцаў роляў лялькаводы Г. Сібірцава, Л. Паўлоўская, Т. Лабор, В. Драгун і іншыя.

Тэкст і фота А. ШЫМАНОВІЧ.



З ПАЭТЫЧНАГА СШЫТКА

Валянцін ТАРАС

Дзеяслоў жыцця

Дом збудаваў і сына нарадзіў,
змяю забіў і дрэва пасадзіў—
усё зрабіў!
Але душа баліць,
бо могуць дом вар'яты падпаліць,
бо могуць сына нелюдзі забіць,
бо могуць дрэва дурні паваліць,
і гадаў новых трэба мне баяцца,
бо зноў яны па ўсёй Зямлі пладзяцца...

Дык што ж цяпер павінен я рабіць?

Дом бараніць, і дрэва бараніць,
як жыць на свеце, сына навучыць,
бо мусіць ён таксама пастарацца
змяю забіць і дрэва пасадзіць,
дом збудаваць і сына нарадзіць,
каб на Зямлі жыццю не абарвацца!

Памяці Саманты Сміт

Саманта, мілая дзяўчынка!
Загінуць у трынаццаць год!..
Выпадак страшны?
Ці злачынства?
Чаму разбіўся самалёт?

Няўжо такі знайшоўся звер,
такая подлая пачвара, —
забіў цябе
за твой давер
да ўсіх людзей зямнога шара,
за шчыры радасны пагляд,
якога не выносяць каты...

Сляпой нянавісці зарад
калечыць Злучаныя Штаты.
Калі і не забойства тут,
калі выпадак — не злачынства,
ўсё роўна
ад імя дзяцінства
планета вынесла прысуд
тым,
хто з багацця звар'яцеў,
праз грошы, золата, брыльянты,
хто з лютай хцівасці хацеў
пазбавіцца вачэй Саманты.

Загінула Саманта Сміт.
Не ўбачыць свет дзяўчынкі гэтай...
Але яе вачэй блакіт
застаўся ў небе над планетай.
Застаўся шчыры, ясны зірк,
які забойцы не выносяць...
Саманта літасці не просіць —
яна змагаецца за мір!

Настальгія

Пакінуў родны край мастак.
Шукае іншай долі.
Назад па спаленых мастах
не вернецца ніколі.
І ён спрабуе даказаць
сабе,
што з ім у прэчкі
пайшлі і лес і сенажаць
тутэйшыя,
і рэчкі,
і лістапад, і капяжы,
і росны луг буслiны,
і аніякае мяжы
няма між ім і імі,
бо ён у тайніку душы
правёз іх праз таможні.
У рукі пэндзаль—і пішы
і родны лес, і пожні.

Ну што ж, яно, і праўда, так.
Але чаму,
як лісце,
пажоўклі фарбы ўсе няўзнак,
мажорныя калісьці?
Тужлівай восені матыў
апанаваў карціны,
нібыта цвіллю іх пакрыў
і сеткай павуціны.
І што з таго, што грошы ёсць?
І з імі сэрца гіне,
бо засталася маладосць
і радасць
на радзіме.
Лужок буслiны дарагі
яго гукае дзесьці...
Ніколі паціну тугі
з палотнаў не саскрэбці.
І плача ён каля халстоў,
калі ніхто не чуе.
Вуголле спаленых мастоў
яго душу катуе...

Вальс-успамін

З часоў даваеннага Мінска
ляціць матылём успамін
аб мілым завулку дзяцінства,
дзе бэз расквітнеў і язмін.

Стаіць патэфон у альтанцы,
Шульжэнка з пласцінкі пяе,
і весела кружацца ў танцы
бацькі маладыя мае.

І тата вачэй не адводзіць
ад маміных ясных вачэй,
ён маму з «каленцамі» водзіць
і стан абдымае ямчэй.

Смяецца шчаслівая мама—
вясновая сінь уваччу!
І сам я смяюся таксама,
і ручку спружыны кручу.

Старанна заводжу спружыну,
пласцінкі мяняю бацькам,
і ў гэтую веру хвіліну,
што граю я музыку сам!

Не чую, што жорсткім жалезам
навала грукоча здаля...
Пад музыку вальса над бэзам—
бясхмарны палёт матыля.

Бацькі усміхаюцца сыну.
Ды раптам знікае напеў...
Бясхмарны матыль успаміну
жалобу на крылы надзеў.

Бо попелам стаўся жалобным
завулачак мілы даўно...
На чорную кветку падобны,
матыль заляцеў у акно.

Ды ўсё-ткі ён радасць прынёс мне,
нібыта завулачак той
завеялі мірныя вёсны
язмінавай ціхай пургой.

Нібыта ніколі дзяцінства
не бачыла жорсткую быль...
Пад вальс на старэнькай пласцінцы
кружыць самотны матыль.

ІНТЭРВ'Ю Ў НУМАР

ЧАКАЕМ СТРОГІХ ГЛЕДАЧОЎ

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР адкрыў новы сезон

Летнія гастролі калектыву прайшлі ў Калінінградзе. Выступленні беларускіх артыстаў мелі вялікую папулярнасць у гледачоў, слухачоў. З асаблівай цікавасцю наведвалі яны спектаклі Дзяржаўнага тэатра музычнай камедыі БССР паводле класічных аперэт, мюзіклы «Мая цудоўная лэдзі» і «Сірано». У час гастроляў наладжваліся шэфскія канцэрты і выязныя спектаклі ў Светлагорску, Балтыйску, Піянерску, на караблях двойчы Чырванасцяжнага Балтыйскага Флоту.

9 верасня тэатр адкрыў новы сезон у Мінску. Галоўны рэжысёр калектыву Вячаслаў Цюпа расказвае няштатнаму карэспандэнту «ЛіМа»:

— Цяпер, калі ў нашай краіне ўсе сферы вытворчасці, навукі і культуры сарыентаваныя на пошук новых, перспектыўных і аптымальных форм работы, тэатр не можа быць у баку ад апульнага прагрэсіўнага шляху. Няспынны пошук, рух наперад і напружаны творчы працэс — такой бачыць далейшую сваю працу і наш калектыў, так стараемся працаваць ужо сёння.

Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі БССР адкрыў свой 16-ты сезон гераічнай камедыяй А. Мдзівані «Дзяніс Давыдаў», пастаноўка якой была прысвечана 40-годдзю Вялікай Перамогі. Сёлета рыхтуем дзве прэм'еры: мюзікл А. Журбіна «Гуляем у «Прынца і жабрака» і аперэту І. Кальмана «Сільва». Расказваць пра новыя работы пакуль рана. Будзем імкнуцца, каб пастаноўкі атрымаліся вясёлымі і маляўнічымі. І ў абодвух спектаклях мы пастараемся гаварыць з гледачом пра важнае і сур'ёзнае — моваю музычнага тэатра, найбольш відовішчнага, багатага на выразныя сродкі.

Нам хацелася б бачыць у зале ўдумлівага і строгага гледача, які не задавальняўся б малым і звыклым і прад'яўляў бы да нас самыя высокія патрабаванні. Таму што гэтыя патрабаванні жывяць узаемасувязь сцэны і глядзельнай залы, яны — адзін з найважнейшых стымулаў у нашай працы.

У садзе і агародзе

РЭПАРТАЖ З НАВУКОВА-ДАСЛЕДЧАГА ІНСТЫТУТА БУЛЬБАВОДСТВА І ПЛОДААГАРОДНІЦТВА МІНІСТЭРСТВА СЕЛЬСКАЙ ГАСПАДАРКІ БССР

Знаёмства з інстытутам, з яго справамі і задачамі, вядома ж, пачынаецца ў кабінеце дырэктара. Менавіта тут, перш чым пачаць гаворку, я заўважыла на стале дырэктара побач з рознымі паперамі, папкамі — пругкі чырвоны памідор, памерам з невялікі гарбуз.

— Сёлетні, васемсот пяцьдзесят грамаў важыць, — тлумачыць гаспадар пакоя Анатоль Васільевіч Круглякоў. — З нашага доследнага ўчастка.

Таматы — культура цеплалюбівая і ў нашых шыротах дае ўраджаі па 34—40 цэнтнераў з гектара ці не два разы за пяцігодку. А патрэбна і можна атрымліваць, як сцвярджае Анатоль Васільевіч, па 70 і нават 120 цэнтнераў з гектара.

...На доследным участку інстытута, дзе вядзецца работа пад кіраўніцтвам кандыдата сельскагаспадарчых навук Круглякова, у лёгкіх перасоўных цяпліцах (пад поліэтыленавай плёнкай) — аж чырвана ад памідораў. Зялёныя, галінастыя кусты развальваюцца пад цяжарам пладоў. Цяпліцы звычайныя, якія цяпер можна ўбачыць амаль на кожным агародзе. Ды тут плёнка ўсцілае і зямлю: памідоры нідзе не датыкаюцца да глебы. Каб не гнілі? — цікаўлюся. Аказваецца — не, гэта спецыяльны метад так званага мульчыравання. Глеба пад плёнкай не патрабуе рыхлення, добра зберагае вільгаць, і ёй не патрэбны гербіцыды (пустазелле пад плёнкай не расце). І яшчэ. Памідоры не любяць вільготнае паветра, а неабходную вільгаць паглынаюць з глебы. Праз трубкі са спецыяльнымі адтулінкамі вада ўвесь час падаецца ў цяпліцы і ўвільгатняе глебу. Паветра ў цяпліцах пастаянна вентыліруецца.

Кропельнае арашэнне, мульчыраванне дазваляюць збіраць ураджай па 10 кг на 1 кв. метр. (У мінулым годзе тут атрымана па 12 кг з метра). Пры гушчыні раслін — восем тысяч на гектары. Вось і ўсе сакрэты. Прыкладна па той жа методыцы — з дапамогай плёнкі і спецыяльнага арашэння—на ўчастку ўжо сёмы год запар атрымліваюць па 500 кг агуркоў з гектара.

А на адкрытым грунце інстытуцкага агарода залаціцца суквеццямі цвятная капуста, зялёнай сцяной стаялі цыбуля, морква, буракі. Выбірай хоць сёння.

— Працуем з самай хадавой нашай гароднінай. Распрацаваны спецыяльныя методыкі вырошчвання дзесятка культур дваццаці гатункаў, — расказвае загадчык аддзела тэхналогіі вырошчвання гародніны, кандыдат сельскагаспадарчых навук Таццяна Сяргееўна Якубіцкая, якая суправаджае мяне. Расказвае талкова і ахвотна. Між іншым, як і ў тэлеперадачы «Агарод для ўсіх», дзе яна рэгулярна выступае. (Перадача гэта рыхтуецца ў асноўным па пісьмах тэлегледачоў, што сведчыць аб надзённай патрэбе агранамічных ведаў).

Таццяна Сяргееўна — за збалансаванае харчаванне. «Мы пакуль што спажываем толькі па 80 кг гародніны ў год, а па нормах, распрацаваных ва Усесаюзным інстытуце харчавання, павінны спажываць не менш, як па 130 кг. Разумееце, як патрэбны нам уласныя садова-агародныя ўчасткі, як неабходны веды, каб гэтыя ўчасткі давалі больш высакаякаснай гародніны», — паўтарала яна.

Павялічыць колькасць гародніны можна за кошт экстэнсіўнага вядзення гаспадаркі, за кошт павышэння ўраджайнасці, а галоўнае — павышэння якасці гародніны. Усе нашы мясцовыя гатункі дастаткова ўраджайныя, але неабходна рацыянальна выкарыстоўваць зямлю, уводзіць севазвароты, правільна размяшчаць расліны на ўчастку. А яшчэ — правільна спалучаць іх: выкарыстоўваць іх прыродную ўжываемасць адно з адным. Калі ўлічваць адно гэта, сцвярджаюць вучоныя, дык можна атрымліваць дваццаціпрацэнтную прыбаўку да ўраджаю.

Адзін толькі прыклад. У мінулым годзе ў магазіны Мінска сталі завозіць моркву, якая праз пару тыдняў пачала гнісці. Тэлебачанне тады праводзіла рэйд па магазінах і базах горада, крытыкавала гандлёвыя арганізацыі за безгаспадарлівасць...

Вучоныя інстытута зацікавіліся праблемай і заняліся яе вывучэннем. Хутка было высветлена, што гаспадаркі, якія пастаўлялі моркву, высявалі яе па некалькі год запар на адным полі.

Тады ж у Самахвалавічах падрыхтавалі спецыяльны агранамічна-тэхналагічны мінімум, які быў тыражыраваны і разасланы па гаспадарках. Такія ж рэкамендацыі і метадычныя ўказанні выдаюцца штогод па розных культурах. Заўважу, што многія з іх чытаюцца з цікавасцю не толькі спецыялістамі, але і агароднікамі-аматарамі, якіх з кожным годам становіцца ўсё больш.

Інстытут з яго эксперыментальнымі гаспадаркамі штогод пастаўляе элітнае насенне адзінаццаці культур васемнаццаці гатункаў. А насенняводства — справа надзвычай працаёмкая і пакуль нерэнтабельная. Прывяду такую лічбу: каб атрымаць 2 — 2,5 кг насення тых жа памідораў, патрэбна тона спелых таматаў... Адна з надзённых задач селекцыі — атрыманне высакаякаснай прадукцыі. Вывядзенне гатункаў з аптымальным утрыманнем спажыўных рэчываў — галоўны клопат вучоных.

Біяхімічны аналіз пладоў і ягад праводзіцца ў спецыяльнай лабараторыі. У дні майго знаёмства з інстытутам «ішлі» ягады. Чорныя і чырвоныя парэчкі, маліны, агрэст. Ацэнка якасці вялася пад кіраўніцтвам старшага навуковага супрацоўніка інстытута кандыдата сельскагаспадарчых навук Т. С. Шырко, якая расказала, што гатунковыя адрозненні ягад вельмі значныя. І па ўтрыманні вітамінаў і цукру, і па пекцінах. У лабараторыі атрыманы звесткі аб хімічным саставе 256 гатункаў яблыкаў, 40 — ігруш, сліў, вішань, а таксама парэчак, абрыкосаў, суніц, абляпіхі, барбарысу...

На аснове атрыманых дадзеных выводзяцца гатункі — донары для селекцыі.

— Колькасць спажыўных рэчываў і смак — вось што цэніцца ў ягадах перш за ўсё, — пацвердзіў загадчык лабараторыі ягадных культур, старшы навуковы супрацоўнік, кандыдат сельскагаспадарчых навук Анатоль Фёдаравіч Радзюк.

Лабараторыя пад адкрытым небам уяўляла сабою прыгожае відовішча. Кожны куточак удала спланаванага ягадніка зіхацеў пад сонцам. Сакавіта-чырвоныя, смаляна-чорныя, залацістыя гронкі парэчак здаваліся гронкамі вінаграду. Гатункі нашай беларускай селекцыі, папулярныя не толькі ў нашых садаводаў, але і за межамі рэспублікі. Усяго ў калекцыі інстытута 300 гатункаў парэчак, 65 агрэсту, 85 маліны, 22 гатункі адной абляпіхі. А яшчэ — шыпшына, салодкая рабіна, актынідыя, суніцы. 600 гатункаў 17 відаў ягадных культур.

Закончаны цыкл работ, ад вывядзення гатункаў да атрымання ўраджаю, праводзіцца ў межах адной лабараторыі. Фактычна лабараторыя — гэта самастойная гаспадарка...

Беларусь — рэспубліка не толькі бульбаводчая, але і ягадная. А яшчэ яна займае трэцяе месца ў Саюзе па колькасці садоў. Так, так — трэцяя пасля Украіны і РСФСР.

Але сады ў нас былі дробныя, невялікія. Інтэнсіфікацыя гаспадаркі патрабуе пераходу на прамысловую аснову. А гэта значыць, што лепш мець адзін сад на 1000 гектараў, чым 200 садоў па 5 гектараў. Дык вось, па Генеральнай схеме даведзена на перспектыву павялічыць агульны сад рэспублікі на 60 тысяч гектараў. (Прысядзібны сектар тым часам узрасце на 80 тысяч гектараў).

Распачата работа па карэннай перабудове садоў. Створана дзесяць геаграфічных раёнаў, дзе будуць закладзены сады, Пінскі, Ваўкавыскі, Слуцкі, Цэнтральна-Бярэзінскі, Аршанскі, Магілёўскі і іншыя. Ужо выслабанены землі пад сады на плошчы больш за дзве тысячы гектараў. Тут будзе разбіта пяцьдзесят садоў. Уся гэта работа вядзецца пад кіраўніцтвам вучоных інстытута. Якія гэта будуць сады, расказаў загадчык аддзела тэхналогіі пладаводства, доктар сельскагаспадарчых навук прафесар А. Дзявятаў. Выбар тыпу саду, выбар і ацэнка насаджэнняў, — якраз тое, чым займаюцца сёння вучоныя.

Улічваючы наш клімат, вызначана, што 90 працэнтаў плошчы зоймуць яблыні і толькі 10—ігрушы, слівы, вішні.

Сады гэтыя будуць шчыльныя. Калі раней высаджвалася 100 дрэў на гектар, то цяпер іх размяшчаюць па 300 дрэў. Мяркуецца, што толькі за кошт шчыльнасці саду яго прадуктыўнасць павялічыцца прыкладна на 22 тоны пладоў з гектара. Вядома, пры ўмове, што за глебай будзе наладжаны адпаведны догляд. (Пакуль бывае, што ў садзе спеюць збожжавыя альбо агародніна, а то і каровы пасуцца).

Па-другое, такі сад будзе нізкарослы. Культурныя дрэвы павінны мець рэдкую крону (каб праляцеў верабей). І абавязкова: не вышэйшыя за тры метры. Хай сабе на такім дрэве будзе менш яблыкаў, лічаць вучоныя, але якасць іх будзе лепшая. Чым лепш расліна апраменьваецца сонцам, тым больш цукру ў спелым плодзе. Гэта ж факт, і яго трэба ўлічваць. Нізкае дрэва лягчэй даглядаць. Вучоныя даводзяць, што сады ў Беларусі трэба цалкам перавесці на слабарослыя падвоі (прыродныя карлікі).

На доследных дзялянках інстытута (у Самахвалавічах, Русінавічах і іншых гаспадарках) атрымліваюць устойлівыя ўраджаі садавіны толькі на дрэвах нізкіх падвояў. У садах прымяняецца новы спосаб уборкі пладоў. Акрамя гэтага, нізкарослыя дрэвы больш зручна апрацоўваць гербіцыдамі. Вядома ж, што ў нашай зоне, дзе выпадае шмат ападкаў, многа шкоднікаў.

Якія патрэбны гатункі? Смачныя, хуткарослыя, зручныя для апрацоўкі, лёжкія. У аддзеле селекцыі пладовых і ягадных культур расказалі, што ўжо ёсць гатунак, блізкі да гэтых патрабаванняў. Гэта гібрыд «Антэй». Гатунак інтэнсіўнага тыпу, сярэднерослы, хуткаплодны — плоданашэнне пачынаецца ва ўзросце двух гадоў. Вага плода — 190 — 290 грамаў. Вызначаецца высокай зімастойкасцю. Плады ўтрымліваюць 13,2 працэнта сухіх рэчываў, 9,4 працэнта цукру, 20,3 працэнта аскарбінкі, 0,65 працэнта арганічных кіслот. Дэгустацыйная ацэнка — 4,2 бала. Смакавыя якасці зберагаюцца да мая месяца. Вось такая афіцыйная характарыстыка «Антэя». Гатунак атрыманы ў інстытуце ад зярнятка да яблыні. Рэкамендаваны для гатункавыпрабавання.

Штогод вучоныя перакрыжоўваюць да ста тысяч кветак, атрымліваючы да ста дваццаці камбінацый. І ўсё гэта вырошчваецца, бракуецца, зноў перакрыжоўваецца. За дзесяць год атрымана тры-чатыры гатункі. Вось такая карпатлівая, упартая, настойлівая работа селекцыянера...

Інстытут бульбаводства і плодаагародніцтва па сваім навуковым статуце з'яўляецца селекцыйным цэнтрам для ўсяго Заходняга рэгіёна краіны.

Успомнім, што за вывядзенне і ўкараненне беларускіх гатункаў бульбы група вучоных была ўдастоена Дзяржаўнай прэміі СССР.

Як акадэмік Альсмік праславіў нашу бульбу знакамітымі гатункамі, так А. Г. Валузнёў — беларускія парэчкі. Шмат зрабілі для селекцыі гародніны А. І. Чулкова, А. М. Палянская, а ў насенняводстве І. І. Адамаў. Беларускія насенняводы ўпершыню вынайшлі і прымянілі схему аднаўлення насення, засвоілі новыя метады аздараўлення насеннага матэрыялу, у тым ліку і саджанцаў.

Інстытут атрымлівае эліту ўсіх выведзеных раяніраваных гатункаў бульбы і гародніны. Тут распрацоўваюцца занальныя тэхналогіі вырошчвання бульбы.

— У будучым годзе, — расказвае дырэктар інстытута, кандыдат сельскагаспадарчых навук Анатоль Васільевіч Круглякоў, — нашы тэхналогіі будуць выкарыстаны на плошчы 62 тысячы гектараў. Мяркуецца, што гэта забяспечыць ураджай бульбы да 300 цэнтнераў з гектара.

У агародніцтве задача вучоных — даць рэкамендацыі па арганізацыі работ для спецыялізацыі гаспадарак з выдзяленнем асобнай вытворчасці халадастойкіх культур — капусты, моркві, буракоў—і цеплалюбівых — агуркоў, памідораў. Усе рэкамендацыі выпрабоўваюцца на базавых гаспадарках, якія ёсць у кожнай вобласці.

Задача заўтрашняга дня — перайсці да вывядзення новых форм сеянцаў з дапамогай генетыкі і цыталогіі. Гэта азначае — прадстаіць пошукавая работа на ўзроўні клеткі. Адначасова будуць распрацаваны тэхналогіі, якія скарачаюць перыяд вытворчасці насення з дзесяці да трох гадоў. Паралельна ідзе распрацоўка праектаў сховішчаў з рэгуляваным мікракліматам для зберажэння насення бульбы. Мяркуем, што гэтыя работы дапамогуць зберагчы ўраджай на 15 — 20 працэнтаў. А паскораны перыяд вытворчасці насення дасць прыбаўку ўраджаю да 25 працэнтаў. Значыцца, ураджай бульбы можна будзе падвоіць.

Прымяненне тэхналогіі вырошчвання гародніны павялічыць яе ўраджай да канца пяцігодкі ў 15 — 20 разоў. У садоўніцтве прапанаваны спосаб паскоранага развядзення саджанцаў метадам зялёнага чаранкавання. Гэта забяспечыць хуткае размнажэнне патрэбных гатункаў.

Вялікую дапамогу ў рабоце інстытута акажа стварэнне навукова-вытворчага аб'яднання. Першы этап аб'яднання вучоных рознага профілю будзе садзейнічаць больш хуткай распрацоўцы і ўкараненню прагрэсіўных метадаў плодаагародніцтва. Акрамя таго, інстытут трывала супрацоўнічае з вучонымі ГДР, ПНР, ЧССР, Кубы. У інстытуце вядзецца работа па вывядзенні парод пчол для апылення сельскагаспадарчых культур на базе Баранавіцкага і Бярэзінскага пчолагадавальнікаў.

Дададзім, што ў планах інстытута на пяцігодку распрацоўка спецыяльных рэкамендацый для тых, хто займаецца плодаагародніцтвам на садова-агародных участках. Прадукцыя з гэтых участкаў таксама немалая дабаўка да нашага агульнага стала.

Р. БАКУНОВІЧ.

Чытацкі дзённік пісьменніка

КАЛІ ГАВАРЫЦЬ ПРА ЖАНРЫ

Міхась СТРАЛЬЦОЎ

Сёння: учора і заўтра

«Движенья нет», — сказал мудрец брадатый. Другой смолчал и стал пред ним ходить». Гэты пушкінскі паэтычны жарт часта ўспамінаецца, калі даводзіцца быць сведкам або ўдзельнікам спрэчак пра тое, што сучаснае ў літаратуры і жыцці, а што рэтраграднае, што трэба лічыць грамадзянскай дзейснасцю паэзіі, прозы і г. д. насуперак драбнатэмнасці, сацыяльнай інертнасці, стылістычнай аморфнасці. Гэтую пушкінскую ілюстрацыю прыгадваеш, калі задумваешся, як гэтая «грамадзянская дзейснасць» павінна трансфармавацца жанрава, тэматычна, стылістычна, гэта значыць «пачынаць хадзіць». Карацей кажучы, з усёй сваёй вастрынёй паўстае старая і вечна новая антыномія «житейского волненья» і «звуков сладких и молитв», што выявілася ў вядомым палемічным перабольшанні (не пушкінскім ужо): «Я не поэт, я — гражданин». У свой час і наш Купала гатовы быў адмовіцца ледзь не ад самога звання паэта («Я не паэта — о крый мяне божа») дзеля сціплага жадання быць непасрэдным голасам самога народа. Але зноў жа — навошта пра гэта трэба было гаварыць менавіта вершам? Ды яшчэ надзіва лірычным і «прыватным»?

Грамадзянскасць — дзеля чаго яна? Дзеля сучаснасці? Лірычная яна ці публіцыстычная? Мы найбольш насцярожаныя ў адносінах да лірыкі. Вядома, не кожная лірычная думка, не кожны лірычны «персанаж» сучасныя. Іншым разам і нават самая «сучасная» думка на паверку можа стацца не надта сучаснай. А іншым разам нешта, быццам бы нават пазбаўленае адзнак і статусу сучаснасці, самым сучасным якраз і бывае.

Трэба было быць Бялінскім, каб заўважыць у «Героі нашага часу» М. Лермантава — у Максіму Максімавічу — гэтае сапраўды наватарскае для рускай літаратуры адкрыццё народнага характару і сапраўднага «героя часу» — насуперак знарочыстай лермантаўскай дэкларацыі, вынесенай у назву.

Наватарства Лермантава дало пасля, зрабіла магчымымі «Севастопальскія апавяданні» Л. Талстога, дало Тушына з «Вайны і міру» і шмат чаго іншага. Тут, дарэчы, і адказ на пытанне, ці абавязкова патрабуе сапраўдны гераізм выключнасці.

Аб прыродзе гераічнага класікі сказалі нам шмат адмысловага. Нехта ў свой час (здаецца, Дастаеўскі) звярнуў увагу на эпізадычны персанаж у аповесці «Дуброўскі» А. Пушкіна, на персанаж, які дзеля выратавання на пажары нейкага няшчаснага ката безразважна кінуўся ў полымя. Што гэта? Адкуль у Пушкіна «чудики» нашага сучасніка Васілія Шукшына? Ці ў Шукшына гэта ад Пушкіна? Быццё літаратурнага працэсу цудоўнае як сваёй невычарпальнасцю, так і сваімі нечаканымі «паўторамі пройдзенага». Але кожны раз гэта, вядома, нібы сачыненне на вольную, сваю тэму.

Вось, дарэчы, новы твор таленавітага нашага празаіка Анатоля Кудраўца нават і называецца так — «Сачыненне на вольную тэму». Пра яго хочацца сказаць асобна. Гэты раман уяўляецца мне прынцыповай удачай аўтара, прынцыповай таму, што ў ім абазначаны адзін са шляхоў выхаду з крызісу, які перажывае, на мой погляд, наша раманная думка апошняга часу.

Пераўвасобленым выглядае ў Кудраўца найперш сам жанр. Ён напісаў твор, разгорнуты ў шырокім гістарычным часе, але скандэнсаваны, сціслы ў часе ўласна раманным. Часткова гэта яму ўдалося праз групоўку падзей вакол цэнтральнай фігуры рамана, часткова дзякуючы ўдалай «падсветцы» характару, ды і ўсёй жыццёвай пазіцыі героя, кантрастнай (але, зразумела, не толькі) прысутнасцю ўласна аўтарскага вопыту, які закладзены ў вобразе Валеры, гэтага душэўна зацікаўленага спадарожніка галоўнага героя Ігната Сцяпанавіча ў ягоным падарожжы ў далеч і блізкату свайго жыцця і свайго часу. Раман атрымаўся па-сапраўднаму эканомным і лаканічным.

Вось гэта дык і якраз прынцыпова важнае. Бо мы ж уведалі і, на жаль, ведаем яшчэ моду, не пазбыліся яе, на грувасткія «эпапеі», што маюць нахіл на храналагічнай бясконцасці і бескантрольнасці пры занядбанні арыгінальнай раманнай, якая б здпавядала сучаснаму ўзроўню мастацкага спасціжэння рэчаіснасці, канцэпцыі.

Галоўны герой А. Кудраўца — характар буйны, але не выключны, па-сапраўднаму дэмакратычны ў свазіх жыццёвых выяўленнях і сацыяльна актыўны. Здаецца, што сам Апейка з «Палескай хронікі» Мележа паўстаў па-новаму ў новых гістарычных умовах, сцвярджаючы як пераемнасць літаратурную, так і сацыяльна-грамадскую. Не пабаюся сказаць, што гэта вобразы не толькі сацыяльна блізкія, але ў нечым яны блізка стаяць і паводле ўзроўню мастацкага абагульнення і літаратурнага майстэрства.

І разам з тым я разумею ўсе цяжкасці пераходу А. Кудраўца ад вопыту навеліста і аўтара кароткіх зповесцей да набыцця ўласна раманнага вопыту. Але я разумею таксама, што ранейшы, навелістычны нават, вопыт шмат у чым і дапамог яму. Дапамог навелістычнай мерай усведамлення вострай канструктыўнасці кожнага з кампанентаў твора, даў магчымасць пры рабоце над раманам па-новаму знаходзіць тыя вузлы, што даюць «нацяжэнне» раманнай форме і заўсёды прымушаюць памятаць пра мастацкую мэтазгоднасць. Благая інерцыя «эпапейнасці», прынамсі, менш за ўсё ціснула на яго.

У мяне пракінулася слова пра наяўнасць пэўных крызісных рысаў у сучасным нашым рамане — і нездарма. Але толькі крызіс гэты не варта разумець як застой. Ідзе прыхаваная, несціханая творчая спрэчка (на жаль, не заўсёды хоча гэта заўважаць крытыка) пра мастацка-метадалагічны ўзровень спасціжэння рэчаіснасці. Менавіта пра ўзровень.

Бо пры здабытай свабодзе выхаду А. Адамовіча і В. Быкава ў «экзістэнцыяльную», умоўна кажучы, жыццёвую дадзенасць, пры імкненні на «малекулярным» узроўні разглядваць чалавека, пры наяўнасці творчасці Я. Брыля з ягоным выхадам на еўрапейскае, агульнакультурнае разуменне нацыянальнай свядомасці, што выявілася як у ягоным «Золку, убачаным здалёк», як у «Ніжніх Байдунах», так і ў эсэістыцы апошняга часу,— існуюць і іншыя ўзроўні, што адлюстроўваюць шматслойную складанасць той з'явы, якую пачалі называць паскоранасцю і што ў дачыненні да нашых канкрэтных гістарычна-літаратурных умоў зусім не гук пусты. Бо ва ўмовах «паскоранага» развіцця могуць быць паяднанымі, сумешчанымі самыя разнародныя традыцыі і стылі. Могуць быць творча пераўвасоблены, але могуць і эклектычна суіснаваць.

Вось і выходзіць, што побач з прарывам да «еўрапейскага» ўзроўню ў нас існуюць як цяга да натуралізму, наіўнага рэалізму ў этнаграфічнай аздобцы, так і памкненні да лірычнага імпрэсіянізму і алеаграфіі. З цяжкасцямі пазбаўляемся ад гэтага этнаграфізму і натуралізму, ад нейкай ускоснай апавядальнасці на шкоду аналітызму: таму прыклад вельмі таленавіты наш І. Пташнікаў, які працуе часта на ўзроўні эмоцыі, значыцца, і не на ўзроўні псіхалагічна складанага пачуцця, што мае пацвярджэнне ў самой паэтыцы і стылі, калі абмежаваны правы аб'ектывізаванага, аналітычнага тэксту, калі даводзіцца ўспамінаць пра тую сціслась, якая, як вядома, сястра таленту. Заўважце, сястра, а не маці, бо Пташнікаў несумненна «па матчынай лініі» таленавіты. Але тут выпадак, калі адчуць і рэалізаваць усю паўнату «сваяцкіх сувязей» аўтару якраз не пашкодзіла б.

З другога боку, імкненне да вострасучаснага стылю і самай надзённай тэматыкі пры ігнараванні папярэдніх стылявых традыцый, класічнага вопыту майстроў вядзе да вартага жалю эклектызму, да наіўнага неафіцтва, да наіўнай, зноў жа, спробы па-мастацку ілюстраваць рознага гатунку абывацельскія сенсацыі або пераказваць, як-кольвек белетрызуючы, вычытанае ўчора ці сёння ў «Иностранной литературе» або ў «Науке и жизни», што дае сябе адчуць, напрыклад, у рамане В. Гігевіча «Доказ ад процілеглага».

Або ўзяць «вясковую прозу». У ёй у свой час былі прынцыповыя дасягненні, пазначаныя імёнамі таго ж І. Пташнікава, І. Чыгрынава, Б. Сачанкі, А. Кудраўца, А. Жука, Я. Сіпакова, В. Казько—аўтараў, якія працуюць сёння часцей у іншых тэматычных сферах і іншых жанрах. «Вакуум» у так званай вясковай прозе запаўняецца пакуль слаба. Маладымі празаікамі пераважна бяруцца і развіваюцца нейкія прыватнасці з багатай палітры тэматычнага, выяўленчага і стылістычнага пошуку прозы ранейшай пары. Запозненым у іх здаецца матыў настальгіі па маральнай цэльнасці і духоўнай паўнаце быцця (запозненым у тым сэнсе, што ён не вырашаецца па-новаму), матыў, найчасцей укаранёны, паводле аўтараў, у сялянскім пабыткаванні. Магчыма, але ці дастаткова гэтага дзеля сцвярджэння жыццёва-паўнакроўнага ідэалу?

Ёсць усё ж цікавыя спробы зірнуць на сучасную вёску аналітычна, паставіўшы сябе не з боку вёскі, а як бы ўвайшоўшы ў тую вясковую стыхію самахоць і не з гатовай наперад думкай—напрыклад, у творчасці маладых У. Арлова, Х. Лялько, А. Наварыча, які, дарэчы, і філасафічны. Але маладым пакуль яшчэ, і гэта варта сказаць, бракуе глыбіні сацыяльнага аналізу, спеласці грамадзянскай думкі — якасцей, якімі яскрава надзелены нядаўнія выдатныя «вясковыя» апавяданні В. Карамазава «Дзяльба кабанчыка», «Галуба», «Гарадскія».

З чым жа павінны мы звязваць нашыя спадзяванні на будучае, якой можа ўяўляцца нам літаратура заўтрашняга дня? Спакусліва зазірнуць туды, у будучае, але і боязна: можна нагаварыць шмат несур'ёзнага. А больш-менш сур'ёзнае і несумненнае тое, што ўсе нашы трывогі, спадзяванні, расчараванні і нават няўдачы, як і смелы выхад паасобных літаратараў на тую паласу, дзе цяжка іншы раз разлічваць на забяспечаныя «тылы», на неадкладнае чытацкае разуменне нават,—у рэшце рэшт будуць садзейнічаць станаўленню літаратуры па-сапраўднаму арганічнай і аналітычнай, але, можа, не без «шарму» лірызму,— літаратуры эпічнай і «міфалагізаванай», якая возьме нешта істотнае таксама ад эсэістыкі і ад фальклору. Так, так, фальклор. Багдановіч некалі бачыў у ім адзін з магутнейшых сродкаў абнаўлення літаратурных структур. Для мяне ж, напрыклад, вялікія мажлівасці сучаснага звароту да багацтваў фальклорнага светаадчування, творчага падключэння іх да свядомага пошуку сучаснага мастака слова дэманструе творчасць нашага Рыгора Барадуліна—паэта па-сапраўднаму смелага ў набыцці новых сродкаў для выяўлення сучаснага зместу, у якім заўсёды ёсць прытулак думцы пра нацыянальную самабытнасць мастацкага слова. Думаю, не толькі мне сімпатычная такая пазіцыя паэта і майстра.

«Усе жанры добрыя, акрамя сумнага»

Клопат усялякага слова — знайсці найкарацейшы шлях да суразмоўніка, слухача, чытача. Зразумела, што і сродкі (жанр) уяўляюцца тады самымі «найкарацейшымі». Адзін сучасны французскі паэт (Рэнэ Шар) неяк сказаў: «Паэт на сваім шляху павінен пакідаць не доказы, а сляды». На доказы ў паэзіі проста не стае часу. Гэтым яна блізкая, дарэчы, да музыкі. І, бадай, заўсёды хацела быць да яе яшчэ бліжэй. «О если б без слова сказаться душой было можно!» Гэта, здаецца, Фет. Але вось Цютчаў: «Мысль изреченная есть ложь». Цютчаў хацеў сказаць зусім не тое, што можна прыпісаць яму ў сэнсе нейкага агнастыцызму. Ён проста шкадаваў, як і той старажытны філосаф, што нельга двойчы ўвайсці ў адну і тую ж раку. За час, які неабходны хоць бы для вымаўлення слова, думка нашая шмат разоў паспявае пакідаць быццё-абалонку гэтага слова. Вада сцякае. Тут найвялікшая цяжкасць нават для паэта — сумясціць, так сказаць, суб'ект і аб'ект. І зноў жа гэта задача, блізкая да музычнай.

І недзе тут адказ, чаму сіла цэнтраімкненная (скажам, аднажанравасць) можа замяніцца на сілу цэнтрабежную: быццё імгнення не памірае, але, накладваючыся на далейшае імгненне (час), патрабуе ўдакладненняў і, зразумела, новых выхадаў у рэчаіснасць. Вось вам ужо і публіцыстыка, і проза, і крытыка, як заўгодна.

Магчыма, гэта трохі агульнавата, метафізічна, але пажаданая дыялектычнасць тут можа быць дасягнута толькі ў часе, хоць бы жанравым.

Можна сказаць: усе жанры добрыя, акрамя сумнага. Але можна сказаць і іначай, як сказаў у свой, канкрэтна дарэвалюцыйны час наш Максім Багдановіч: «У нас цяпер усе жанры маюць сваю цану». Таму што ішоў працэс станаўлення новай беларускай літаратуры, працэс паскораны. Дарэчы, і паняцце паскоранасці ў дачыненні да літаратуры было ўпершыню, прынамсі ў нас, уведзена тым жа Багдановічам, які быў не толькі паэтам, але і крытыкам. Вядома, калі на тое, радаводную гэтага паняцця можна весці і ад Г. Гачава, і ад В. Каваленкі—гэта як хочаце.

Можа ўзнікнуць пытанне: памагае ці замінае вопыт крытыка, тэарэтычнае асэнсаванне «кухні пісання» стварэнню ўласных мастацкіх твораў?

Мне здаецца, памагае, хоць бы ў тым сэнсе, што перасцерагае ад спакусы браць штурмам адчыненыя дзверы.

Некалі існавала паняцце дасведчанага густу. Добры густ ацэначны, таму што крытычны, ён дастаткова шырокі, але не ўсяедны. Ён, як цяпер сказалі б, канструктыўны. Ён плённы. Алгебрай павяраюць гармонію не спачатку, а пасля. Ці, дакладней, у адзіным акце творчасці: так Пушкін пісаў вершы, спрабуючы варыянт за варыянтам, з пяром у руках. Ён пісаў, а не запісваў.

Крытыцызм, гэты погляд на сябе як бы збоку, гэты бокавы зрок, кантроль памагаюць потым зразумець і іншага пісьменніка, няхай ён нават творча і не блізкі табе. Але родніць нас у рэшце рэшт не майстэрства, не любоў да таго ці іншага прыёму, а жаданне гарманічнага цуду і «перла создания». У першую чаргу гэтай вернасці «тайнаму саюзу» заўсёды чакаеш ад крытыка, ад ягонай здольнасці зразумець, чаму Гейнэ або Глеб Успенскі маглі плакаць перад Венерай Мілоскай.

Сапраўдныя крытыкі—рэдкая з'ява. Я рады, што ў нас ёсць сапраўдны крытык—Алесь Адамовіч. І зноў жа—не толькі крытык.

Крытык павінен быць публіцыстам, мастаком, літаратуразнаўцам. Вядома, гэта ў лепшым выпадку. Але тады ён будзе мысліць літаратурным працэсам і перажываць яго. Тое і другое неабходна.

КНІГАПІС

П. ТКАЧОЎ. Час світальнай зоркі. Аповесці і апавяданні. На ўкраінскай мове. Кіеў, «Веселка», 1985.

У кнігу Паўла Ткачова, якой расказваецца пра жыццё і рэвалюцыйную дзейнасць Уладзіміра Ільіча Леніна, уключаны дзве аповесці і восем апавяданняў.

Творы беларускага празаіка пераклаў Уладзімір Гуцаленка, аформіў выданне мастак Іван Прынцэўскі.

Г. СЛАВІНОУСКАЯ.

М. ДАНІЛЕНКА. Маці Мар'я. Аповесці і апавяданні. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1985.

Новую кнігу Міхася Даніленкі, выдадзеную на рускай мове, склалі аповесці «Каля Дняпра», «У другім эшалоне», «Журлівіца», «Алёшка», «Бакашыха», «Срэбранае вяселле» і чатырнаццаць апавяданняў пісьменніка. Аўтара цікавяць складаныя маральна-этычныя праблемы, якія хвалююць жыхароў сённяшняй вёскі, часта звяртаецца ён і да падзей апошняй вайны.

Творы гомельскага празаіка на рускую мову пераклаў Эдуард Карпачоў.

У. КАСТРАВІЦКІ.

П. ПРЫХОДЗЬКА. Навальнічныя скрыжаванні. Вершы. Паэма. На рускай мове. М., «Советский писатель», 1985.

Творы зборніка паэта-франтавіка Пятра Прыходзькі, што выйшаў сёлета ў Маскве, прысвечаны 40-годдзю Вялікай Перамогі савецкага народа над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Змест вершаў склалі падзеі, што адбываліся на франтах вайны, непасрэдным удзельнікам якой быў сам аўтар, а таксама падзеі мірнага пасляваеннага жыцця, якое адзначана такой дарагою цаной. Многія вершы не даюць чытачу забыцца, што і сёння на зямлі неспакойна, што і сёння трэба змагацца, каб ахаваць мірную працу людзей ад любых падпальшчыкаў, што мараць аб новых разбойных планах.

Усе творы, змешчаныя ў кнізе, пераклаў Сяргей Волчак.

В. НАРУТОВІЧ.

ЧЫТАЮ ТАВАРЫША

ВАЧАМІ МАСТАКА

ШТО, перш за ўсё, прываблівае ў кнізе Івана Грамовіча? Праўдзівасць, натуральнасць, духоўнае хараство двух галоўных герояў — дзеда і хлопчыка. Кожны па-свойму любіць родную прыроду і людзей працы. Старэйшы — з філасофскай мудрасцю. Хлопчык, ад імя якога вядзецца апавяданне, — з нястрымным жаданнем адкрыцця.

У свой час І. Грамовіч падарыў малым навелу «Жаваранак», якую без перабольшання можна назваць маленькім шэдэўрам беларускай дзіцячай прозы. Спагадлівая хлапечая душа, гарачая ў сваёй любові да крылатых сяброў — птушак. Барацьба за выратаванне жаваранка ад кіпцюроў каршуна. Перамога дабра над злом. Усё гэта напісана з глыбокім пачуццём, выразна, чыстай мовай.

Навела «Жаваранак», уключаная ў кнігу, арганічна звязана з усімі новымі і ранейшымі апавяданнямі, напісанымі ў той жа танальнасці. Таму кніга выглядае цэласнай, як адна аповесць.

У час высокаразвітай тэхнікі і інфармацыйнага буму ўсё большая ўвага да жывой прыроды, да яе аховы. Важна выхоўваць экалагічную культурнасць чалавека змалку. Думаецца, што тут сваю ролю адыграюць навелы І. Грамовіча «Пад сонцам усё грае», «Салаўіная песня», «Выпаў снег», «Крыніцы», «Вавёрка Верачка», «Фацэля», «Пара ў вырай», якія будзяць у дзіцячай душы самыя светлыя пачуцці, вызваляюць яе ад залішняй дзелавітасці і рацыяналізму.

Вось дзед робіць з вярбы зялёную дудку («Пад сонцам усё грае»). Бачыш усё да дробных дэталей, адчуваеш, што дудка вось-вось заспявае, калі дзед «усю дудку акунуў у крыніцу. Каб яна была волкая, свежая, жывая, як сама вярба». Хлопчык тым часам і сам навучыўся тонкаму майстэрству ў дзеда. Навучыўся слухаць музыку прыроды. Аднаго разу, калі яны пасвілі кароў, дзед сказаў: «Клён — самае пявучае дрэва для майстравання скрыпкі...

— Я ведаю, — упэўнена, як знаўца, адказаў я.

— Што ты ведаеш? — пацікавіўся дзед.

— Што клён спявае... Што наша бяроза пяе. Усё чуў.

Дзед быў нечакана здзіўлены.

— Ну, як жа наша бяроза спявае? — нібыта па сакрэту запытаў ён. — Як ты яе падслухаў?

Я сказаў, што прыкладваю вуха да кары бярозы, абнімаю дрэва і падоўгу стаю, слухаю. Усё чуваць. Як верхавіна шуміць, як голле між сабой гамоніць...» І далей хлопчык расказвае, што: «Наша бяроза працяжна спявае. Песню ад песні адгартае... А вось тая бярозка, што стаіць на мяжы, у якой голлі пазіраюць, тая звоніць. Усімі лісцікамі. Сасна густа шуміць».

Апавяданні І. Грамовіча — гэта не толькі ўспаміны-замалёўкі маленства. Тут ёсць глыбокае раскрыццё псіхалогіі сялянскага хлопчыка, які быў у сям'і добрым, чулым сынам і памочнікам-працаўніком. Гэта непрыгладжаны, ненапамаджаны падлетак: ён умее і насваволіць, і нашкодзіць, і, часам, зманіць. Але чэснасць перамагае. Ён, урэшце, сам прызнаецца маці ў сваім падмане («Знаходка», «Нікога не было дома»).

Выхаванне працай — надзённая праблема нашай сям'і і школы. І, мабыць, добрай дапамогай бацькам і педагогам з'явіцца кніга «Як вясну рабілі». Цяжка пераацаніць мастацкую вартасць апавяданняў «Фацэля», «Навыперадкі з Ірынкай» і, асабліва, «Кавалачак хлеба». Аднаго разу хлопчык-падпасак згубіў торбу з хлебам і іншымі запасамі. Ён прызнаўся дзеду: «Абрыдла яе цягаць». І дзед расказаў яму казку пра Хлеб, пра людзей, якія «пакляліся вечна цалаваць яго... Сеяць і расціць, даглядаць і сабіраць, шанаваць і берагчы, як само жыццё. Так яно ёсць і зараз. Жыта — ад слова жыць... Я сядзеў моўчкі і адчуваў сябе вінаватым, што не пацалаваў акрайчык хлеба. Людзі рабілі гэта, навучаныя голадам. Я ж не бачыў голаду. І не хацеў бачыць. Я сядзеў, трымаючы ў руках свой акрайчык, і адчуваў яго, як жывога. Ён быў самым дарагім, што прыдбаў чалавек для свайго жыцця».

Незвычайна кранаюць адносіны малога да маці. Чытаю апавяданне «Садок насаджу». Хлопчык цяжка захварэў. Амаль непрытомны, ён чуе матчыны асцярожныя крокі. Бяссонная ноч. Маці каля ложка. «Мама, не плачце, — набіраючы поўныя грудзі паветра, загаварыў я. — Паслухайце, я раскажу... Як вырасту... буду дужы. Буду насіць ваду... Мама, як вырасту... Насаджу садок... І яблыні, і вішні, і грушы... Як у дзядзькі Мікалая... Бэры. Насаджу садок... Густа. Вялікі... Толькі для вас...».

А навела «Пара ў вырай»... Дзед, які з'яўляецца першым настаўнікам хлопчыка, умелым майстрам і казачнікам, чалавекам-жыццялюбам і працалюбам, раптам пачынае адчуваць набліжэнне сваёй смерці. Ён навучыў унука назіраць за паводзінамі птушак і запісваць усё ў каляндар. Вось апусцела ластаўчына гняздо.

«— Паляцелі нашы шчабятухі. Няма. Усё ўжо, — хваравіта сказаў дзед. — Адляцелі. Скора і мне ў вырай. — Ён цяжка ўздыхнуў.

І. Грамовіч. Як вясну рабілі. Для малодшага школьнага ўзросту. Мінск, «Юнацтва». 1985.

КРЫТЫКА БІБЛІЯГРАФІЯ

Надрукавана ў «Немане»

МІНСК, ТРЫВОЖНЫ СЕМНАЦЦАТЫ

Некалькі гадоў назад, гаворачы пра творчыя планы, Мікалай Чаргінец прызнаўся: «Хачу напісаць дакументальны раман, адным з герояў якога будзе Міхаіл Васільевіч Фрунзе. Яго большасць з нас ведаюць як палымянага рэвалюцыянера, выдатнага палітычнага дзеяча. Але ж Фрунзе стаяў і ля вытокаў рабоча-сялянскай міліцыі. У цяжкіх умовах, калі вялася вострая класавая барацьба, ён стварыў народную міліцыю, што ўплывала на палітычнае жыццё, змагла разграміць паліцыю, вяла паспяховую барацьбу з бандытамі, спекулянтамі. І гэтую барацьбу, і гэтую міліцыю ўзначаліў Міхаіл Васільевіч Фрунзе».

Маючы ў сваёй аснове элементы хранікальнасці, — не абыдзен ніводзін бок шматграннай дзейнасці Фрунзе ў Мінску, расказваецца пра яго паездкі на Заходні фронт, — раман «Загад № 1», разам з тым, не пазбаўлены і дэтэктыўнага пачатку. Гэта тычыцца тых старонак, дзе гаворыцца пра барацьбу народнай міліцыі з ворагамі рэвалюцыі, бандытамі, а таксама з прадстаўнікамі былой царскай ахранкі.

У цэнтры гэтай барацьбы — Міхаіл Аляксандравіч Міхайлаў. Пад такім прозвішчам Фрунзе прыехаў у Мінск, гэтай партыйнай мянушкай карыстаўся на працягу ўсяго знаходжання ў Беларусі. А наколькі шматграннай была дзейнасць Міхаіла Васільевіча ў Мінску, добра сведчаць і яго ўспаміны: «З пачатку Лютаўскай рэвалюцыі стаў адным з кіраўнікоў рэвалюцыйнага руху ў Мінску, у Беларусі і на Заходнім фронце. Правёў раззбраенне мінскай паліцыі і жандармерыі і стаў начальнікам Мінскай грамадзянскай міліцыі. Быў арганізатарам Мінскага Савета рабочых дэпутатаў і пастаянным членам выканаўчага камітэта. Быў арганізатарам Савета сялянскіх дэпутатаў Беларусі першага склікання і старшынёй выканаўчага камітэта. Быў членам прэзідыума Усерасійскага з'езда сялянскіх дэпутатаў ад Беларусі. Быў адным з арганізатараў армій Заходняга фронту, і ў выніку з'езда быў выбраны членам франтавога камітэта армій Заходняга фронту. Быў адным з рэдактараў бальшавіцкіх газет, што выдаваліся ў Мінску...».

Ужо ў самым пачатку рамана даволі выразна, хоць і асобнымі штрыхамі, схоплена істотнае ў жыцці прыфрантавога горада, якім быў у той час Мінск. Гэтаксама адразу аўтар перадае характэрнае ў паводзінах і светапоглядзе Фрунзе, якога паказвае выдатным арганізатарам, умелым кіраўніком, чалавекам, здольным правільна даваць ацэнку падзеям.

Ствараючы, па сутнасці, раман «аднаго героя», М. Чаргінец разумее, што характар, вобраз Фрунзе можна лёгка збядніць, калі яго, як персанаж літаратурны, падаць ізалявана. Каб гэтага не атрымалася, пісьменнік уводзіць у раман дзесяткі людзей — найперш сатрэнікаў Міхаіла Васільевіча па барацьбе: Мяснікова, Алімава, Гарбуза і іншых. Фрунзе бачыцца чалавекам калектыўнага пачатку ў рэвалюцыйнай рабоце. А паколькі «Загад № 1» — твор, у якім найбольш гаворыцца пра дзейнасць Міхаіла Васільевіча на пасадзе начальніка міліцыі, асаблівае значэнне для разумення Фрунзе-кіраўніка, Фрунзе-партыйца набываюць яго ўзаемаадносіны з Іосіфам Гарбузом.

Пазнаёміліся яны ў ссылцы ў невялікім пасёлку Манзурка Іркуцкай губерні. Калі зайшла гаворка, ці спатрэбіцца новай дзяржаве паліцыя, Гарбуз палымяна даказваў: «Не-не, адно слова «паліцыя» будзе дыскрэдытаваць саму ідэю абароны законнасці і правапарадку ў дзяржаве і сялян. За гэтым словам — цэлая сістэма органаў нагляду, насілля, калі хочаце, падаўлення волі народных мас». Тады Міхаіл Васільевіч пагадзіўся з меркаваннем свайго таварыша. Не можа не пагадзіцца і цяпер, калі ўсе сілы і энергію аддае стварэнню рабоча-сялянскай міліцыі. Ды толькі Гарбуз, прызначаны намеснікам начальніка міліцыі, чамусьці пайшоў шляхам ілжывай рэвалюцыйнасці. Выступаючы супраць насілля, ён аднабакова разумее сутнасць самога паняцця «гуманізм». Гарбуз выступае нават супраць пакарання адкрытых ворагаў, якія пагражаюць насельніцтву, дыскрэдытуюць народную міліцыю. Вострая гаворка адбываецца ў Фрунзе і Гарбуза. Калі справа тычыцца ідэйных перакананняў, калі неабходна сказаць праўду ў вочы, Міхаіл Васільевіч не думае пра тое, пакрыўдзіцца сябра ці не: «...бальшавікі заўсёды былі супраць тэрору як сродку барацьбы. Я таксама лічу, што нават у адносінах да ворагаў мы павінны праяўляць максімум вытрымкі і цярпення. Але — не бясконца».

Не адразу зразумее Гарбуз памылковасць сваіх меркаванняў. Будзе нават момант, калі, няхай і падсвядома, пойдзе на злачынства, не выканаўшы загад Фрунзе і не расстраляўшы мацёрага царскага шпіка, правакатара Чарона. Той жа Чарон яшчэ з чатырма бандытамі падсцеражэ Міхаіла Васільевіча ў цёмным завулку, і толькі смеласць і рашучасць Фрунзе дадуць магчымасць яму разам з жонкай уратавацца. Нават пасля гэтага выпадку будзе верыць ён у Гарбуза, што той рана ці позна, але адумаецца. Так і здарылася.

Пад кіраўніцтвам Фрунзе далейшую школу мужання праходзяць Раман Алімаў і Альгіс Шаштокас, на шлях рэвалюцыйнай барацьбы становіцца Антон Крылоў. У партыі ён знаходзіўся не першы год, але менавіта пасля бліжэйшага знаёмства з Фрунзе (у Крылова пасля прыезду ў Мінск Міхаіл Васільевіч спыніўся на кватэры) далучыўся да актыўных дзеянняў, узначаліў крымінальны вышук.

Пісьменнік засяроджвае ўвагу на найбольш значных аперацыях, праведзеных Міхаілам Васільевічам. Адна з іх — барацьба з бандай Венчыкава, які ў сваім асяроддзі вядомы пад імем Данілы. Злавіць гэтага злачынцу патрэбна як мага хут-

М. Чаргінец. Загад № 1. Раман. На рускай мове. «Неман». 1985, №№ 4—6.

— Куды? — не зразумеўшы, запытаўся я. — Ты пра што гэта, дзед?..

— Пра птушак, — сказаў ён. — Пра малады вывадак, які я табе паказаў. От, пра такі, як ты. Табе — у палёт!.. І пра стары, як я. І мне пара. Усяму настае пара».

Пісьменнік сур'ёзна размаўляе з дзецьмі, прыроджанымі аптымістамі. І праяўляе вялікую тактоўнасць: ён не палохае дзяцей, а неяк спакваля падводзіць іх да разумення адвечнай філасофскай праблемы жыцця і смерці.

Лепшыя навелы кнігі (а іх — большасць) — сведчанне сталага майстэрства пісьменніка. Іван Грамовіч піша лаканічна, без лішніх эпітэтаў, упрыгожванняў. Галоўная часціна яго мовы — дзеяслоў, які дапамагае раскрыццю душэўнага стану героя, перадае дзеянне. А гэта вельмі важна: доўгія сказы, запоўненыя прыметнікамі, супрацьпаказаны творам для дзяцей. Пэўна, яны супрацьпаказаны і творам для дарослых? Прыгадаем словы з ліста А. Чэхава да М. Горкага (ад 3-га верасня 1899 г.): «Зразумела, калі я пішу: «Чалавек сеў на траву». Гэта зразумела, таму што ясна і не затрымлівае ўвагі. Наадварот, незразумела і цяжкавата для мазгоў, калі я пішу: «высокі, вузкагруды, сярэдняга росту чалавек з рыжай бародкай, сеў на зялёную, ужо змятую пешаходамі траву, сеў бясшумна, нясмела і пужліва азіраючыся...»

І. Грамовічу ўласціва адчуванне дакладнага слова. Возьмем, да прыкладу, апавяданне «Вавёрка Верачка». Хлопчык усю зіму даглядаў пакалечаную вавёрачку, прывязаўся да яе. Калі ж надышла вясна і вавёрка ачуняла, брат вырашыў завезці яе ў лес:

«Развітацца з вавёркай? Ісці са школы і думаць, што Веркі ўжо няма? А яна мяне чакала. Ці прыносіў, ці не прыносіў ёй гасцінец, пакажыся на парог, дык яна, дзе б ні знаходзілася, скакала на галаву. Вушанка валілася на падлогу, а яна лапкамі ашчапервала валасы. Ёй было цікава перабіраць пасму за пасмай мае валасы. Я сядзеў на лаве, як заварожаны, з вавёркай на галаве замест шапкі».

Фальклорная аснова кнігі І. Грамовіча выразна адчуваецца ў многіх апавяданнях. Розныя дзедавы казкі і прымаўкі цесна пераплятаюцца з рэальнай рэчаіснасцю, вучаць народнай мудрасці і шчыраму, крынічнаму слову («Кавалачак хлеба», «Ядловец і асіна», «Пара ў вырай» і інш.). Шкада толькі, што для падмацавання (праўда, здараецца яно рэдка) пісьменнік ужывае неабавязковае «цудоўна». У апавяданні «Воблакі» эмацыянальна, ярка перададзены адчуванні хлопчыка-летуценніка. Ён назірае за воблакамі, уяўляе розныя неверагодныя карціны. І тут жа дадае: «Як цудоўна!» А навошта гэта? У тым жа апавяданні — бліскучае апісанне навальніцы: «Я бачыў, як хмары ляцелі ў розным кірунку. Яны страчаліся. Усё бушавала. Усё ў паветры кіпела. Усе воблачкі, усе хмары і падхмаркі з-пад сонечнай вышыні. Навальнічныя перуны таўклі іх, як месіва, і секлі агністымі маланкамі. Гром адгукваўся ў сэрцы... А ў сонечны дзень, бывала, сяджу, гляджу... Здаецца, такіх воблакаў, як сёння, не бачыў ніколі. І, здаецца, не ўбачу...»

Дасканала, ці не праўда? Навошта ж і тут апісанне завяршаецца «прыгожым» словам «цудоўна!»?

У добрым, паводле задумы і гучання, апавяданні «Чырвоны колер» ёсць натхнёныя старонкі пра чырвоны сцяг, пра глыбокае хваляванне, якое адчуў хлопчык, чытаючы на вечары самадзейнасці верш Чарота «Наш сцяг абаронім». І, на жаль, на наступнай старонцы трапляюцца сухія, пратакольныя, не ўласцівыя стылю Грамовіча, сказы: «Звяно ахвотнікаў у піянеры неўзабаве арганізавалася... Пасля хатняй работы, пасля таго, як падрыхтуем урокі, мы збіраліся на зборы. Месца збораў — у школе. Кожны збор — па загадзя запланаванаму парадку дня...»

Дробныя агрэхі не могуць, вядома, засланіць тае радасці, якую нясе чытачам — і малым, і дарослым — кніга І. Грамовіча «Як вясну рабілі».

Паколькі кніга выйшла па рэдакцыі малодшага школьнага ўзросту, варта было б яе надрукаваць буйным шрыфтам. І не варта было шкадаваць месца (і фарбаў!) для малюнкаў. Кожнае апавяданне Грамовіча дае разгон для фантазіі мастака. Ці трэба ў такіх выпадках скупіцца? Тым больш, што ў выдавецтве «Юнацтва» ёсць жа нямала выдатных узораў мастацкага афармлення кніг для дзяцей.

Эдзі АГНЯЦВЕТ.

чэй не толькі таму, што ён тэрарызуе насельніцтва, настройвае людзей супраць бальшавікоў. Прычына і ў іншым — дайшло да таго, што ворагі, якія акапаліся ў Мінскім Савеце, на поўным сур'ёзе гатовы прапанаваць кандыдатуру Венчыкава на пост... начальніка Мінскай міліцыі. Нялёгкі гэты паядынак з прафесійным злачынцам, ды бальшавікі вытрымліваюць яго з гонарам.

Сюжэтная лінія, звязаная з гэтымі падзеямі, у рамане найбольш дынамічна-напружаная. Аднак гэта не значыць, што для М. Чаргінца становіцца ледзь не самамэтай — падаваць сітуацыі «выйгрышныя», нечаканыя. У цэлым у рамане назіраецца суразмернасць паміж эпізодамі, здавалася б, статычнымі і драматычнымі, калі адразу раскрываюцца чалавечыя характары, выпрабоўваюцца лёсы. Глыбока псіхалагічна пададзена і выкрыццё Чарона-Страмбурга — гэты агент праходзіць і пад іншымі прозвішчамі. І зусім ужо па-майстэрску — арышт крымінальнікаў, у тым ліку і Венчыкава, якіх ворагі рэвалюцыі хацелі былі вызваліць з турмы.

І гэтай справай, як і многімі іншымі, непасрэдна кіраваў Фрунзе, паказаўшы сябе чалавекам, здольным арыентавацца ў абставінах, прымаць, калі неабходна, хуткія рашэнні, а галоўнае — давяраць людзям. Менавіта дзякуючы гэтаму пасобныя былыя турэмныя назіральнікі, хто не да канца растраціў сваё сумленне і гатовы быў служыць народу, назвалі прозвішчы царскіх агентаў і шпікоў. Дала пра сябе знаць празорлівасць Фрунзе, які разумеў, што міліцыя без падтрымкі насельніцтва не зможа паспяхова справіцца з ускладзенымі на яе задачамі.

Праўда, часам у рамане дае аб сабе знаць і пэўная паскоранасць падзей, калі факты проста называюцца, а псіхалагічнага вытлумачэння ім не даецца. І ўсё ж завельмі папракаць пісьменніка ў гэтым не варта — наўрад ці магчыма ў адным творы асвятліць усе пытанні, якімі даводзілася займацца Фрунзе. Таму і атрымаліся фрагментарнымі старонкі, дзе расказваецца пра рэдактарскую дзейнасць Міхаіла Васільевіча, удзел яго ў розных з'ездах, ды і паездка на Заходні фронт не сказаць каб нешта дадавала нова да раскрыцця вобліку гэтага нястомнага ленінца. Не лепшым чынам выглядаюць і сюжэтныя «дабаўкі» да рамана, як, скажам, прыезд Пурышкевіча ў Мінск, яго спроба выступіць перад работнікамі чыгуначных майстэрань і ад'езд на звычайнай тачцы. Эпізод гэты, зразумела, таксама сведчыць аб вастрыні сацыяльна-класавай барацьбы, якая ў той час адбывалася ў Мінску, але ці варта яму адводзіць цэлы раздзел.

Большай распрацоўкі патрабавалі і вобразы Крыловых — і старэйшага, і, тым больш, малодшага, які ваяваў на Заходнім фронце, а тут, у Мінску, пачынае нараджацца бы нанава, адчуўшы нарэшце сябе чалавекам, патрэбным іншым.

Пэўныя недагляды, зразумела, не могуць паслабіць агульнага ўражання ад твора, з'яўленне якога ў творчай біяграфіі М. Чаргінца не выпадковае. Раман «Загад № 1» засведчыў новыя магчымасці пісьменніка, яго ўменне ствараць праўдзівыя вобразы гістарычных асоб.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

У «СУСВЕТНАЙ ЭНЦЫКЛАПЕДЫІ»

Непрафесійная выяўленчая творчасць — з'ява надзвычай цікавая і складаная. Яна звязана і з фальклорнымі абрадамі, і з засваеннем навыкаў прафесійнай акадэмічнай школы, і са свабодным спалучэннем першага і другога ў нечаканых мастацкіх формах. Ва ўсім гэтым спрабуюць разабрацца аўтары важкай працы — «Сусветнай энцыклапедыі народнага мастацтва», якая нядаўна выдадзена ў Югаславіі. Кніга прысвечана 100-годдзю творчай дзейнасці французскага мастака-самавука Анры Русо.

У энцыклапедыі прадстаўлены 800 імёнаў мастакоў з 50 краін свету. Тут прадстаўнікі ўсіх кантынентаў: Афрыкі, Азіі, Еўропы, Аўстраліі і Амерыкі. Больш за 30 аўтараў-складальнікаў з розных краін былі далучаны да гэтай работы. Матэрыялы ад Савецкага Саюза падрыхтоўвала Наталля Шкароўская — маскоўскі мастацтвазнавец, якая адна з першых звярнула ўвагу на спецыфічныя рысы выяўленчай самадзейнасці.

Нашай краіне адведзена ў энцыклапедыі значнае месца. Упершыню замежны чытач знаёміцца з самадзейнымі мастакамі — прадстаўнікамі ўсіх саюзных рэспублік. Ад Беларусі ў энцыклапедыі прадстаўлена мастачка-сялянка Алена Кіш. У 1970-ых гадах мінскія мастакі знайшлі яе распісныя дываны ў Слуцкім раёне Мінскай вобласці. Звестак пра Алену Кіш амаль не захавалася, але старажылы расказваюць, што яна працавала ў розных вёсках на працягу 30-ых гадоў. Рэдкалегію энцыклапедыі мастачка прывабіла дэкаратыўнасцю роспісаў, у якіх спалучаліся рысы сялянскай творчасці і гарадскога фальклору. Чысціня мастацкага ўспрымання свету дазволіла Алене Кіш адметнаю моваю сказаць пра маральныя асновы народнага жыцця — дабро і зло, подзвіг і ахвяраванне, каханне і мацярынства.

Цудоўная якасць выдання (на англійскай, французскай і сербскахарвацкай мовах) надае энцыклапедыі значнасць і як твора кніжнага мастацтва.

Э. ПУГАЧОВА.

КАРОТКІЯ РЭЦЭНЗІІ

ПАРТЫЗАНЫ, ПАРТЫЗАНЫ...

Рэспубліка-партызанка... Словы гэтыя сёння добра вядомы ва ўсім свеце, і часам нават тыя, хто слаба ведае пра Беларусь, пры ўпамінанні іх, ажывяцца, спрабуючы ўзнавіць падзеі, пра якія даводзілася чуць. Сапраўды, як пісаў Пятрусь Броўка, «гучаць суладна і ўрачыста: і Беларусь і партызан!», а гады ўсенароднага змагання з нямецка-фашысцкімі захопнікамі — адна з самых яркіх і велічных старонак у нашай гісторыі. Таму не выпадкова, што так шмат твораў прысвечана мужнасці і гераізму барацьбітоў, а тэма нянавісці да захопнікаў праходзіць у іх скразным матывам. Асаблівага ў паэзіі. І ў гэтым лёгка пераканацца, перагарнуўшы старонкі зборніка «Партызаны, партызаны...», складзенага Юрасём Свіркам і выпушчанага выдавецтвам «Мастацкая літаратура» — своеасаблівай паэтычнай анталогіі.

Неўміручыя купалаўскія радкі вынесены ў яе загаловак, верш «Беларускім партызанам», з якога яны ўзяты, адкрывае гэтую ўрачыстую гаворку пра час мужнасці і барацьбы, непахіснасці і стойкасці, вернасці і нянавісці:

Партызаны, партызаны,
Беларускія сыны!
За няволю, за кайданы
Рэжце гітлерцаў паганых,
Каб не ўскрэслі век яны.

З вайны ідуць да чытача і радкі другога слыннага песняра Якуба Коласа: «Адпомсцім ліхадзеям за слёзы, здзек, за кроў. У вілы іх, як змея, і галавы далоў!». «Помста» — так называецца папулярны верш Петруся Броўкі: «За родны сэрцу край, за ўсе пакуты нашы, за здзек, за кроў, за смерць — разлічымся цяпер. Кавалі помсту мы, глыбока боль схаваўшы, расплата падышла, — падбіты дзікі звер».

«Зброю к бою!» — гэта ўжо голас Кандрата Крапівы:

Зброю к бою, партызаны!
Лезе ў хату госць нязваны,
Лезе к нам фашысцкі гад —
Лоб стальны, ды кволы зад.

Паэтычны летапіс працягваюць творы іншых нашых народных паэтаў — Аркадзя Куляшова, Пімена Панчанкі, Максіма Танка. І тыя, што пісаліся ў гады суровага змагання, і радкі, якія з'явіліся нядаўна, як водгук на векапомныя падзеі, на тое, што ніколі не забываецца. Кніга і пабудавана так, што творы ваенных гадоў суседнічаюць у ёй з вершамі, напісанымі ў пасляваенны час. Складальнікам праароблена вялікая работа — прадстаўлена больш за сто аўтараў, а ў пераважнай большасці з іх змешчана па некалькі твораў.

Зразумела, адметнае месца займаюць вершы тых, хто ў гады вайны сам ваяваў ці працаваў у армейскім і партызанскім друку — Змітрака Астапенкі, Анатоля Астрэйкі, Анатоля Вялюгіна, Васіля Віткі, Аляксея Зарыцкага, Міхася Калачынскага, Кастуся Кірэенкі, Максіма Лужаніна, Рыгора Няхая, Паўлюка Пранузы, Пятра Прыходзькі, Валянціна Тараса, Валянціна Таўлая і іншых. Сярод твораў і, можна сказаць, хрэстаматыйныя, як «Помста партызана» З. Астапенкі. Але нямала і вершаў, у якіх вопыт барацьбы з ворагам асэнсоўваецца з вышыні сённяшняга дня. У вершы К. Кірэенкі «Спытайся...», які ў кнігі паэта не ўваходзіў (дарэчы, падобных прыкладаў у зборніку нямала, і адпаведныя творы пазначаны зорачкай), напрыклад, гаворка лірычнага героя падаецца як зварот да чытача і адначасова зварот да кожнага жыхара рэспублікі:

Спытайся —
Чаму
На цудоўнай вось гэтай,
На самай на слыннай
Зямлі партызанскай,
Пры кожнай дарозе,
Пры кожнай сцяжыне,
І помнікаў столькі,
І абеліскаў,
І проста вянкоў
Па-над вокнамі хатаў...

Аднак, як зазначае ў прадмове «Памяццю сэрца» Герой Савецкага Саюза, былы камандуючы злучэння партызанскіх брыгад Полацка-Лепельскай зоны У. Е. Лабанок (гэта адно з апошніх яго выступленняў), «у зборнік увайшлі творы не толькі непасрэдных удзельнікаў вайны». Да гадоў барацьбы звяртаюцца Рыгор Барадулін і Генадзь Бураўкін, Анатоль Вярцінскі і Вера Вярба, Ніл Гілевіч і Анатоль Грачанікаў, Сяргей Законнікаў і Васіль Зуёнак, Уладзімір Паўлаў і Еўдакія Лось, Янка Сіпакоў і Міхась Стральцоў, Васіль Макарэвіч і Казімір Камейша... Назваць усіх проста немагчыма, бо няма такога паэта сярод маладзейшых, хто б не пісаў пра перажытае бацькамі і старэйшымі таварышамі, хто б не вывяраў кожны пражыты дзень па тым, як жылі, змагаліся і паміралі героі.

Пры афармленні зборніка выкарыстаны рэпрадукцыі вядомых твораў беларускіх мастакоў — «За родную Беларусь» Уладзіміра Сухаверхава, «Канстанцін Заслонаў» Яўгена Зайцава, «Палонных вядуць» Анатоля Шыбнёва, «Партызанскі аэрадром» Паўла Гаўрыленкі, што садзейнічае яшчэ большаму сэнсава-эмацыянальнаму ўздзеянню кнігі на чытача. Увогуле, нельга не зазначыць, што калектыўных зборнікаў у «Мастацкай літаратуры» ў апошнія гады выходзіць шмат. Большасць з іх падрыхтаваны патрабавальна і хутка знаходзяць сваю дарогу да чытача.

В. ЛЯСУН.

Яўген МІКЛАШЭЎСКІ

Праўда Леніна

Ёсць мінулае ў нас,
і, калі зазірнуць
У глыбіні стагоддзяў міжволі,
Дык убачыш: туды
дзве дарогі вядуць—
Панавання і вечнай нядолі.
Ёсць мінулае ў нас,
дзе два сонцы было—
Сонца бедных і сонца багатых.
Калі ззяла адно,
дык другое пякло
Ці не грэла наогул у хатах.
І не толькі два сонцы—
дзве праўды было,
І адна з іх—на тройцы імчала,
А другая ў бяссіллі,
пякло ці мяло,
Сваю сцежку да волі шукала.
Як дзве праўды ў жыцці,
так дзве долі было—
Доля бедных і доля багатых:
Дзе бяспраўе адно,
дзе і ноччу святло—
Сонца ў вокнах і месяц у кратах.
Гэта—праўда паноў,
калі хлеба спрадвек
Не было ў ратая, як святла
ў дрывасека...
Чалавека бяздольным
зрабіў чалавек
І бяспраўным зрабіў чалавек чалавека.
Але слёзы дзяцей,
але крыўды людзей—
Кроў і праца ў жыцці не прапалі,
І зярняткі надзей
у віхурах падзей
На зямлю—не на камень упалі,
Калі ў веснія дні
на прыволжскай зямлі
Чалавек найвялікшы з'явіўся,
І, хоць рэкі цяклі
і хоць вербы цвілі,
Спахмурнела мана на зямлі ўся.
І пакутная праўда
народа ўсяго,
Што ў глыбінях душы бунтавала
І шукала дабра,—
стала праўдай яго
І вялікаю вераю стала.
З гэтай верай—
паходняй і сцягам сваім—
І па ссылках прайшоў ён і турмах,
Каб жыццё, як вясна,
усміхнулася тым,
Хто туліўся ў хаціначках курных.
Хто гібеў у бараках,
казармах сырых,
У акопах на першай сусветнай,
За гаротных усіх,
за галодных усіх
Ён змагаўся з маной пракаветнай.
Мы жывём спадзяваннямі
продкаў сваіх
І за мір яшчэ будзем змагацца,
Бо змаганне—
свяшчэнная спадчына тых,
Што хацелі людзьмі называцца.

●

Мы жывём і радуемся з вамі,
Але што чакае нас, калі
Дрэвы стануць чорнымі слупамі
І пагасне сонца на зямлі?

Там, дзе ўсё квітнела, зелянела,
Дзе і гром грымеў, і падаў снег,
Не засвеціць далеч нівай спелай,
Сціхнуць песні, гамана і смех.

— Сціхнуць песні? Голас чалавечы?
Ці ж такая будучнасць зямлі?
І хіба да гэтага з галечы
Людзі так пакутліва ішлі?—

На мяне махаюць веццем дрэвы,
Нават вецер на мяне шуміць,
А вакол хвалююцца пасевы
Ад жытоў азімых да пшаніц.

У прысадах нешта шэпчуць клёны,
Ледзь паспеўшы лісце паказаць...
Ах вы, дрэвы! Свет зямлі зялёны!
Што мне вам на гэта адказаць?

Ёсць яшчэ вайна і ёсць улады,
Што сусвет спалілі б, каб маглі,
Ёсць такія ўлады, што не рады,
Калі смерць не ходзіць па зямлі.

Ёсць адно на свеце толькі выйсце
І адзін ратунак ёсць—усім
Чалавецтвам на змаганне выйсці
Супраць тых, што пагарджаюць ім.

Супраць тых, што, сеючы вар'яцтва,
Прагнуць светам цэлым уладаць...
За жыццё патрэбна ўсім змагацца,
За жыццё патрэбна ўсё аддаць!

Свет людзей, ты не такі бяссільны...
Дык не дай варожасці людской,
Нібы крыж, паставіць слуп магільны
Над зямлёй—калыскаю тваёй!

●

Гэта музыка—радасць
І ад смутку ратунак.
Промні сонца
зара дасць
Толькі дню ў падарунак.
Гэта музыка—словы
Весялосці і скрухі,
Калі ранак вясновы
Робіць першыя рухі.

І ад поля да поля—
Стужка сініх валошак...
Гэта музыка—воля,
Гэта музыка—пошук!
Не сабраць
гэты россып
Незабудак і смолак,
Калі квецень—наросхліст
І ў пасеваў, і ў зёлак!

І на кожнай паляне,
І ў жыцці шматгалосым
Гэта музыка—ззянне,
Гэта музыка—пошум!
На паўсвета—
квітненне,
А на сэрцы—дасвецце!
Каб не гэта імгненне,
Ці было б што на свеце?!.

●

Буйны дождж па прысадах сячэ.
Раўчукі, як сляды, на пяску.
І спявае зямля, хоць яшчэ
Бліскавіцы мігцяць убаку.

Грукат сціх. Навальніца прайшла.
Як на цуд, я на дрэвы гляджу.
Нібы пырскі крыштальнага шкла,
Заіскрыліся кроплі дажджу.

А над грукатам ліўня цяжкім
Замігцела вясёлка здаля,
Як падкова каня, на якім
Праімчаўся па небе Ілля.

●

На асіне лісцё затрымціць
І, здаецца, кудысь паляціць,
Калі вецер захоча.

Ды, куды б ні ляцела яно,
Не пакіне галля ўсё адно—
Ёсць палёт і на месцы.

Каб лісцю на асіне трымцець,
Немагчыма ў прасторы ляцець—
І ляціць яно ў часе.

Але гэта—таксама палёт,
І з прыродаю круг свой штогод
Робіць лісце на дрэвах.

І, каб з ліку не збіцца, штораз
Пакідае кругі свае час
У драўніне, як знакі.

І па іх чалавек, як відаць,
Навучыўся лічыць, ды чытаць,
Ды пісаць на бяросце.

●

Ты не слухай тых ніколі,
Хто, згадаўшы штосьці,
Вылье песняю на поле
Сум па маладосці.
Гэты сум—як позні лівень
Жнівеньскай парою,
Як на сонцы спеліць жнівень
Жыта пад гарою.

Ты паслухай лепей тую,
Што табе спявае
Песню сумную такую
На пачатку мая.
Мае сум дзявочай песні
Сілу дажджавую
І на дождж падобны весні,
Ці ваду жывую.

Ты, як дзень зямлю азорыць,
Асвяжыся ёю,
І яна цябе адорыць
Сілай маладою.
Гэты сум, як золак ранні,
Нешта абяцае:
Ці спатканне, ці каханне...
Што—спытай у мая.

●

Пасадзіла вішню я,
бо пара!
Вішанька не лішняя
ля двара.

С. ДЗЯРГАЙ.

Не налюбуюся вішнямі,
Як і сваёю каханаю,—
Вішнямі з пчоламі ўвішнымі,
З квеценню белай, духмянаю.

Не разбіраючы словы, я
Слухаю музыку спеўную.
Поўняцца думкі вясновыя
Прагай жыцця неспадзеўнаю.

Па-маладому жадаецца
І па-вясноваму марыцца.
Сонца святлом раскідаецца,
Сэрца, як неба, не хмарыцца.

Хмурыцца вока ўсявышняе:
Выйшла, што лішні на свеце я.
Вішанька толькі не лішняя,
Нават калі яна—трэцяя.

Мой родны кут...

Фотаэцюд А. КАЛЯДЫ.

СТАРОННІ ЎСПАМІНАЎ

«ДАРАГАЯ мая Ксанечка! — пісаў тата маме з фронту 16 мая 1942 года. — ...На досвітку ўсё наўкол прачнулася, заспявалі салаўі і іншыя пярнатыя стварэнні. А пасля закукавала зязюля... І гэта так нагадала родныя мясціны, Беларусь, што я вось ужо цэлыя суткі хаджу пад гэтым уражаннем і, як бачыш, не стрымаўся, каб не напісаць табе. Так усё жыва і ярка прайшло перад маімі вачамі, столькі роднага і добрага ўсплыло, што я фізічна адчуў неабходнасць вярнуць, адбіць у ворага прыгажосць, родныя дарагія нам палі і лясы. Добра, што гэтымі пачуццямі ў мяне ёсць з кім падзяліцца...»

Вось у якія радкі выліўся гэты настрой у вершы «Над брацкай магілай»:

Беларусь мая родная,
як жа я рвуся яшчэ раз
Пеша ўсю цябе, змераць,
увесь і чабор твой і верас!..
Сэрца просіць шляхоў,
Што цяжкім маім ботам пад сілу;
Наглытацца хачу туманоў,
Твайго ветру і пылу;
Наглытацца хачу за сябе і за тых,
Што не ўстануць з нябыту;
Вочы просяць нябёсаў тваіх,
Ім твайго не хапае блакіту...

Дачка Кузьмы Чорнага Рагнеда Мікалаеўна расказвала мне, што гэты верш, а таксама «Ліст з палону» зрабілі на беларускіх пісьменнікаў і ўсіх беларусаў, што працавалі пры Цэнтральным штабе партызанскага руху ў Маскве, велізарнае ўражанне, узрушылі да глыбіні душы.

Аднак вернемся да бацькавага пісьма. Яно, як і іншыя пісьмы з фронту, напісана па-руску. Але слова «зязюля» пакінута без перакладу, у яго беларускім моўным афармленні. Слова гэтае ў куляшоўскім паэтычным лексіконе не нейтральнае. Прыгадаем тут хоць бы вось гэтыя радкі:

Калі вясною закукуе
Зязюля ў лесе раніцой,
Ты прыгадай вясну другую,
Бары на Міншчыне маёй.

Згадай усё, што сэрцу міла,
Што сэрцу дорага было,
Што адцвіло, адгаманіла,
Аднукавала, адышло.

Зязюля ў яго — сімвал вясны і жыцця. Ведаючы гэта, няцяжка здагадацца, што бацька ў пісьме да мамы пакінуў слова «зязюля» ў беларускай агаласоўцы не выпадкова, тым больш, што ў рускай мове амонім слова «зязюля» мае і адмоўнае значэнне.

Не так даўно трапілі да мяне ўспаміны бацькавага аднапалчанина, журналіста Якава Сямёнавіча Бабкова. Вось што піша ў сваіх успамінах Я. Бабкоў: «Часовы камандны пункт арміі знаходзіўся на безыменнай вышыні ў адзіным ацалелым драўляным дамку з цокальным паверхам на каменным падмурку ў непасрэднай блізкасці ад лініі фронту. Дамок часта падвяргаўся артабстрэлу з боку праціўніка. У гэты час на прыём да члена ваеннага савета прыбыў рэдактар газеты «Знамя Советов» У. Б. Фарбераў. Ірвуцца вакол снарады, уздрыгвае зямля, ляцяць на дол аскялёпкі аконнага шкла. За невялікім столікам, збітым з дошак, над картай схілілі галовы І. В. Зуеў і начальнік разведаддзела палкоўнік Сашальскі. Даўшы ўказанне Сашальскаму аб узмацненні разведкі ў напрамку Кірылаўшчыны, Іван Васільевіч, звяртаючыся да Фарберава, сказаў:

Часопісы ў верасні

«ПОЛЫМЯ»

Падборка вершаў М. Танка «Збор калосся» адкрывае нумар.

Друкуюцца заканчэнне аповесці Т. Бондар «Жывыя жывуць» і п'еса В. Іпатавай «Памяць у крэдыт».

Да Дзён літаратуры горада-героя Ленінграда ў Мінску прапануюцца вершы М. Дудзіна, В. Шэфнера, Б. Кежуна, М. Камісаравай, А. Чапурова, М. Барысавай, Г. Гарбоўскага, Ю. Воранава ў перакладах С. Грахоўскага, Я. Міклашэўскага, Я. Янішчыц, Ю. Свіркі, А. Пісьмянкова, Г. Пашкова і апавяданні С. Вароніна і Г. Гарышына (пер. В. Супрунчука).

Вершы Г. Абашыдзе і І. Нанешвілі пераклаў В. Вітка.

Пад рубрыкай «Насустрач XXVII з'езду КПСС» — артыкул І. Макаловіча «Дыялог з камп'ютэрам».

— Ну, цяпер, Уладзімір Барысавіч, давайце займемся газетай.

Іван Васільевіч уважліва вывучыў планы чарговых нумароў армейскай газеты. Ён прасіў Фарберава як мага больш і цяплей расказваць на старонках газеты пра байцоў Савецкай Арміі, пра гераічныя подзвігі, праяўленыя ў змаганні з гітлераўцамі. Ён гаварыў, што, ведучы жорсткія баі, салдаты штохвілінна падвяргаюцца смяртэльнай небяспецы. Трэба, каб у хвіліны заціішша яны маглі прачытаць у газеце не толькі зводку Саўінфармбюро, цікавыя артыкулы, нарысы, але і матэрыялы, якія выклікалі б усмешку, стваралі б бадзёры, баявы настрой. Звяртаючыся да рэдактара газеты, Іван Васільевіч спытаў:

— Уладзімір Барысавіч, што можа прапанаваць у гэтым сэнсе «Знамя Советов»?

Уладзімір Барысавіч сказаў, што ёсць прапанова Аркадзя Куляшова аб стварэнні літаратурнага героя «Аляксея Пятрова» і падрабязна расказаў пра гэтую прапанову.

Іван Васільевіч не тое што ўхваліў, а з захапленнем прыняў яе.

Першы расказ Аркадзя Куляшова пра «Аляксея Пятрова» быў апублікаваны ў армейскай газеце 9 верасня 1941 года пад загалоўкам «Знаёмства з героем»:

Познакомимся с Петровым, —
Где родился он, как звать?
Дом его в селе за Псковом.
Алексей — душевным словом —
С детства звала его мать.
Он — стрелок, обучен, годен,
Защищать страну готов,
Не в одном бывал походе
Снайпер Алексей Петров...
На Карельском перешейке
Был в крещенье боевом,
ДОТ взрывал,
Из трехлинейки
Добивал врага потом.
Не одну сразил «КУКУШКУ»
Алексей, а между дел
Изучал успешно пушку,
Как стреляет — знать хотел...
И, как водится, немало
Изучил он разных дел,
Горю всякому, бывало,
Алексей помочь умел...»

«Я маю магчымасць падаць рапарт аб выкарыстанні мяне ў беларускай прэсе, — пісаў бацька з фронту маме 11 красавіка 1942 года. — Але гэта звязана з магчымым працяглым і няпэўным знаходжаннем у рэзерве. І я пакуль ніяк не магу рашыцца. Ведаю, што калі я папрашу тваёй парады, ты мне адкажаш: «Рабі, Аркадзька, як знаеш, табе відней...» Але ўсё ж, Ксанечка, я, магчыма, рашуся на гэты крок, таму што мяне вельмі цягне да беларускай мовы, і я ўжо адчуваю вострую неабходнасць у гэтым. Бо інакш можна наогул адвыкнуць і перастаць быць тым, чым быў раней. Падумай, родная, і не асуджай мяне, калі я так і зраблю...»

У рэзерв арміі ён перайшоў толькі ў 44-ым, а задума паэмы «Сцяг брыгады» ўжо выспела і прасілася на паперу. Цяжкія ўмовы армейскай газеты не спынілі бацьку, і ён узяўся за пяро, аб чым паведамляў у паштоўцы, адрасаванай Пімену Панчанку, які знаходзіўся ў той час паблізу, у рэдакцыі франтавой газеты «За свободную Белоруссию».

Падзяліўся ён гэтым сваім творчым сакрэтам з П. Панчанкам не выпадкова. Сябравалі яны даўно. Прынамсі, мне імя Пімена Емяльянавіча запала ў памяць яшчэ з даваеннай пары.

Зімой 1939 года я, хворая на дыфтэрыт, ляжала дома, у адным з двух нашых пакояў у ізаляцыі. Са мной неадлучна была мама, з якой, як і са мной, не мелі кантактаў іншыя сямейнікі, баючыся распаўсюджання заразы. Адным жа днём дзверы ў пакой адчыніліся, і я ўбачыла на парозе стройнага блакітнавокага вайскоўца з каробкай цукерак і лялькай. Далей, за парог, яго не пусцілі, але ляльку і цукеркі ён нам, мне і маме, перадаў.

Лялька была маёю марай: вялікая, прыгожая, яна да ўсяго і вочы заплюшчвала. Па тым часе гэта было цудам лялечнай прамысловасці. Я цешылася ёй на працягу ўсёй сваёй доўгай хваробы: расчэсвала ёй валасы, карміла яе, мыла, укладвала спаць. Але тады, у час хваробы, убілася мне ў галаву і чыста хлапечая думка — паглядзець, як яна заплюшчвае і расплюшчвае вочы. Ачуняўшы ад хваробы, я паплакала над ёй, а пасля... разламала яе, сваю ненаглядную ляльку. І была страшэнна расчаравана тым, што механізм заплюшчвання і расплюшчвання вачэй аказаўся надзвычай прымітыўны.

А шчодры госць інтрыгаваў мяне куды даўжэй. Памятаю, што мне не давала спакою яго дзіўнае імя яшчэ і пасля вайны. Справа ў тым, што я не разумела, дзе тут імя, а дзе — прозвішча...

Тут тата, напэўна, перапыніў бы мяне, папракнуўшы ў тым, што я забылася, пра што хачу расказаць. Аднак я не забылася. Імя Пімена Панчанкі гучала ў нашым доме ці не з той пары, як я памятаю сябе. Я і цяпер адчуваю сябе ў іхнім доме, як у сваім уласным.

Асаблівага падабенства паміж Панчанкам і бацькам я не знаходжу, калі мець на ўвазе характар аднаго і другога. Але ёсць нешта такое, што стаіць над характарам. Гэтае «нешта» вызначае атмасферу, якую чалавек стварае вакол сябе. Якія кампаненты гэтага эфекту — можна здагадвацца, але галоўны заключаецца ў тым, што абодва яны, бацька і Панчанка, — найбольш яркія прадстаўнікі свайго часу як у беларускай паэзіі, так і ў жыцці.

У 1974 годзе, гамонячы з Пімена Емяльянавічам пра яго новую кнігу, бацька спытаў:

— Скажы, як ты не заўважыў, што ў тваёй кнізе ёсць слова, якое магло б даць назву ўсёй кнізе?

— Якое слова ты маеш на ўвазе?

— Хуткасць!

— Гэта не маё слова...

— Ты ведаеш, я яго ў цябе пазычу...

Ёсць хуткасць гуку, ёсць—звышгукавая,
Ёсць хуткасць зор, прыкметная для ўсіх,
Яшчэ ёсць хуткасць думкі, хуткасць тая,
Што, як святло, стагоддзе абганяе,
З тысячагоддзем размаўляе ўслых.
О, таямніца кніг, скажы, з якіх
Людскіх глыбінь ты цуды здабывала?
Твой пачынальнік слоў не знаў і мала
Свет разумеў, не меў матык і сох,
Маўчаў, як сом, пакуль бяда не ўзяла
За шчэлепы яго і на пясок
Не кінула, пакуль сярод начы,
Яго душы нямой, сканаць гатовай,
Не загадала: — Дыхай, плач, крычы,
Нябыт цяжкі пазбудзь не рыб'яй мовай.

Свет будзе пець, смяяцца, слёзы ліць
Датуль, пакуль на свеце людзям жыць.
Сабрат мой па пяру, на суд іх смела
Выводзь усё, што ў сэрцы набалела.
Слёз не стрымаеш — плач, але не тою,
Пад пачуццё падробленай, слязою,
А той, што смех вяртае з небыцця.

Смяяцца хочаш — смейся, як дзіця.
Перад сабой і светам будзь праўдзівы.
Прымай, як дар, жыццём пасланы дзень,
І, можа, кніга гэта век імклівы
Дагоніць і абгоніць,
як прамень.

Верш «Хуткасць» даў назву апошнім (на беларускай і рускай мовах) бацькавым кнігам, падрыхтаваным да выдання ім самім.

15 студзеня, ад'язджаючы ў санаторый «Нясвіж», ён, прадчуваючы благое, спяшаўся дарабіць недаробленае. Адной з такіх недаробак быў непадпісаны дагавор на кнігу «Хуткасць», здадзеную ў выдавецтва напярэдадні ў адсутнасць рэдактара. У дзень ад'езду ў Нясвіж ён яшчэ раз заехаў у выдавецтва, каб падпісаць дагавор, але рэдактара зноў не аказалася на месцы. Гэта быў не адзіны важны клопат, які не па яго віне павісаў у паветры, аднак жа і ён клаўся цяжарам на сэрца, займаючы яго мозг і перашкаджаючы рабоце. Таму, напэўна, і пазбягаў ён усё жыццё ўсялякіх бытавых турбот, перакладаючы іх на маміны плечы.

Гэтым таксама ў пэўнай ступені вытлумачвалася непарушная пазіцыя маёй маці, як гаспадыні дома, якая ніколі нічога не патрабавала ад бацькі, звыкнуўшы, з самага пачатку іх нялёгкага жыцця, весці хатнюю гаспадарку на сціплыя сродкі. Хоць, вядома, калі гаварыць аб адказнасці за сям'ю, — бацька ніколі ад гэтай адказнасці не адмахваўся.

У пісьме з фронту ва Уральск, дзе мы жылі, бацька пісаў маме 30 жніўня 1943 года: «Мяне вельмі непакоіць стан здароўя твайго і Вовінага, таму што Надзя ў сваім пісьме пісала пра гэта. Ты наогул мала пішаш пра сябе і пра сваё здароўе, а павінна была б пісаць. Праўда, ты лічыш, што памагчы я нічым табе не змагу, але ўсё ж гэта няпраўда, бо я ж сёе-тое магу зрабіць, каб палепшыць тваё становішча. Пра гэта я думаў заўсёды і думаю цяпер увесь час. Я напісаў досыць сярдзітае пісьмо Лынькову адносна ліміта (на 300 рублёў штомесячна) для цябе. Вядома з лімітам цяпер позна ўжо, але з новага года я спадзяюся дамагчыся. Размеркаванне ліміта залежыць ад Лынькова, бо Саюз пісьменнікаў СССР дае не персанальна, а на беларускі Саюз пэўную колькасць (5 лімітаў). Гэтыя ліміты размяркоўвае Лынькоў... Сярдзітае пісьмо я яму напісаў, бо зацікаўлены ў зберажэнні сваёй сям'і. Калі гэта не дапаможа, напішу т. Панамарэнку і т. Фадзееву. Думаю, што ў гэтым выпадку я павінен адкінуць матывы сціпласці і ілжывага сораму і патрабаваць не для сябе асабіста (мне ён не патрэбен), а для сваіх дзяцей...»

Мы заўсёды жылі ў цеснаце, але, прымаючы пад увагу спецыфіку бацькавай работы, мама нейк умудралася ствараць для яго ізаляваны куточак на той невялікай жыллёвай плошчы, якой валодала наша сям'я.

...Бацька ад'язджаў з Мінска 15 студзеня па абедзе. Ён зайшоў да мяне развітацца. Зайшоў на хвіліну-другую, бо ўнізе ўжо сядзелі ў машыне яе гаспадыня (згаданая ўжо тут мною дачка Кузьмы Чорнага Рагнеда Раманоўская) і мой Валерый, які павінен быў адвезці тату ў Нясвіж. На гэты раз я не магла паехаць разам з ім — не пускалі пільныя справы. Мы развіталіся, ліфт за ім закрыўся. Я пайшла ў кватэру, хацела штосьці рабіць, але не магла, усё валілася з рук. На душы было цяжка. Нешта гняло мяне. І тут раптам мне стукнула ў галаву: я павінна, як і заўсёды раней, ехаць з ім! Кінулася на балкон, зірнула ўніз, хацела крыкнуць, каб яны пачакалі хвіліну, пакуль я апрануся, але ўбачыла толькі, як бацька, сеўшы ў машыну, ляпнуў дзверцамі...

Познім вечарам, ноччу ўжо, вярнуўшыся з Нясвіжа, Рагнеда і Валерый расказалі мне, што бацька прасіў іх пасядзець з ім, папіць разам чаю, але яны адмовіліся, бо Валерыю трэба было паспець на дзяжурства. Ад іхніх слоў у мяне зноў зашчымела сэрца.

Апошні раз я чула бацькаў голас 27 студзеня 1978 года. Ён пазваніў, каб павіншаваць мяне і Олю з днём нараджэння.

Маме ж ён званіў 2 лютага: папрасіў, каб Валерый забраў яго з Нясвіжа раней, датэрмінова, 5 лютага (пуцёўка ў яго была да 11-га), каб адзначыць свой дзень нараджэння разам з намі, дома...

Заслона хмар над імі ходзіць нізка,
Спускаецца імгла, нібы на дол,
На іх страху...
Ах, запісная кніжка,
Навошта я кладу цябе на стол!

Маім радкам ты некалі была
Затокаю сярод лясоў зялёных:
Нямала лодак, і мастоў пантонных,
І караблёў ты мору аддала.

Цяпер з табой мы не дамо ім рады.
Як і раней, іх глушыць часу гул.
Як і раней, цікуюць іх піраты,
Тарпеды, што падобны на акул.

Валянціна КУЛЯШОВА

ХУТКАСЦЬ

З «Кнігі пра бацьку»

«Дзе жыве сіняя птушка» — нарыс М. Герчыка.

З М. Савіцкім гутарыць Б. Крэпак — «Гэта важна, каб цябе зразумелі...»

З артыкуламі выступаюць У. Юрэвіч — «Маральны пошук у сучаснай прозе», М. Мушынскі — «Максім Багдановіч — крытык і гісторык літаратуры».

Развагі Л. Дайнекі «Жывое святло стагоддзяў», У. Гніламёдава «Юнацтва нашых літаратур», А. Грачанікава «Продкаў несмяротная песня» змешчаны пад рубрыкай «Да 800-годдзя «Слова аб палку Ігаравым».

Новыя кнігі рэцэнзуюць Ц. Ліякумовіч, М. Караткоў, А. Куратава і Ю. Сергіеўская.

Ёсць падборка «Наш каляндар».

«МАЛАДОСЦЬ»

Паэзія прадстаўлена вершамі В. Гардзея, В. Вярбы, Р. Тармолы і К. Жука.

Змешчаны падборка І. Шамякіна з дзённікаў апошніх гадоў «Карэнні і галіны», апавяданні І. Казловай і Л. Гаўрылкіна.

«Поле памяці» — урывак з дакументальнай кнігі пра Героя Савецкага Саюза М. Чэпіка, які загінуў у Афганістане, выконваючы інтэрнацыянальны абавязак.

Артыкул В. Лапіна «З чыстых крыніц» публікуецца пад рубрыкай «Культура вёскі — камсамольскі клопат».

«Ці лёгка стаць гросмайстрам?» — развагі В. Холада і А. Лысаконя.

Штрыхі да творчага партрэта С. Законнікава напісаў А. Русецкі — «Пад уважлівым позіркам Радзімы».

В. Чамярыцкі ў артыкуле «Неўміручая песня Старажытнай Русі» піша пра «Слова аб палку Ігаравым».

Кнігу У. Ягоўдзіка «Стронга» рэцэнзуе В. Гігевіч — «Спасціжэнне прыгажосці».

«БЕЛАРУСЬ»

«Сярод людзей» — урывак з кнігі А. Казловіча пра двойчы Героя Сацыялістычнай Працы В. Старавойтава.

І. Калюта і В. Жылін знаёмяць з аператарам машыннага даення племзавода «Карэлічы», Героем Сацыялістычнай Працы Т. Чубрык — «Усе прыступкі майстэрства».

Вершы ленінградскіх паэтаў М. Дудзіна, А. Чапурова, М. Камісаравай, С. Давыдава, В. Шэфнера, Г. Пагірава, І. Фанякова пераклаў С. Грахоўскі.

Друкуюцца апавяданні Б. Сачанкі і А. Кажадуба, вершы Р. Тармолы, нарыс Л. Суханавай «Камп'ютэр на школьнай парце», рэпартаж А. Лабады «Свята пад купалам».

Штрыхі да творчага партрэта І. Навуменкі «Астравы памяці» напісала Р. Станкевіч.

Пад рубрыкай «Пісьменнік і жыццё» прапануецца публіцыстычны роздум П. Місько «Глуханямыя душы».

Публікуецца падборка матэрыялаў з XVIII Усесаюзнага кінафестывалю.

«НЕМАН»

У аўтарызаваным перакладзе Н. Кісліка прапануецца нізка вершаў П. Панчанкі «Лясныя воблакі». Паэзія прадстаўлена таксама творамі В. Кіені і А. Аўруціна.

«Сягоння і памяць» — навелы Я. Брыля ў аўтарызаваным перакладзе Г. Папова.

Друкуецца заканчэнне рамана Ж. Сімянона «Справа Фершо» (пер. з французскай Т. Грачовай).

Справаздача з пасяджэння «круглага стала» публікуецца пад рубрыкай «Насустрач XXVII з'езду КПСС» — «Школа эканомікі, школа прыроды».

У раздзеле «Літаратурная крытыка»— артыкул В. Івашчанкі «Спазнанне».

З рэцэнзіямі выступаюць Ю. Багданаў, М. Эпалетаў, С. Саладоўнікаў, Г. Сіненка, А. Грыцкевіч і А. Трусаў, Т. Цюрына.

Завяршае нумар «Хроніка «Немана».

9 верасня 41-ая гадавіна сацыялістычнай рэвалюцыі ў Балгарыі

Слаў Хр. КАРАСЛАВАЎ

Дзверы балгарына

Дзверы мае, вы адчынены
вечна,
Як душа, што яшчэ не кахала:
На падворак заходзяць
і дзень, і вечар,
І стамлёныя птушкі
шчабечуць,
І пралеска вясной прыбягала.

Дзверы мае вас у госці ветла
Запрашаюць — не будзе цесна,
Будуць горы ласункаў
прыветных,
Будзе сонца — гронкаю
светлай,
Што дае нам і сілу, і песню.

А калі вы пабачыце: дзверы
Перакрыты завалай
драўлянай,—
Знайце, выйшаў я раніцай
шэрай,
Каб у бітве спаткацца
са зверам —
З лютым ворагам, госцем
нязваным.

Матэй ШОПКІН

Пары ў

Бальніцы і хваробы?..
Не пра гэта
Я думаю, не ў гэтым клопат
мой!
Бярозка да мяне імкнецца
светла,
Блакіт высокі ззяе нада мной.

Дыханне траў. І матылькоў
мільганне.
І я іду — шчаслівы, напрасткі.
Прырода ў працы кволаю
не стане,
І мне наканавана быць такім.

Каб меў я цвёрдасць вечную
граніта,
Пяшчотны быў, нібы крынічны
звон.
Каб дух спрачаўся з вышынёй
блакітнай,
Каб не скарыў яго падземны
сон.

Каб землятрусы ў голасе
грымелі
І вадапады, што ляцяць
з гары,
Пачуцці каб ніколі не старэлі,
Былі святлей світальнае зары.

Каб здолелі трывалай моцай
жылы,
Нібы карэнне дуба, набрыняць,
У шчасці каб і ў смутку меў
я сілы
На плечы горы цэлыя узняць.

Каб не спазнаў смяротнае
знямогі,
З прадоння каб імкнуўся
ў вышыню...
І лісце той бярозкі беланогай
Каб мне шаптала штосьці
ў цішыню.

Пырван СТЭФАНАЎ

Кантрасты

І фарбаў шал, і неўтаймоўны
нораў
У вочы б'юць у нейкай дзікай
яве.
Нібы мастак-вар'ят са зрокам
хворым
Згусціў усё і ўсё
супрацьпаставіў.
Дабрэйшым добры робіцца,
а злыя
Ушчэнт люцеюць. І растуць
кантрасты.

Дактрын кантрасты і краін —
стыхіяй
Растуць пагрозна ў смерчы
пакручастым.
Граніцы паміж імі — нібы
кабель
Аголены: вось-вось ударыць
громам.
І выбух узнясецца над вякамі,—
І ўсё. Нічога больш...
Quo vadis, homo?*

* Куды ідзеш, чалавек? (лац.).

Стэфан ПАПТОНЕЎ

Вочы паэта

Рыгор Барадулін, паэт
беларускі,
Шлях зведаў са мною
і ўдоўжкі і ўшыр.
Ад грон вінаградных
зліпаліся вусны.
Нам дождж далягляды
вясёлкай вяршыў.

Расказваў я шмат,
Шмат маўчаў. І ўвесь шлях
Я чуў шмат разоў
Беларускае: «Ах...»

Сустрэлі самотніка ў нетрышчах
Рылы.
Нас голасам ціхім люляў
той манах,
Той, што ў «ГІСТОРЫЮ...»
людства звёў сілы...
Я дыхаў табой,
Беларускае: «Ах...»

У Траўне, як сонца, узоры
са столі
Нас грэлі легендай і цёплай
разьбой.
У ранах балгарскіх танулі
і ў болях.
У лёсе цяжкім ускрасалі
з табой.

Расказваў я шмат,
Шмат маўчаў. І ўвесь шлях
Я чуў шмат разоў
Беларускае: «Ах...»

Дзялілі мы хлеб на вясковай
выгодзе.
У храмах былі.
І на шчодрых банкетах.
Рыгор у Балгарыю уваходзіў
З душою дзіцяці,
З вачыма паэта.

І сонца па кроплі збіраў ён,
і словы,
Пабоішчаў попел,
І ўсмешкі жанчын,
І лісця асенняга подых
барвовы, —
Пятнаццаць тых дзён —
на шчымлівы ўспамін.

Рыгор Барадулін, няўжо гэта
сніцца?
Знаёма мне ўсё — галасы
і спакой,
Я ўсё тут аб'ездзіў,—
а сёння як быццам
Наноў адкрывае ўсё позірк мне
твой.

І ў той гамане,
І ў маўчанні праз шлях
Адчуў я: таксама
Ускліквае: «Ах...»

Сусвет адкрываеш і кроплю
малую...
І поўняцца гронкі,
І рэха пяе...

Рыгор Барадулін, цябе
я цалую
У вочы твае—
За вочы твае...

Пераклаў з балгарскай
Васіль ЗУЕНАК.

МАСТАК і ЖЫЦЦЁ

ПЛАНЕТА СКУЛЬПТАРА

Будзеш ісці шпарка — можа, і не ўгледзіш гэтую камяніцу. З боку вуліцы Пуліхава яе маскіруюць клён і ліпа, кусты бэзу і рэшткі яблыневага саду. А запаволіш крок — можна разгледзець фасад. Можа, побач з домам пабачыш і гаспадара: каржакаватага, падцягнутага, у берэце і ў масіўных акулярах, з элегантным кійком у дужых руках.

Высокі аздоблены булыжнікам цокаль. Тэракотавай пліткай абліцаваныя сцены. Вокны ў тры паверхі. Сям-там на вокнах відаць фігуркі накшталт вялікіх статуэтак... Я жыву непадалёк і таму ведаю «сакрэт» гэтага нядаўна збудаванага дома. У ім — новая дзяржаўная майстэрня скульптара Заіра Азгура. Хоць майстра пакуль як бы «ў дарозе» да новага творчага дома (многае не перавезена з ранейшага месца працы, а галоўнае — там, не тут, яго рабочы станок, ля якога Азгур бывае штодня), ён адчувае сябе і навасёлам. Запрашае: «Прыходзьце».

З цікавасцю пераступаю незнаёмы парог. Вабны спецыфічны пах новых сцен — яшчэ сыраватай вапны і цэменту, свежалакаванага дрэва... Прыкмячаю і нешта знаёмае, пазначанае пячаткай мудрага і даўняга часу. У першай жа, самай прасторнай зале майстэрні, на падлозе і на стэлажах, — традыцыйныя партрэтныя бюсты і галоўкі, фігуры на поўны рост і эцюды да вядомых помнікаў. Своеасаблівая рэтраспектыўная экспазіцыя работ З. Азгура. У гэтай рэтраспектыве — ён пацвярджае — няма сістэмы: работы размешчаны хаатычна, без храналагічнай ці тэматычнай паслядоўнасці, без прэтэнзій на кампазіцыйную логіку.

Гаспадар майстэрні прапануе крэсла — але сядзець «у прысутнасці» шматлікіх жыхароў гэтага вялікага пакоя мне ніякавата. Так, яны жывуць — маўклівыя і нерухомыя, — жывуць у гэтым новым доме. Ціха жывуць, асабліва: захоўваюць гістарычны адбітак часу і свае ўласныя духоўныя радаслоўныя — з біяграфіямі нявыдуманых прататыпаў, з перажываннямі самога стваральніка-скульптара.

Зрэшты, і стаяць сярод іх няёмка. Мноства людзей, але не натоўп. Мноства паасобных твараў, абліччаў. Людзей з імёнамі і прозвішчамі, па-свойму адметных. Здаецца, ледзь не кожны глядзіць на цябе і патрабуе персанальнай тваёй увагі. Біяграфія, характар, настрой, вобраз — усё, над чым тыдні, месяцы, а, можа, і гады раздумваў мастак пад час пэўнай працы, цяпер множыцца ў дзіўнай поліфаніі, абрыньваецца на цябе ў момант. Суседства перадавой беларускай калгасніцы, віднага замежнага палітыка, старажытнага філосафа, сучаснай опернай артысткі, партызана Вялікай Айчыннай — заканамерны парадокс гэтай майстэрні.

Сустракаю тут даўно знаёмыя работы З. Азгура. «Ленін з дзяўчынкай» і «Мусаргскі» былі ў строгім інтэр'еры нашай школы на пляцы Свабоды. Некалі першакласніцай па дарозе ў школу праз Цэнтральную (цяпер Кастрычніцкую) плошчу праходзіла гранітны пастамент помніка, пра які зараз нагадвае вылеплены і захаваны скульптарам партрэт Сталіна. Ледзь пазнаю нязвыклае — у белым гіпсе — аблічча Таго-ра (з маленства лёгка запомніліся, бо здаваліся сугучнымі, «імя» прыгожай статуі і прозвішча яе аўтара).

Майстра, як нераўнадушны гід, кіруе маёй глядацкай увагай.

Такім ён уяўляў сабе Маркса, які «пригвоздил» капіталізм, закончыўшы трэці том «Капіталу». Вялікі чалавек нібы крочыць да цябе, паглядае зверху; адчуваеш вастрыню зрэнкаў пад густымі бровамі, позірк, які, здаецца, бачыць адусюль і працінае наскрозь... А вось рамантычны рыцар рэвалюцыі Дзяржынскі з хлапчанём на руках... Летуценны і дзёрзкі паўстанец Каліноўскі; легендарны беларускі казак Гаркуша. Стваральнік надзіва свежай і актуальнай для нашага часу «Песні пра зубра» Гусоўскі. Мудры пясняр і жыццялюб Яхуда Галеві. Неразгаданы смуглатвары Пушкін... Яго вялікасць Артыст Уладзімір Крыловіч. Пявучая постаць Александроўскай. Нібы неадлучны ад скрыпкі, поўнае музыкай, Амітон... Уладар таямніц чалавечага мозгу, інтэлекту нейрахірург Я. Злотнік... «Вселенский» одум, боль і тонкая чалавечнасць Алеся Адамовіча... Эцюды да скульптурнай кампазіцыі на плошчы Якуба Коласа, сам помнік у мініяцюры (так і просіцца літота: «помнік на далоні»!).

Партрэты герояў Вялікай Айчыннай. Абліччы беларускіх паэтаў — «кананічныя» і нехрэстаматыйныя, вылепленыя сяброўскаю рукою. Асабліва дарагія майстру землякі з Віцебшчыны: Даватар, Бацька Мінай, Машэраў, Броўка, Барадулін, Вялюгін...

Экскурс у творчасць З. Азгура (ці экскурсія ў майстэрню) ча. Калектыў штогод радуе слухачоў сустрэчамі з новай музыкай, якая ствараецца беларускімі кампазітарамі спецыяльна для яго. Бадай, не будзе перабольшаннем, калі мы скажам, што далёка не кожны нацыянальны аркестр народных інструментаў у нашай краіне мае такі разнастайны па вобразным змесце і каштоўны па сваіх мастацкіх вартасцях арыгінальны рэпертуар. Беларуская народна-аркестравая музыка заўсёды вабіла і вабіць сёння тэматычнай шматграннасцю і глыбінёй.

МУЗЫКА

ПРА ШТО РАСКАЖАШ, НАРОДНЫ АРКЕСТР?

РОЗДУМ НАПЯРЭДАДНІ НОВАГА КАНЦЭРТНАГА СЕЗОНА

Аматары народна-аркестравага жанру з неаслабнай цікавасцю чакаюць выступленняў Дзяржаўнага народнага аркестра БССР імя І. Жыновіча. Калектыў штогод радуе слухачоў сустрэчамі з новай музыкай, якая ствараецца беларускімі кампазітарамі спецыяльна для яго. Бадай, не будзе перабольшаннем, калі мы скажам, што далёка не кожны нацыянальны аркестр народных інструментаў у нашай краіне мае такі разнастайны па вобразным змесце і каштоўны па сваіх мастацкіх вартасцях арыгінальны рэпертуар. Беларуская народна-аркестравая музыка заўсёды вабіла і вабіць сёння тэматычнай шматграннасцю і глыбінёй.

Ад новага, сёлетняга канцэртнага сезона мы чакаем і новых прэм'ер жыновічаўцаў. Мы, зразумела, прызвычаіліся да такіх прэм'ер. А вось аўтары нататак, надрукаваных у пачатку 20-ых гадоў пасля з'яўлення беларускіх народных інструментаў на прафесійнай сцэне, наўрад ці дапускалі, што інструменты гэтыя ў хуткім часе зоймуць адно з пачэсных месцаў у беларускай савецкай музычнай культуры. Відаць, і М. Аладаў, які першы з беларускіх кампазітараў увёў беларускія інструменты ў ранг «прафесійных» (у 1931 годзе ён стварыў «Ронда» для Дзяржаўнага ансамбля народных інструментаў БССР), не падазраваў, што адкрывае новую старонку беларускай інструментальнай музыкі.

Так, у нашы дні «прафесійнае амплуа» народных інструментаў прызнана бясспрэчна. Для Дзяржаўнага народнага аркестра БССР напісана ўжо каля двухсот твораў самых розных жанраў: апрацоўкі, мініяцюры, сюіты, музычныя карціны, паэмы, уверцюры. Нават сімфонія! Напэўна, быў бы цікавым і паказальным «гістарычны» канцэрт, дзе б беларуская народна-аркестравая музыка была прадстаўлена ад першых твораў Д. Захара,

зойме не адну гадзіну. Пра гэта могуць здагадацца чытачы дзвюх першых ягоных кніг з аўтабіяграфічнага цыкла-роздуму «Тое, што помніцца...». А ў кнігах жа — і паловы няма пра тое, што пабачыш, пра што падумаеш пад дахам майстэрні. Майстэрня, бадай, найпершая, найбольш поўная і мудрая кніга. Сцены яе, стэлажы яе — як скрыжалі, на якіх асязальна пругкай і ўпартаю мовай свайго матэрыялу выказвае скульптар разуменне жыцця, часу, чалавека ў ім — усё, што помніцца, пра што думаецца.

Нібы прадчувае З. Азгур магчымае пытанне (а, верагодней, такое пытанне яму ўжо неаднаразова задавалі) пра яўную тэндэнцыю ва ўсёй яго больш чым паўвекавой прафесійнай працы. Уяўным і рэальным апанентам, а яны заўсёды ёсць і будуць сярод неспецыялістаў і сярод калег, Заір Ісакавіч тлумачыць уласную пазіцыю такім чынам. Скульптура ў лепшых сваіх узорах спрадвеку адлюстроўвала, ці нават апявала пераважна станоўчае, прыгожае, значнае ў чалавеку і ў ягоных справах. Услаўляла розум, сілу, хараство. Сам ён, як мастак-рэаліст, імкнецца не прыхарошваць герояў, а выяўляць іх маральныя, духоўныя, інтэлектуальныя вартасці, прыкмячаць і раскрываць у партрэце абаяльнасць канкрэтнай асобы. Вось чаму носьбіты цемрашальства, усялякіх антыгуманных ці проста сумніцельных ідэй застаюцца за парогам ягонай майстэрні.

«Майстэрня — не музей, а ўсё ж такі гісторыя тут жыве», — гэтыя словы скульптара датычыліся зместу ягоных работ... А ці не аднесці іх і да больш абстрактнага паняцця — духу майстэрні?

Новы дзяржаўны будынак, які недасведчанаму прахожаму падаецца жылым асабняком,— красамоўная і важкая грамадская ацэнка дзейнасці народнага мастака СССР, Героя Сацыялістычнай Працы, дэпутата Вярхоўнага Савета БССР, акадэміка Заіра Азгура. У гэтым творчым доме — выдатныя ўмовы для таго, каб падумаць, папрацаваць, абмяняцца вопытам з калегамі і вучнямі, адпачыць. На першым паверсе— фармовачная, куды ўжо завезены гіпс; на другім — асобны пакой для бібліятэкі. Вышэй мае быць абсталявана ўтульная гасціная, пакуль жа тут— два яркія жывапісныя палотны ў багетах. Два партрэты: чорнавалосы, кучаравы, барадаты, сінявокі мужчына з дужымі працавітымі рукамі і жанчына — высакародная абліччам, з тужлівымі і добрымі мацярынскімі вачамі. Гэта — бацькі скульптара.

Партрэты напісаны зусім нядаўна мастаком Ю. Гарэлавым.

Але з імі, здаецца, увайшоў у новую майстэрню і дух «першых універсітэтаў» З. Азгура. Першыя фігуркі, вылепленыя з гліны на вясковай вуліцы; дзядзькава кузня; асновы ганчарнага рамяства. Даваенныя Віцебск і Мінск... А найбольш даўнія работы (самых даўніх няма — у час вайны іх знішчылі гітлераўцы): хіба не захавалі яны дух пасляваеннай майстэрні Азгура? Той самай, за якую хадайнічаў няўрымслівы Якуб Колас: каб правялі тэлефон, паравое ацяпленне, зрабілі водаправод...

Пераезд заўжды — клопаты і мітусня, не без болю пакідаеш абжыты табою ў працы кут, у якім нібыта застаецца часцінка цябе. Пераезд — «пагранічны стан»: месяц-другі спатрэбіцца на своеасаблівую творчую акліматызацыю... А потым?

— Потым,—усміхаецца скульптар, — я буду прадаўжаць працаваць. Найперш паклічу сюды сваіх сяброў і — буду ляпіць. Так, работу на новым месцы пачну з партрэтаў сяброў. Гэта ж асаблівая асалода: ты лепіш, і лепіш сваіх сяброў, і вольны выяўляць праз іх скульптурныя абліччы свае думкі пра добра вядомых табе людзей, свае назіранні, пэўныя фантазіі — бо цябе як мастака не абмяжоўваюць умовы заказчыка...

У сценах новага дома ўжо складваюцца заключныя старонкі трэцяй кнігі З. Азгура «Тое, што помніцца...».

Зразумела, пераступяць гэты парог і творчыя спадчыннікі, вучні акадэмічнай майстэрні скульптара... І, канечне, надаракца гадзіны, калі ён будзе заставацца сам-насам з маўклівымі жыхарамі мастакоўскіх пенатаў, мысленна гутарыць і спрачацца з імі. Прыдзірлівым і праніклівым вокам творцы аглядаць сляды (так ён кажа) сваёй працы. Колькі іх, гэтых «слядоў»? Тысяча васемнаццаць назваў скульптурных работ занатавана, па словах Заіра Ісакавіча, у яго спецыяльным сшытачку. Не ўсё, па прычынах розных, захавалася: нават ад сёлетняга пераезду пацярпела некалькі гіпсавых партрэтаў. «Час грунтоўна і крытычна праэкзаменуе мною зробленае, — не без лёгкай самаіроніі заўважае мастак. — Дазваляю сабе суцяшальную думку, што паасобныя з маіх слядоў усё ж застануцца. «Ленін з дзяўчынкай»... Дзевяціметровая фігура Уладзіміра Ільіча над Каспіем у горадзе Гур'еве. Гранітны Рабіндранат Тагор... Лу Сінь, мармуровы бюст якога ацалеў у Кітаі, нягледзячы на парадаксальныя катаклізмы «культурнай рэвалюцыі»... Помнік Якубу Коласу на плошчы ў Мінску...».

Ён аднойчы назваў сябе скульптарам, які прысвяціў амаль палову жыцця тэме «Ленін». І, дарэчы, у светлым рабочым пакоі новай майстэрні ёсць сённяшняе пацвярджэнне такому азначэнню: макет гарадской плошчы з помнікам Ільічу. Гэта — будучая плошча і будучы помнік, праект, прызначаны для Гродна. Скульптар ужо амаль завяршыў работу над новым ленінскім манументам...

Чалавек, калі ён мастак па натуры (неабавязкова па прафесіі), стварае сваю ўяўную планету. Скульптар Азгур, творца сваёй планеты, насяліў яе людзьмі рознымі, але — не ўсялякімі: большасць з іх называе ён сваімі сябрамі. Планета сяброў... Па-мастакоўску непасрэдны і таварыскі, але з людзей, калі можна так сказаць, пераборлівых у дружбе, ён адкрывае свой дом, сваю майстэрню, сваю планету і для новых цікавых гасцей. А неўзабаве, мабыць, скажа ці напіша пра іх, як пісаў ужо аднойчы: «Дарагія мне гэтыя людзі і асабіста. Яны пазіравалі ў майстэрні, і, значыць, мой творчы шлях проста немагчымы без іх. Са мною ў час сеансаў яны гутарылі на разнастайныя тэмы і дзяліліся ўласнымі сумненнямі і радасцямі. Я ўбіраў у сябе ўсё, што магло дапамагчы мне як скульптару, развіваючы мой разумовы далягляд і прымушаючы шырэй глядзець на свет, на прыроду, на гісторыю».

С. БЕРАСЦЕНЬ.

А. Туранкова, М. Чуркіна да опусаў апошніх гадоў. На жаль, большасць партытур 30—40-ых гадоў загінула, і мы не маем магчымасці прасачыць, якімі шляхамі ішлі беларускія кампазітары да сённяшніх дасягненняў у галіне народна-аркестравага жанру.

Сёння ў рэпертуары для народнага аркестра багата твораў жанрава-бытавой тэматыкі. Тут і каларытныя замалёўкі (С. Палонскі, музычная карцінка «На кірмашы»; Ю. Семяняка, сюіта «Родныя песні»; А. Залётнеў, паэма «Купальская ноч»; В. Помазаў, сюіта «Батлейка» і г. д.), і вобразнае ўвасабленне матываў жыцця сучаснай беларускай вёскі (калгасныя сюіты П. Падкавырава і А. Багатырова; сюіта У. Алоўнікава «На Палессі»; уверцюра В. Войціка «Слава ўраджаю»; уверцюра-карціна К. Цесакова «Беларускія вячоркі»). Шырока прадстаўлена музыка народнага свята (уверцюры Я. Глебава, Д. Смольскага, паэмы В. Іванова, А. Мдзівані). Прыкметнае месца займаюць творы, у тым ліку і мініяцюры, лірычнага характару (І. Жыновіч, Ю. Семяняка, Д. Смольскі, В. Іваноў), буйныя лірыка-эпічныя палотны (В. Іваноў, фрэска-карціна «Зямля бацькоў»; А. Мдзівані, сімфонія «Памяць зямлі»). Ёсць у праграмах і творы гераікапатрыятычнага зместу (К. Цесакоў, «Мінская сюіта»; М. Трахтэнберг, гераічная балада «Брэсцкая крэпасць»). Хоць драматызм не сказаць каб быў характэрны для народна-аркестравай музыкі Беларусі, але ёсць творы і такога плана (К. Цесакоў, «Драма-сюіта»; Д. Смольскі, Другі канцэрт для цымбалаў з аркестрам «Памяці І. Жыновіча», музычна-драматычная паэма В. Іванова «Сымон-музыка»). Арганічны ў музыцы для аркестра беларускіх інструментаў і гумар з хітрынкай (А. Мдзівані, «Частушка»; В. Помазаў, сюіта-жарт «Вясковыя музыкі»; У. Кандрусевіч, «Варыяцыі на народны матыў»). Звяртаюцца кампазітары, якія пішуць для жыновічаўцаў, і да маладзёжнай тэматыкі... Словам, у цэнтры іх творчай увагі — гісторыя роднага краю, падзеі нашых дзён, духоўны свет сучасніка.

А нядаўнія прэм'еры? У юбілейны год Вялікай Перамогі з'явілася фрэска Д. Смольскага «Партызанская мадонна» — твор, падобнага да якога па глыбіні раскрыцця вобраза і драматычнай напоўненасці ўжо даўно не было ў музыцы для беларускага аркестра. У праграмах аркестра з'явілася таксама музычная карціна В. Іванова «Салдацкае поле» — натхнёнае лірычнае выказванне, прысвечанае светлай памяці загінуўшых заступнікаў беларускай зямлі.

Новыя з'явы і вобразы рэчаіснасці атрымліваюць адлюстраванне ў музыцы для нацыянальнага аркестра. Дасягненні кампазітараў рэспублікі ў гэтай галіне зноў і зноў даводзяць, што мастацкія магчымасці народных інструментаў яшчэ далёка не вычарпаны.

Мы ведаем, што ў прафесійным музычным мастацтве лёс інструмента — у руках кампазітара, які кожны раз нанова ацэньвае патэнцыяльныя магчымасці таго ці іншага інструмента, можа выявіць яшчэ не знаёмыя яго ўласцівасці і вартасці. Пошук свежых інструментальных фарбаў неад'емны не толькі ад кампазітарскага таленту, але і вядомай творчай рызыкі. Нездарма сапраўднае адкрыццё чакае толькі таго мастака, які адважна пераступае праз сталыя каноны і змяняе звыклыя ўяўленні аб «прызначэнні» пэўнага музычнага інструмента. Працэс мастацкага пераасэнсавання вымагае ад творцы не толькі ўмення пераадолець інерцыю ўласнага мыслення, але потым — гэта ці не найцяжэйшае — зламаць стэрэатып грамадскага ўспрымання. У беларускіх кампазітараў, думаецца, хапае і таленту, і належнай смеласці. Нездарма ж усяго паўвека спатрэбілася ім, каб паставіць нацыянальныя інструменты побач з тымі, якія ўжо не адну сотню гадоў служаць прафесійнаму музычнаму мастацтву. Але падкрэслю: кампазітары Беларусі ніколі не забываюць пра тое, якія вытокі ў назвы «народныя інструменты». Яны ж, гэтыя інструменты, спрадвеку пяюць пра жыццё народа на матчынай зямлі. І якім бы «рэвалюцыйным» ні здаваўся нам падыход таго альбо іншага аўтара да народна-інструментальнага жанру, ёсць у слухачоў упэўненасць: у самым сутнасным — змесце — кампазітар захавае вернасць асноўнаму прынцыпу жанру, прынцыпу народнасці.

І напярэдадні новага канцэртнага сезона жыновічаўцаў мы чакаем новых шчаслівых мінут, якія падораць радасць азарэння хараством жыцця і мастацтва.

Наталля ЯКАНЮК.

ДРЭВА БУДУЧЫНІ

Турсын Журтбаеў

«И во сне плачет ребёнок».
Ю. КАЗАКОЎ.

Сонечнае святло льецца ў пакой ласкавымі праменямі і сцірае душэўныя цені.

Цераз акно бачна блакітнае неба. Пад ім — бярозы ў маленькім ляску. Яны разварушваюцца, быццам у танцы. Лугавыя травы, узрываючыся тысячамі чырвоных, сініх, жоўтых і белых кветак, таксама вядуць свой павольны карагод пад цёплым вясеннім ветрыкам. Гэты калейдаскоп выхоплівае мяне са звыклага свету... І насустрач нясецца, распуджваючы сонных матылькоў, карапуз у расхрыстанай белай кашульцы. Я раскідваю рукі, імкнуся наперад і спыняюся... У ложку мірна пасапвае мой пяцігадовы сын. Коўдра скінута. Варушыць вуснамі, усміхаецца. Мусіць, сняцца яму любімыя цацкі. Папраўляю коўдру, на дыбачках адыходжу. Ён фыркае. Азіраюся, бачу: смяецца з заплюшчанымі вачыма, бліскаючы зубкамі. Я і не ведаў, што дзеці могуць так адкрыта смяяцца ў сне. Мне хочацца пацалаваць яго, але шкода парушаць салодкі сон. Спі. Хай твая бескарыслівая душа радуецца снам. Жыві, весяліся і не ведай смутку нават у сне. Мы — я і мае бацькі — прайшлі ўсе пакуты жыцця. Думаю, старыя забралі з сабою брыдоту і зло, якія мог бы напаткаць ты. Спі. Мне падабаецца тваё бесклапотнае жыццё. У мяне было інакш. Ніхто не ахоўваў мой сон. Ніхто мяне не песціў. Мае бацькі былі дужа занятымі людзьмі. У іх проста не хапала на пяшчоту часу. Маё дзяцінства — у падранай кашулі. Такое нашае дзяцінства. Вы — павінны даспаць нашыя сны, даесці наш няз'едзены хлеб, дагуляць нашыя гульні...

Прабач, калі іншы раз я скупы на пяшчоту. Ты павінен вясёлым смехам збавіць нашыя слёзы.

Ты чароўны і мова твая чароўная. Неба тваё бязвоблачнае. Ты не стамляешся жыць у шчаслівым свеце.

Ты не падобен да нас. Табе і не сасніць ніколі запрэжанага ў саху быка, лапленае-пералапленае адзенне, валёнкі, прыгаршчы гарэлай пшаніцы, ладэчу ў класе, хоць ваўкоў ганяй.

Мы казалі: «збіралі каласкі», «нарыхтоўвалі курай», «каму ёсць пісьмо?», «жывы?».

А вы гаворыце зусім іншыя словы. Спі, сынку, спі.

Дзіцё — гэта кветка, якая працяла сэрца. Уся пяшчота звернута на яго. Усе мары і летуценні, перамогі і крушэнні надзей цераз яго ідуць у заўтра. Яно — не толькі працяг роду. Магутны дуб будучыні.

Мяне супакойвае тое, што вобразы нашага дзяцінства не падобны. У цябе зусім іншыя памкненні. Я цешуся табою і перапакутваю выкрутасы свайго дзяцінства. Я пачынаю ўспамінаць тое далёкае, забытае... І па зялёным прамені да мяне нясецца карапуз у рванай белай кашульцы і лапленых штанах. Я марыў тады пра многае. Марыў, як узыду на блакітную дзіўную гару...

Уяўляў, як вернецца мой бацька. Марыў займець новыя чаравікі. Ты нічога падобнага не ведаеш. Калі б ты стаў з тым падранкам побач, той бы згарэў ад сораму.

Ён можа падацца табе не па-дзіцячы жвавым. Так, ён ужо ведаў людзей. Іншы раз я ў думках наладжваю вам сустрэчу. Вы падобныя знешне і некаторымі рысамі характару. Той кірпаты хлапчук набліжаецца да цябе з апаскай, акідвае цябе позіркам, разглядае адзенне. Ты цягнеш да яго рукі. Падружыліся.

— Якія ў цябе цацкі? — пытаешся. — Давай гуляць.

Ён бянтэжыцца, затым, затуліўшы складкамі дзірку на кашулі, адказвае:

— У мяне нічога няма, апроч мяча з анучы...

— Анучы? Нават машыны няма?

— Не, — пачынае чарціць вакол сябе нагамі пясок, схаваўшы вочы.

Ты бяжыш і прыносіш свае цацкі. Ён, як бы баючыся зламаць іх, асцярожна, далікатна лашчыць адну.

— Пойдзем есці марожанае, — прапаноўваеш ты.

Ён адмоўна хітае галавой, хоць не ведае, што гэта такое. Ведае адзін прысмак — айран, сухаватае пшанічнае талакно.

Ты нясешся на веласіпедзе, а ён бяжыць за табою. Нічым не можа пахваліцца гэты кірпаносы хлопчык. Ён не ведае не толькі, што такое марожанае, але і што такое мультфільм. Яго заапаркам і гушкалкамі, арэлямі было закінутае зімоўе...

Я з табою, сын мой, успамінаю сваё дзяцінства. Між намі існуе нябачная воку сувязь.

...Ты сапеш носам, спіш, хоць пара прачынацца. Углядаюся ў цябе. Зараз ты павіснеш у мяне на шыі. Учора, прачнуўшыся, ты сказаў:

— Вароны не далі мне спаць. — Дакладна і не ведаеш, у сне ці наяве ты бачыў гэтых варон.

Як я хачу, каб твая душа ніколі нічым не была азмрочана! Хачу, каб твой корань, не паранены, глыбока пранік у зямлю і ты вырас магутным дубам.

У акно зазірае блакітнае, бязвоблачнае неба, бярозавы пералесачак. Расчыняю акно. Дзьме ветрык.

Ты прачнуўся.

●

Чалавечак, у якога свае думкі і мары, свой сусвет, такі дарагі мне чалавечак, бяжыць паперадзе да бярозавага пералеску. Зрывае дзьмухаўцы. Вось нахіліўся над мурашнікам, замірае. Зноў нясецца, спатыкаецца. Калі ж ён слухае, здзіўлены, жаўрука, то робіцца падобным на казуляня. Зусім забыўся пра мяне. Акунуўся з галавою ў чыстае паветра, дыхае лёгка. І гэта ўсё — яго свет, яго ўладанні...

Мяне зноўку нешта вядзе ў забытае дзяцінства...

Усё той жа карапуз у белай кашулі. Было такое ж вясёлкавае лета. Касцы ў лугах. І высокая трава, палеглая, як ад бурану. Жывое зялёнае мора ператварылася ў пустэльню.

Я пайшоў адтуль. І натык-

СУСТРЭЧА Ў ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ

У шуфлядзе майго пісьмовага стала захоўваецца адзін асабліва дарагі аанаўскі сувенір — круглы, зялёна-жоўты значок з чорнымі надпісамі: «Свабоду палітычным зняволеным Паўднёвай Афрыкі» (зверху, на зялёнай палавіне), «Свабоду Нэльсану Мандэле» (у цэнтры, буйнымі літарамі), «Афрыканскі нацыянальны кангрэс» (знізу, на жоўтай палавіне). З'яўленне гэтага значка ў мяне звязана з наступнай падзеяй...

Адной з несумненных заслуг ААН, тым крокам, які сведчыць пра яе дзеяздольнасць і рэалізм, з'яўляецца прызнанне ёю законнасці барацьбы карэнных паўднёваафрыканцаў супраць каланіяльнага прыгнёту і апартэіду, за стварэнне нярасавага і дэмакратычнага грамадства. Гэтае прызнанне знаходзіць увасабленне ў адпаведных рашэннях і акцыях, у тым факце, што стала традыцыяй запрашаць для выступлення на Генеральныя Асамблеі лідэраў нацыянальна-вызваленчых рухаў на поўдні Афрыкі і, у прыватнасці, у актах салідарнасці з ахвярамі расізму і палітычнымі зняволенымі ПАР.

11 кастрычніка было абвешчана ААН Днём салідарнасці з ахвярамі расісцкай сістэмы і палітзняволенымі Паўднёвай Афрыкі. У сувязі з гэтым адбылося некалькі пасяджэнняў Спецыяльнага камітэта супраць апартэіду, у якіх прынялі ўдзел дэлегаты Асамблеі, прадстаўнікі раду паўднёваафрыканскіх вызваленчых рухаў і многіх няўрадавых арганізацый свету, якія не прымаюць расавую дыскрымінацыю і падтрымліваюць так ці інакш змагароў супраць яе (Міжнароднага фонду абароны і дапамогі, Сусветнага Савета Міру, Нацыянальнага антыімперыялістычнага руху ЗША, Камітэта юрыстаў за грамадзянскія правы ў адпаведнасці з законам, Сусветнай канферэнцыі па праблемах рэлігіі і міру і г. д.).

Склад удзельнікаў маніфестацыі быў, як бачым, надзвычай стракаты. Але ўсе аднадушна сыходзіліся на тым, што яўна ўстарэлы, анахранічны рэжым апартэіду — зло, з якім нельга мірыцца; усе выказвалі ў той ці іншай форме салідарнасць з барацьбітамі. З трыбуны ААН вымаўляліся імёны і цытаваліся словы зацкаванага некалькі год назад расісцкімі ўладамі Альберта Лутулі і кінутых за краты Нельсана Мандэлы і Дароці Н'ембе, выказвалася абурэнне ў сувязі з нядаўняй гібеллю ў расісцкім засценку афрыканскага лідэра, кіраўніка руху «Свядомасць чорных» Стывена Біка. З пранікнёным словам звярталася да «братоў і сясцёр, якія знаходзяцца ў турмах, нясуць цяжар пакут» удава Марціна Лютэра Кінга Карэта Кінг. На пасяджэнні выступіў таксама лонданскі канонік Джон Колінз, які шмат гадоў падтрымлівае маральна і матэрыяльна працу камітэта супраць апартэіду. Хоць ён як духоўная асоба і не падзяляў метады ўзброенай барацьбы («Нянавісць, — гаварыў ён, — народзіць большую нянавісць, кроў пралье яшчэ большую кроў»), але тым не менш рашуча далучыўся да пратэсту супраць расавай дыскрымінацыі, кінуў словы папроку на адрас тых, хто «на словах выступае супраць апартэіду, але ўстрымліваецца ад канкрэтных палітычных і эканамічных мер супраць яго». «Мяне называюць тварцом дабра, — гаварыў канонік, — але гэта лепш, чым дабра жадаць, а не тварыць яго».

У ліку паўднёваафрыканцаў, якія прысутнічалі на пасяджэннях, былі і нядаўнія палітзняволеныя ПАР. Першым выступіў былы вязень сумна вядомай расісцкай турмы на Робен-айлендзе — скалістым «востраве смерці» недалёка ад Кейптаўна. «Дванаццаць гадоў зняволення, —гаварыў ён, — вопыт нялёгкі, але па-свойму павучальны і каштоўны. Калі да гэтага ў цябе яшчэ былі нейкія ілюзіі адносна расісцкай белай меншасці, то на Робен ты пазбавішся ад іх канчаткова і на ўсё тваё астатняе жыццё. Уявіце сабе, што нават у турме існуе дыскрымінацыя: аднаму даюць на сняданне лыжку цукру, другому — паўлыжкі, аднаго выпус-

«МЫ, НАРОДЫ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ...»

Анатоль ВЯРЦІНСКІ

25 красавіка незабыўнага сорак пятага года, у той самы дзень, калі гераічныя савецкія войскі займалі пазіцыі для рашаючага штурму Берліна, а за 100 кіламетраў ад яго, на Эльбе, адбывалася хвалюючая сустрэча нашых воінаў з амерыканскімі салдатамі, у Сан-Францыска адкрылася міжнародная канферэнцыя, скліканая для стварэння Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

26 чэрвеня (таго ж памятнага сорак пятага), 40 год назад, на Сан-францыскай канферэнцыі быў здзейснены яшчэ адзін важны акт на шляху стварэння калектыўнага органа міру і бяспекі — быў падпісаны Статут ААН, галоўны міжнародны прававы дакумент нашага часу. (У ліку 51 дзяржавы, якія паставілі подпісы пад Статутам, была і Беларуская ССР).

Такім чынам, чарговая сесія Генеральнай Асамблеі ААН, якая мае адкрыцца 17 верасня гэтага года, будзе саракавой па ліку, юбілейнай. Менавіта ў сувязі з гэтым сёлетні год быў абвешчаны міжнародным супольніцтвам нацый, Годам ААН, а наступны — Міжнародным годам міру.

ААН... Гэтае паняцце неаддзельнае сёння ад барацьбы за мір, мірнае суіснаванне і раззбраенне, за прадухіленне ядзернай катастрофы. «Вось ужо амаль сорак год, — гаварыў на XXXIX сесіі Генеральнай Асамблеі ААН А. А. Грамыка, — у палітычным лексіконе трывала займаюць месца словы — «Арганізацыя Аб'яднаных Нацый». Практычна няма ніводнай буйной міжнароднай праблемы, у сувязі з якой іх не вымаўлялі б на розных мовах і ў гэтых сценах, і за іх межамі. Шырокая прыналежнасць ААН да спраў і падзей у свеце абумоўлена самім прызначэннем гэтага форуму. А створаны ён быў для таго, каб аб'яднаць палітычную волю і магчымасці дзяржаў з мэтай падтрымання міжнароднага міру і бяспекі».

Арганізацыя Аб'яднаных Нацый, самы прадстаўнічы міжнародны форум, яшчэ, на жаль, не ў стане быць гарантам міру ў літаральным сэнсе слова. На жаль, яшчэ назіраецца сумны парадокс: паралельна з горамі рэзалюцый, якія прымаюцца ААН, растуць і горы ўзбраенняў. У сусветнага супольніцтва нацый ёсць праблемы і цяжкасці ў сэнсе ажыццяўлення сваіх задач, здзяйснення патрабаванняў Статута ААН. Ёсць у ААН і ворагі. Прыгадаем хоць бы тую пазіцыю—дыктату і шантажу,— якую заняла ў дачыненні да ААН адміністрацыя Рэйгана (яна, напрыклад, па-свойму «адсвяткавала» 40-годдзе з дня падпісання Статута: дзяржсакратар ЗША Дж. Шульц у прамове, з якой ён выступіў на ўрачыстай цырымоніі ў Сан-Францыска, накінуўся на ААН з грубымі, абразлівымі выпадамі).

Але паспяхова выконваючы сваю высакародную міратворчую місію, ААН робіцца з кожным годам усё больш універсальным і ўплывовым інструментам міру і бяспекі. Калі перафразіраваць вядомыя словы Дастаеўскага, што ў дзень «страшнага суда» чалавецтва зможа прадставіць у сваё апраўданне раман «Дон Кіхот», то можна дадаць: і не менш важкі аргумент—прасякнутыя добрай воляй, пачуццём калектыўнай адказнасці за лёс міру і прагрэсу, рэзалюцыі, дэкларацыі і хартыі ААН...

Пра гэта думалася, калі працаваў над сваімі нататкамі, якія назваў «Мы, народы аб'яднаных нацый...» Некалькі раздзелаў прапаную ўвазе чытачоў штотыднёвіка.

АУТАР.

нуўся ў лясочку на некранутую паляну. Тысячы і тысячы травінак, зялёнае племя павольна калыхалася ад ветрыку, размаўляла між сабою. Я не хацеў, каб гэтую дзіўную палянку знайшлі касцы.

Дражніць пах саўмалдырыка — конскага шчаўя. Крычу ад радасці. Зрываю прыгаршчы нейкіх вясёлых кветак і кідаю ў паветра. Пялёсткі ападаюць рознакаляровымі матылькамі.

На пялёстках цюльпана спіць вялізны матылёк, падобны на белы банцік. Я, шчаслівы і п'яны ад дурманлівых пахаў, валюся на траву. Белая кашуля робіцца рознакаляровай. Чую, што падрапаў плячо.

Паварочваю галаву, каб зірнуць на ранку. Ёкае сэрца. Ляжыць з леташняга капешка сена. Касцы ведаюць... З пахілай галавой, засмучаны, пакідаю паляну. Азіраюся. Здрасаваныя, пакамечаныя травы і кветкі. Стала балюча за сваю жорсткасць.

Болей я не хадзіў на гэтую паляну.

І вось зноў яна.

І другі карапуз у белай кашульцы тут. Ён таксама пашкадуе аб сваёй жорсткасці. Але я не хачу стрымліваць яго, не хачу ўмешвацца ў ягоны свет, яго ўладанні. Гэты падшыванец яшчэ не надыхаўся пахамі траў, як калісьці я. І не трэба яго супыняць. Ён і так не адважваецца насіцца за матылькамі, не качаецца па траве. Хай пабудзе на адзіноце. Хай пачуе пах зямлі. У горадзе, нават на дачах, няма нічога такога. І рыбкі ў акварыумах абрыдлі яму. Я прывёў яго сюды, каб ён зразумеў, у чым прыгажосць роднай зямлі. І нябачныя нітачкі, якія злучаюць нашыя сэрцы, зробяцца мацнейшыя.

Паляна з тых далёкіх часоў змянілася. Расце высокая канюшына, а цюльпаны чамусьці зніклі. Паляна зарасла адуванчыкамі, падарожнікам. Хвойкі наўкола сталі магутнымі дрэвамі.

Усё змянілася. Краскі майго дзяцінства пажухлі. І ўсё ж для мяне гэты куточак цяпер запомніцца і маім Жасуланам. Мая памяць дзяцінства, набыўшы новыя колеры, перакінецца ў будучыню.

Упэўнены, што гэты куточак назаўсёды застанецца ў сэрцы.

Я сеў на паваленае дрэва і, шчаслівы, глядзеў на Жасулана. Горкі тытунёвы дым адрываўся ад маіх вуснаў, звіваўся колцамі і раствараўся ў паветры.

Жасулан пабег да мяне. Спатыкнуўся і расцягнуўся каля ўзбочыны. Ён быў запэцканы чырвоным, жоўтым, белым пылком. Вочы радасна ззялі. Прыціснуўся да мяне. Я адчуў рэзкі пах палыну. Усё-ткі «цяплічны» хлопчык насыціўся пахам роднай зямлі!

Мы сядзелі, зачараваныя палянкай. Яна была падобна на маленькае празрыстае азерца сярод лесу.

Раптам блакітнае неба перакрэсліў рэактыўны самалёт. Жасулан упіўся ў яго вачыма, потым схаваўся пад маёю рукой і прашаптаў:

— Зараз неба зваліцца...

Я моўчкі пакпіў з яго, але заўважыў у вачанятах страх і прыціснуў да сябе. Ён думае, што зямля накрыта небам, як таляркай, ці неба — празрыстае акно. Таму яно павінна рассыпацца і зваліцца на зямлю.

І тут я ўспомніў пра самалёт, які разламаў неба над Хірасімай. Неба звалілася тады...

Схіляю галаў перад веліччу Прыроды. Што б гэта было, калі б неба сапраўды было са шкла? Дастаткова адзін раз зламаць і не памогуць ніякія латкі...

Жасулан паглядзеў на неба. Калі след стаў расплывацца, знікаць, ён закрычаў:

— Цяпер яно не зваліцца! Трэшчына знікае! — скочыў з дрэва, стаў весяліцца.

Дзіцячая свядомасць непасрэдная. Дзіцё жыве парывамі: пужаецца і тут жа забываецца пра страх, заплача і зноў засмяецца. Яно не ведае іншага, таемнага сэнсу выпадкова сказаных слоў. Аднойчы зімой ён паслізнуўся і паваліўся. Як цяпер помню ягоныя словы: «Тата, я здужаў снег!» Ну а тое, што неба можа зваліцца на зямлю, ужо не страшна. Я ведаю, ён будзе змагацца з тымі, хто захоча зламаць неба.

Іду па сцяжыне. Лес не такі, як быў раней: парадзеў. Прамені нагрэлі зямлю. Курыцца белаватая пара. Заліваюцца птушкі. Зазіраючы ў старыя гнёзды, шлёпаючы далонькамі па вільготных стаўбурах бяроз следам пляцецца Жасулан.

Выйшлі з лесу, патупалі ўздоўж ракі. Яна вілася між высокіх берагоў, як заняволеная. Нечакана я пашкадаваў, што прывёў сюды Жасулана.

Гэта боль майго сэрца. Дзіцё можа многае не помніць ці не надаваць увагі. А я ніколі не забудуся на тыя звялыя кветкі. Я не выпадкова выбраў для адпачынку гэтае закінутае зімоўе.

Рака нарэшце вырываецца з учэпістых берагоў, утварае блакітнае возера. Птушкі з шумам і галасам узняліся, як толькі пачулі нашае набліжэнне. Жасулан вачыма праводзіў іх. Чародка перасекла дымны след і паляцела далей.

— Тата, птушкі вылецелі з акна неба, — усклікнуў Жасулан.

Я змоўчаў. Ён тузануў мяне за рукаў: «Так ці не...»

Я ведаў, даволі мне толькі адкрыць адну праўду і казка, якую ён прыдумляў цэлы дзень, разляціцца ўшчэнт. Потым нічым не суцешыш ягоную душу. Ён перастане верыць.

Я не хацеў, каб ён перастаў прыдумляць. Можа, ён ужо злётаў з птушкамі на той бок неба. Пройдзе час і ён зразумее свой спадман. Мая ж праўда — разнясе ягоныя мроі. А гэта — злачынства. І я сказаў:

— Так, птушкі паляцелі на той бок неба.

Помню, калі ён навучыўся гаварыць, то прыбег аднойчы з вуліцы і запытаў:

— Дзе мой дзед? У кожнага ёсць дзядуля!

Я тады не адважыўся глянуць яму ў вочы, прамармытаў, адвярнуўшыся: «Далёка, у ауле». Ён запляскаў ад радасці. Потым бачыў, як ён ажыўлена расказваў нешта аднагодкам.

Так Жасулан пазнаёміўся з дзедам, якога не было. Колькі легенд нарадзілася пасля пра дзеда! Калі трохі падрос, то пачаў прасіцца: «Адвязі, — казаў, — дзядуля будзе расказваць казкі. Ён будзе мяне любіць».

І вось я прывёў яго да магілы дзеда. Нічога не спытаў, паглядзеў на партрэт і ўсё зразумеў. Уздыхнуў. Потым заўважыў партрэт маёй сястры і спуджана зірнуў на мяне. Ён, мусіць, здагадваўся аб смерці дзеда. Але каб не стала такой маладой?

Ён нарэшце зразумеў, куды так надоўга знікла любімая цётка. Адышоўся, доўга глядзеў на партрэт.

Я закурыў. Урэшце ён даведаўся б пра гэтую тайну. Добра, што я прывёў яго сюды. Канечне, усё гэта ўнесла сумятню ў паўказачны свет. Вядома, цяпер ён не будзе так сумаваць па дзядулю і цётцы. Апошні раз ён бачыў яе ў бальніцы.

— Было б добра, каб няня не хварэла, — сказаў сумна.

Я рэзка павярнуўся. Ён сядзеў бокам і чарціў саломінкай на зямлі. І гаварыў сам з сабою. — Калі б яна паправілася... — У мяне набеглі слёзы, засцілі свет. Я зразумеў душэўную барацьбу, якая ішла ў ім. І тое, што на пяшчотным сэрцы з'явіўся першы рубец. Цяпер ягоны свет перавярнуўся. Ён ведае, што дарослыя могуць дзеля суцехі спадманваць. Цяпер ён не будзе ўспамінаць свайго дзеда з такой надзеяй. У сэрцы будзе жыць смутак.

Паглядзеў на мяне ўпотайкі. Я выцер у яго слязінку.

— Можа, няня ператварылася ў ваду і вырвалася з-пад зямлі, а затым перакінулася птушкай і паляцела... Так? Скажы мне... — І закрычаў: — Знайшоў! Вада ліецца ў рэчку. Затым перараджаецца ў птушку. Пэўна яна, нашая цёця, была сярод тых журавоў... Я бачыў, узмахнуўшы крыламі, яна паляцела на неба...

Я маўчаў. Які сэнс падманваць цяпер? Нічым не суцешыш.

— У мультфільме... Ператвараецца ў птушку... чалавек. Лётае, праўда? — ён быў рады спадманвацца. Прыдумляў казку і верыў у яе.

— Так, сын мой, праўда... Можа быць, што яна ператварылася ў птушку, — сказаў я, уздыхнуўшы.

Ён паверыў...

І праз імгненне ён ужо гуляў.

Я паглядзеў з нейкай надзеяй у неба. І ўбачыў жураўліны клінок. Знаёмы, мілы воблік, здалося, махнуў крыламі.

●

Вечарам зайшоў у пакой, запаліў святло. Спіць і сапе сабе носам. І раптам уздыхнуў і заплакаў. Сэрца маё здрыгануласяя. Першае рыданне. А колькі радасці і няшчасця чакае цябе наперадзе, сын мой! Гэта тваё жыццё. А жыццё — і слёзы, і радасць. Галоўнае — зберагчы чысціню душы сваёй. Ты — мой саджанец. Ты — маё заўтра. Магутны дуб Заўтра. Ты плачаш у сне. Але будзь цвёрды наяве.

Сон — гэта сон... Заспакаенне, тваё заспакаенне. Сын мой, тваё заспакаенне...

А ты маё...

Пераклаў з казахскай Міхась БАРЭЙША.

цяць на прагулку, а другога — не. Глыбока памыляюцца тыя, хто лічыць, што апартэід можна гуманізаваць. Для нас відавочна, што гэта немагчыма, што яго можна толькі знішчыць барацьбой, у тым ліку ўзброенай». Сваё выступленне змагар з расісцкім прыгнётам скончыў баявым дэвізам: «Наш выбар— свабода або смерць!»

Затым слова было дадзена яшчэ аднаму, маладзейшаму векам, афрыканцу. Ён пачаў збянтэжана-ціха, потым голас памацнеў, стаў нарастаць. Не зусім звычайнай была танальнасць прамовы: рытмічна змянялася інтанацыя, сказы адбіваліся паўзай і заканчваліся націскным словам «Сауэта». Прыслухаўшыся да сінхроннага перакладу, я зразумеў: паэт чытае верш...

Ім мала крыві бацькоў,
кроў дзяцей пралілі яны...
О, Сауэта!
Забудзеш многія дні,
толькі не гэты дзень...
О, Сауэта!

Скончыўшы чытаць, прамоўца-паэт дадаў: «Мы пахавалі ахвяры, мы аплакалі іх, і мы будзем працягваць іх справу, будзем змагацца. Я асабіста прыняў такое рашэнне: больш не буду хавацца і калі вярнуся дамоў — абвяшчу галадоўку».

Пасля пасяджэння я падышоў — не змог стрымацца — да афрыканскага паэта, яшчэ зусім маладога, прыгожага, з валявым, адухоўленым тварам, у строгай скуранай куртцы, — прадставіўся, сказаў, што мне цікава было сведчыць, як у сценах ААН гучыць верш, як разам з палітычнай заявай у змаганне з расізмам уступае паэтычнае слова. Афрыканец падзякаваў, крыху сумеўшыся, і сказаў:

— Так, я прачытаў свой верш, прысвечаны крывавай драме — расстрэлу школьнікаў у Сауэта. Я не мог яго не напісаць. Мы прыйшлі да вываду, — пры слове «мы» ён паглядзеў на стаяўшых побач былога вязня «вострава смерці» і маладую негрыцянку, якая глядзела на паэта закаханымі вачамі,—што больш нельга траціць часу, што трэба змагацца ўсімі сродкамі, у тым ліку і зброяй слова. Я пішу вершы таму, што яны даюць магчымасць выказваць тое, што я думаю і адчуваю, гэта значыць, магчымасць змагацца з расізмам.

— Я ведаю, што ў вас існуе літаратура пратэсту, літаратура, якая выступае за правы і свабоду чалавека, супрацьстаіць апартэіду. Яна перакладаецца і выдаецца ў нашай краіне. З адным яе прадстаўніком я знаёмы асабіста.

— З кім іменна?—спытаў заінтрыгаваны паўднёваафрыканец.

— З Алексам Ла Гумай. Вам гэтае імя, канечне, вядома?

— Алекс Ла Гума! — усклікнуў мой субяседнік, а яго спадарожнікі сцвярджальна заківалі галовамі і заўсміхаліся. — Вы яго ведаеце? Вы з ім сустракаліся?... Мы ведаем яго творы, хоць іх і забаронена ў нас друкаваць і чытаць, але вось сустрэцца з ім асабіста я не мог.

— Ён прыязджае ў нашу краіну. У першы свой прыезд ён наведаў Мінск, тады мы з ім і пазнаёміліся. Другі раз мы сустрэліся ў Ташкенце, на сумесным форуме пісьменнікаў нашай краіны і краін Афрыкі і Азіі. Памятаю, ваш раманіст сказаў з болем: «Нас тут прымаюць так цёпла, як самых блізкіх сяброў, як братоў. А ў сябе дома мы для белых расістаў — людзі трэцяга гатунку, нікчэмныя гатэнтоты або непажаданыя элементы».

— На жаль, гэта так, — сумна пацвердзіў афрыканскі паэт. — Але мы спадзяёмся, што прыйдзе час, калі мы станем свабоднымі і калі будзем сустракаць у сябе на радзіме і Алекса Ла Гуму і ўсіх тых, каму сёння забаронены шлях у Паўднёвую Афрыку.

Я сказаў, што савецкія людзі выступаюць супраць расізму ва ўсіх яго формах і праявах, спачуваюць нацыянальна-вызваленчай барацьбе ў Паўднёвай Афрыцы, што беларуская дэлегацыя ўносіць на разгляд Генеральнай Асамблеі праект рэзалюцыі «Свабоду вязням імперыялізму і рэакцыі» і рыхтуецца да выступлення ў дыскусіі па пытанні «Палітыка апартэіду, якую праводзіць урад Паўднёвай Афрыкі».

— Мы вам вельмі ўдзячны,— ціха сказаў змагар-антырасіст. — Нам нялёгка было прыехаць сюды. Але нашы спадзяванні апраўдаліся. Мы выступілі, і бачым, што наш голас—не марны лямант у пустыні, што нас разумеюць, нас падтрымліваюць, што на нашым баку — салідарнасць усяго свету. Калі мы вернемся на радзіму, мы будзем пра гэта і расказваць, і пісаць... І ў вершах таксама. Бо вершы можна распаўсюдзіць. Няхай нават нелегальна.

На гэтым мы развіталіся.

На развітанне паўднёваафрыканцы падарылі мне і нашаму дыпламату, які ўдзельнічаў у размове ў якасці перакладчыка, той самы значок, аб якім я расказаў напачатку, каляровая гама якога паўтарае колеры сцяга Афрыканскага нацыянальнага кангрэсу.

НЕ ТОЛЬКІ ПАСЯДЖЭННІ ДЫ ПРАМОВЫ

Не аднымі прамовамі жылі ўдзельнікі Асамблеі. Не аднымі пасяджэннямі з іх дэбатамі, абмеркаваннем ды прыняццем рэзалюцый было запоўнена штодзённае жыццё міжнароднага форуму. Узяць хоць бы такі характэрны штрых: пакуль ідзе пасяджэнне, паміж радамі крэслаў ходзяць члены дэлегацый і супрацоўнікі місій з кіпамі канвертаў — разносяць запрашэнні на прыём (апошнія рассылаюць і на адрас пастаянных прадстаўніцтваў пры ААН). Не-не ды і ляжа перад табой папяровы квадрацік, дзе чорным па белым—розныя гербы, алфавіты, шрыфты, розныя почыркі, але прыблізна адзін і той жа змест—паведамляецца, што прадстаўнік імярэк запрашае дэлегацыю Беларускай ССР наведаць прыём, які ён дае (указваецца месца і час прыёму).

Сесія ўвайшла ў сваё звычайнае рэчышча, набірае «віткі» агульнапалітычная дыскусія, і пачынаецца паласа дыпламатычных прыёмаў. Прыёмы, ленчы, кактэйлі... насуперак парадзе, з якой адзін са старэйшых прамоўцаў звяртаўся да сваіх замежных калег: «Чым хадзіць на кактэйлі, лепш вывучалі б гісторыю».

Уявіце такі малюнак. На сесіі прадстаўлена каля 150 краін. І пераважная большасць з іх дае прыём у гонар большасці дэлегацый (не ўсе ўсіх, вядома, запрашаюць). Памножце адно на другое, суадносіце большменш акругленую лічбу з параўнаўча сціслымі тэрмінамі сесіі, і вы атрымаеце ўяўленне пра маштаб і інтэнсіўнасць такога роду дзейнасці членаў Арганізацыі, пра гэтыя вось іх узаемазапрашэнні і хаджэнні адзін да аднаго на прыёмы, пра гэтае іх, так сказаць, узаемагасцяванне.

Прыгадваю, што ў некаторыя дні членам дэлегацыі прыходзілася бываць на двух-трох прыёмах запар. Складвалася ўвогуле ўражанне, што прафесійным дыпламатам сумаваць не даводзіцца, не прыходзіцца вырашаць праблему вольнага часу.

Цікавае ў гэтым сэнсе сведчанне Вальдхайма. «Штогод у час сесіі Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Йорку, — гаворыць ён, — я абавязаны на працягу трох-чатырох месяцаў прысутнічаць больш чым на сотні афіцыйных абедаў і вячэр, дзе, як правіла, павінен гаварыць прамовы. Я атрымліваю запрашэнні на сотні кактэйляў, на якіх стараюся пабыць хоць некалькі мінут». І далей, да пытання аб карысці прыёмаў. Былы генеральны сакратар ААН прызнаецца: «Я не магу адмовіцца ад гэтых сустрэч, таму што лічу іх вельмі карыснымі для выканання маіх функцый. Адзін за абедам скажа вам ціха тое, што ніколі не адважыцца зрабіць з высокай трыбуны Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, другі паведаміць падбадзёрваючую навіну пра намеры свайго ўрада ў сувязі з перагаворамі, што вядуцца. Абстаноўка кактэйляў дае вам вялікую гаму магчымасцей пачарпнуць масу карысных звестак, устанавіць канфідэн-

(Заканчэнне на стар. 14—15).

«МЫ, НАРОДЫ АБ'ЯДНАНЫХ НАЦЫЙ...»

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 12).

цыяльныя адносіны, а то і дружалюбныя асабістыя сувязі з вашымі субяседнікамі, свабодна падыскутаваць па далікатных праблемах».

Словам, як бачым, не для свецкага баўлення часу наладжваюцца прыёмы; не дзеля фармальнага захавання пэўнага этыкету выказваюць узаемна знакі гасціннасці, частуюць адзін аднаго — хто з шыкам, у раскошнай зале фешэнебельнага атэля накшталт «Уолд-орф Асторыя» (ёсць такі ў Нью-Йорку), а хто больш сціпла, у сценах свайго пастаяннага прадстаўніцтва, хто з дэманстрацыяй нацыянальнай кухні, а хто без гэтага, з агульнапрынятым мясцовым меню. Нават для чалавека, не спрактыкаванага ў дыпламатычных справах, пасля наведання двух-трох прыёмаў робіцца зразумелым, што гэта — тая ж дыпламатыя, толькі з іншымі, неафіцыйнымі метадамі, і што гэтыя «застольныя» сродкі, можа быць, часам больш дзейсныя, чым афіцыйныя. Выступаючы з трыбуны, дэлегаты глядзяць у тэкст ці, калі адрываюцца ад яго, — некуды ў прастору, паверх галоў. На званай вячэры звяртаюцца непасрэдна адзін да аднаго, глядзяць адзін аднаму ў твар. Тут ужо ўступае ў дзеянне энергія асабістага кантакту.

Ды як бы там ні было, прыслухоўваючыся да рознагалосага гулу, якім суправаджаўся кожны прыём, нельга было не канстатаваць, што дыпламаты і іншыя дзяржаўныя людзі розных краін сабраліся — у духу народных звычаяў і лепшых агульначалавечых традыцый — за адным сталом, разам частуюцца, перагаворваюцца, абменьваюцца ўражаннямі, думкамі і інфармацыяй. Звычайнае «гаварыць» і афіцыйнае «перагаворы» — словы аднаго і таго ж кораня. А такія паняцці, як «запрашэнне», «гасцяванне», «пачастунак» — адны з самых мірных ва ўсіх мовах свету.

Дэлегацыя БССР таксама, вядома, давала прыёмы. Першы — для прадстаўнікоў краін, другі — для супрацоўнікаў сакратарыята ААН. Тут ужо ўсе мы на чале з А. Е. Гурыновічам выступалі ў якасці гаспадароў, выконвалі адпаведныя, звязаныя са звычайнымі ў такім выпадку клопатамі і хваляваннем, абавязкі, пачынаючы з падрыхтоўкі закусак і канчаючы неабходнасцю займаць гасцей, аддаваць увагу запрошаным.

У першай частцы кнігі я гаварыў пра тое, як мы святкавалі за акіянам гадавіну Кастрычніка. Савецкая дэлегацыя давала з нагоды свята вялікі прыём. Па-свойму была адзначана гэтая дата і ў сценах ААН. Усім дзяржавам-членам, старшыні Асамблеі і старшыням усіх галоўных камітэтаў, генеральнаму сакратару Арганізацыі і яго намеснікам была разаслана серыя брашур у перакладзе на англійскую мову, дзе расказвалася аб гісторыі БССР і яе дасягненнях за гады Савецкай улады ў галіне эканомікі, навукі і культуры. Камплект гэтых брашур быў перададзены і бібліятэцы ААН. Была падрыхтавана фотавыстаўка на тэму «Беларуская ССР — гісторыя, дасягненні, планы», а таксама наладжаны прагляд дакументальных фільмаў, прысвечаных рэспубліцы («Фарбы Беларусі», «Беларусь сёння» і інш). На праглядзе, які праводзіўся ў кіназале ААН, прысутнічалі супрацоўнікі сакратарыята і карэспандэнты. Перад прысутнымі выступіў А. Е. Гурыновіч. (Дарэчы, потым у чарговым нумары часопіса «Навіны сакратарыята» была змешчана падрабязная інфармацыя пра фотавыстаўку і кінапрагляд).

ААН мае сваю інфармацыйную службу, у прыватнасці сваё радыё, і наша дэлегацыя выкарыстала таксама гэтую магчымасць для таго, каб, у сувязі са святочнай нагодай, заявіць яшчэ раз пра гістарычны шлях рэспублікі, пра рэвалюцыйныя пераўтварэнні, якія далі ёй магчымасць заняць «свой пачэсны пасад між народамі», пра тую ролю, якую Савецкая Беларусь адыгрывае сёння ў справе змагання за мір і прагрэс, за лепшую будучыню чалавецтва.

Мы тут, канечне, не былі выключэннем. З той або іншай нагоды — нацыянальнае свята, знамянальная дата ў гісторыі краіны і г. д. — дэлегацыі, адна за адной, праводзілі самыя розныя мерапрыемствы — выстаўкі, кінапрагляды, выпуск прэс-рэлізу. Японія, напрыклад, нават адзначала гадавіну ўступлення ў ААН. Праўда, не без задняй думкі, з той мэтай, каб лішні раз нагадаць, што колькасць яе супрацоўнікаў у штаце ААН не адпавядае суме яе штогадовага ўзносу ў аанаўскую «скарбонку». (Зноў-такі: тая ж дыпламатыя, толькі іншымі сродкамі).

Чытачу, думаю, будзе цікава таксама даведацца, што, апрача прамоў, у залах штаб-кватэры ААН гучалі і вершаваны радок, і сцэнічнае слова, і музыка. Я ўжо расказваў, як скончылася аднойчы пасяджэнне камітэта супраць апартэіду: паўднёваафрыканскі паэт прачытаў свой верш, а адна негрыцянская нью-йоркская трупа паказала з імправізаваных падмосткаў некалькі сцэнак, прысвечаных той жа тэме — змаганню афрыканцаў з расавым прыгнётам. Гэта было ў пачатку кастрычніка. А ў канцы месяца, дакладней — 24 кастрычніка, вечарам, галоўная зала ААН наогул ператварылася ў канцэртную, і мы ўжо сядзелі не на сваіх дэлегацкіх месцах, а недзе на балконе і слухалі — у выкананні вядомага філадэльфійскага сімфанічнага аркестра — спачатку Бетховена, яго увертюру да «Эгманта» і Чацвёрты канцэрт для фартэпіяна з аркестрам, а ў другім аддзяленні — славутую Пятую сімфонію Шастаковіча. З кароткім уступным словам перад канцэртам выступіў Курт Вальдхайм. Ён гаварыў аб тым, што высакародныя ідэалы, якія выказаны ў творах вялікіх кампазітараў, сугучныя з ідэаламі ААН. Першы з іх, зазначаў генеральны сакратар, заклікаў у сваіх творах да свабоды і справядлівасці, а ў творы другога натхнёна гучыць тэма міру, тэма мірнай, стваральнай дзейнасці чалавека.

11 снежня ў ААН адбыўся яшчэ адзін канцэрт, які прысвячаўся чарговай, дваццаць дзевятай гадавіне Дэкларацыі правоў чалавека. На гэты раз перад удзельнікамі Асамблеі выступалі палінезійскія этнаграфічныя ансамблі — музычныя і танцавальныя, у тым ліку і вядомы ў нашай краіне ансамбль «Майоры» (я бачыў яго на сцэне мінскай філармоніі, так што гэта была ўжо сустрэча са знаёмым). «Мы бачылі, — гаварыў пасля канцэрта старшыня сесіі, — адны з самых цудоўных на зямлі танцаў, чулі дзівосную музыку. Сэнс танцаў і музыкі настолькі цудоўныя і багатыя, што мы не можам не адгукацца на іх усёй душой. Сімвалічна, што яны выконваюцца ў гэтай зале і ў гэты знамянальны для чалавецтва дзень. Бо словы Дэкларацыі таксама гучаць, як музыка, таксама сцвярджаюць прыгажосць і гармонію жыцця, ісціну і мір».

Было нешта па-добраму сімвалічнае ў гэтых своеасаблівых мастацкіх адступленнях, у тым, як дырыжорская палачка прыходзіла раптам на дапамогу старшынёўскаму малатку, а музы па-свойску ўладкоўваліся на аліўкавай галінцы, уплеценай у эмблему ААН.

Ішла ў адной з залаў ААН і размова пра паэта, пра яго творчую спадчыну і яго месца ў духоўным жыцці чалавецтва. Недзе ўжо ў канцы сесіі, калі камітэты праводзілі апошнія пасяджэнні і дэлегаты пачыналі раз'язджацца па родных дамах-краінах, у штаб-кватэры Аб'яднаных Нацый было адзначана стагоддзе з дня нараджэння Ікбала. «Па аднадушным рашэнні азіяцкіх краін», — як адзначыў пры адкрыцці ўрачыстасці старшынствуючы. Цікава было паслухаць, як, якой мовай гавораць дыпламаты ды палітыкі на літаратурныя тэмы, якое значэнне надаюць творчасці паэта, якое месца адводзяць яму ў свеце.

Малюнак атрымліваўся такі. Паколькі выступалі прадстаўнікі розных краін і носьбіты розных поглядаў, то, натуральна, яны падыходзілі да творчай спадчыны і асобы юбіляра з рознымі меркамі, кожны вылучаў на пярэдні план свайго, так сказаць, больш блізкага яму Мухамеда Ікбала, падкрэсліваў у яго творчасці тыя бакі і рысы, якія яму, данаму прамоўцу, больш імпанавалі. Адны падкрэслівалі перш за ўсё, што Ікбал «быў песняром Іслама»», «выступаў за адзінства мусульманскага свету», што ён, маўляў, «належыць перш за ўсё рэлігіі мусульманства». Другія, наадварот, рабілі ўпор на тое, што паэт «паўставаў супраць канфармізму і духоўнай затхласці», «крытыкаваў містыцызм, уладу догмату, артадаксальнасць». Трэція адзначалі як заслугу юбіляра тое, што ён «сінтэзаваў усходнюю філасофію з заходнім мысленнем», «выступаў як пасрэднік паміж Усходам і Захадам». У той жа час — характэрны момант — шэраг прамоўцаў пагаджаліся на тым, што Ікбал як творца і мысліцель «універсальны», што «яго думкі зразумелыя ўсяму свету, бо ён імкнуўся ўславіць усё жывое, сумленнае, справядлівае». Адзін прамоўца, хоць і мімаходзь, адзначыў сацыяльныя матывы ў паэзіі Мухамеда Ікбала. «Паэта абурала тое, — гаварыў ён, — што моцныя прыгнятаюць слабых, ён узнімаў голас у абарону правоў чалавека». Праўда, той факт, што Ікбал вітаў Кастрычніцкую рэвалюцыю і напісаў потым паэму «Ленін», адзначаны не быў. А ў адной прамове прагучаў такі надта смелы нават для трыбуны палітычнага форуму абагульняючы вывад: «Паэты — сапраўдныя ўладары свету. Яны, дзякуючы сіле свайго духу, умеюць прадказваць будучае».

Словам, палітыкі гаварылі пра паэта. Цытавалі яго вершы. І як бы хто ні падыходзіў да творчай спадчыны выдатнага ўсходняга мастака і мысліцеля, было відавочна, што яна так ці інакш «упісваецца» ў кантэкст сучаснага жыцця планеты, пераклікаецца шмат якімі сваімі матывамі з надзённымі праблемамі супольніцтва нацый. Пацвярджаліся наяве словы антычных грэкаў аб тым, што «мастак — першы палітык», што, кажучы інакш, мастацтва — тая ж палітыка, толькі іншымі сродкамі.

Калі-б гэта не было так, — доказ ад зваротнага, — стогадовы юбілей Мухамеда Ікбала не адзначалі б у сценах ААН.

КАГО ЦЫТУЮЦЬ З ВЫСОКАЙ ТРЫБУНЫ, АБО ТАЛСТОЙ У ЗМАГАННІ З КАЛАНІЯЛІЗМАМ І СІЛАМІ ВАЙНЫ

Не-не ды і чуеш: «Як сказана... Як гаворыцца... Як указваў у свой час... Паводле слоў... Хачу закончыць сваё выступленне словамі... Канец цытаты». Спасылаюцца, чую, на Статут ААН і на Усеагульную дэкларацыю правоў чалавека, на чацвёртую Жэнеўскую канвенцыю (у ёй ідзе гутарка аб абароне грамадзянскага насельніцтва ў час вайны) і на іншыя акты міжнароднага права, на гістарычныя дакументы і палітычныя дэкларацыі, на сутры, Біблію і Каран. Цытуюць, чую, творы філосафаў і паэтаў, выказванні дзяржаўных і грамадскіх дзеячаў, палітыкаў і рэвалюцыянераў (у выпадку неабходнасці — і рэакцыянераў) — усіх часоў і народаў. Гучаць у зале ААН не страціўшыя сваёй актуальнасці словы Арыстоцеля і Русо, Цыцэрона і Лао Цзы, Эмерсона і Жарэса, Макіявелі і Балівара, Гандзі і Леніна...

Гучалі цытаты і стаўшыя неўміручымі афарыстычныя выказванні, і часам было такое адчуванне, што сцены залы пасяджэнняў рассоўваліся ў часе і прасторы і што трыбуна ААН выносілася на скрыжаванне вялікіх шляхоў гісторыі, шляхоў развіцця духоўнай цывілізацыі чалавецтва. І яшчэ выклікаў задавальненне, абнадзейваў той несумненна станоўчы факт, што ў міжнароднага супольніцтва ёсць агульныя, выпрацаваныя агульным векавым вопытам, зыходныя пункты, крытэрыі, арыенціры, што ў яго ёсць агульнапрызнаныя настаўнікі і аўтарытэты, ёсць на каго аглядвацца, ёсць з кім раіцца і лічыцца.

Праўда, трэба сказаць, цені вялікіх трывожыліся не заўсёды дзеля ісціны, дзеля карысці справы, з той, скажам, мэтай, каб больш пераканаўча выкласці думку, выразней абгрунтаваць пазіцыю, а і дзеля краснага слоўца ці, што яшчэ горш, для таго, каб маскіраваць сапраўдныя думкі і мэты. (Так, напрыклад, аднойчы амерыканскі дыпламат, каб крыху прыкрыць, закамуфліраваць пазіцыю сваёй дэлегацыі, стаў з пафасам цытаваць Эклезіяста: «Час плакаць, і час смяяцца; час наракаць, і час скакаць; час раскідваць камяні, і час камяні збіраць...»). І ў такіх выпадках нельга было не пагадзіцца з адным прамоўцам, які едка заўважыў, што «нават д'ябал можа працытаваць Біблію ў сваіх уласных інтарэсах».

Звяртаюцца ўдзельнікі форуму і да фальклору, да крыніц народнай мудрасці. Хто прыгадвае імя казачнага героя, хто выкарыстоўвае прытчу, хто прыводзіць прыказку. Гучаць, чую, з высокай трыбуны, пераклікаючыся адна з адной, прыказкі і прымаўкі — арабскія («Хто ведае праўду, а не гаворыць, той хлус», «Хто нічога не робіць, той выступае ў якасці суддзі», «Адзін багацце здабывае працай, а другі — разбоем»), англійская («Куды анёл не рашаецца ступіць, ліхадзей ўрываецца папросту»), рускія і беларускія («Не той дабрахот, у каго на вуснах мёд», «Гарбатага толькі магіла выправіць»), сенегальская («Хто супраць ветру плюе, будзе сам апляваны»), французская («Калі ты сказаў «А», то мусіш сказаць і «Б») і г. д.

І вельмі дарэчы, павінен сказаць, гучала тут жывое, каларытнае, вобразнае народнае слоўца, вельмі добра «ўпісвалася» ў рознагалосіцу палітычнага форуму. Вельмі трапным, дадам, было часта яго пападанне. Прыгадваецца такі эпізод. У час абмеркавання пытання аб апартэідзе савецкаму дэлегату трэба было даць належны адпор дэмагагічным спробам сяго-таго абылгаць палітыку нашай краіны ў дачыненні да Афрыкі. І ён гаварыў у сваім выступленні: «Нашы афрыканскія сябры папрасілі ўчора нас не ўступаць у палеміку з вышэйадзначанымі заявамі, бо гэта адводзіла б у бок ад абмеркавання важнага пытання, якое зараз знаходзіцца на разглядзе Генеральнай Асамблеі. Афрыканскія сябры напомнілі старую, але добрую мудрасць: «Пустыя бочкі, вялікія яны ці малыя, заўсёды грымяць больш за ўсіх». Што ж, няхай грымяць. А мы будзем дапамагаць вызваленчай барацьбе народаў». (Я ўжыў слова «пераклікаліся». Прыклад з «пустымі бочкамі» сведчыць, што асобныя жамчужыны народнай мудрасці розных краін і нават розных кантынентаў маглі, як бачым, зусім супадаць — і па сэнсу, і па гучанні).

Апелявалі члены Асамблеі і да аўтарытэту прадстаўнікоў прыгожага пісьменства, да класічных узораў сусветнай літаратуры. Вось, напрыклад, гучаць словы прынца дацкага аб тым, што «на небе і зямлі ёсць болей рэчаў, чым сніцца філасофіі любой». У наступнай прамове цытуюцца другія радкі таго ж шэкспіраўскага твора: «Колькі б ні стараўся Геркулес, кот мяўкае, а воўк глядзіць у лес». Прэзідэнт адной маленькай дзяржавы пачынае сваю прамову з саркастычнай ноты — нагадвае міжнароднаму супольніцтву выказванне Вальтэра: «Як багатыя, так і бедныя маюць у адным аднолькавую свабоду — памерці з голаду». А прадстаўнік афрыканскай краіны, гаворачы аб барацьбе народа Намібіі за свабоду і раўнапраўе, звяртаецца да Гюго: «Мацней за ўсё на свеце ўяўленне аб тым, часіна чаго надышла». «Раней чым пакінуць гэту трыбуну, — гаворыць чарговы прамоўца, дэлегат адной з паўднёваамерыканскіх краін,— дазвольце мне выказаць пачуцці свайго народа словамі нашага славутага Радо». І вось у зале гучаць натхнёныя словы класіка лацінаамерыканскай літаратуры Хасэ Энрыке Радо: «Я горача малюся за тое, каб сімвал Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, яе флаг развяваліся на ўсё больш чыстым небе; каб яе высакароднасць асвятлялася заўсёды чыстай славай, каб яна заўсёды кіравалася законам, каб нашы ўраджаі няспынна павялічваліся, каб узрасталі наша свабода і наша шчасце, каб існавалі ўмовы нязменнай гармоніі, што вынікаюць з любві і справядлівасці, каб сучаснае і будучыя пакаленні чалавецтва жылі ў больш шчаслівым і цудоўным свеце, якога яшчэ не было на працягу таго, як праходзяць стагоддзі».

Словам, на форуме нацый літаратура таксама служыла сваю добрую службу, узвышала свой голас у імя міру, справядлівасці і прагрэсу.

У гэтым пераконваў асабліва наступны эпізод. Выступае прадстаўнік Сейшэльскіх астравоў, яшчэ малады, бляявы, знешне, манерай гаварыць больш падобны на школьнага настаўніка, чым на дыпламата. Гаворыць пра станоўчыя змены, якія адбыліся ў жыцці маладой рэспублікі пасля прыходу да ўлады левых сіл, пра тыя цяжкасці, якія перажывае нядаўняе каланіяльнае ўладанне на шляху самастойнага развіцця. Выкрывае з абурэннем тых, хто падтрымлівае паўднёваафрыканскіх расістаў, і спасылаецца ў гэтай сувязі на папярэджанне прэзідэнта Замбіі доктара Каунды: «Калі Захад не можа адгукнуцца па маральнай прычыне, то няхай адгукнецца ад страху перад магчымымі вынікамі». З непакоем гаворыць далей пасланец Сейшэлаў аб розных формах залежнасці толькі што стаўшых на ногі маладых дзяржаў ад «моцных свету гэтага». І тут раптам вымаўляецца імя Талстога, і гучаць у навушніках крыху скажоныя паспешлівым адваротным перакладам талстоўскія словы: «Я сижу на шее у человека, задавил его и требую, чтобы он вез меня и, не слезая с него, уверяю себя и других, что я очень жалею и хочу облегчить его положение всеми возможными средствами, но только не тем, чтобы слезть с него...»

Талстой!.. Калі б нават прамоўца не сказаў, чые словы ён цытуе, іх усё адно нельга было б не пазнаць. Вельмі ўжо характэрныя былі яны, вельмі ўжо талстоўскія — па сіле духу, па сваёй суровай бескампраміснасці і выяўленчай выразнасці. «Зло небяспечнае і тады, — працягваў сейшэльскі дэлегат развіваць думку, выкрываць дабрадзеяў-неакаланізатараў, — калі чалавек проста робіць нешта няправільна, несправядліва. Але калі ён робіць зло, дзейнічае няправільна і ў той жа час спрабуе даказваць, што ён мае рацыю, што ён нічога дрэннага не робіць, гэта зло асабліва небяспечнае».

У сценах ААН, на яе Асамблеі можна было ўвачавідкі пераконвацца, што сусветная, каланіяльная сістэма пала, «загадала доўга жыць», што адышлі ў мінулае вялікія каланіяльныя імперыі — адна, другая, трэцяя... Гэта ж на іх руінах узніклі, як грыбы пасля жыватворнага дажджу, дзесяткі новых самастойных дзяржаў, якія складаюць пераважную большасць у ААН, вызначаюць у значнай меры яе нацыянальна-дэмаграфічны спектр. Але ў тых жа сценах і гэтак жа наглядна можна было канстатаваць існаванне перажыткаў, астаткавых, так сказаць, з'яў каланіялізму. На парадку дня сесіі ўсё яшчэ стаялі пункты, накшталт: «Ажыццяўленне Дэкларацыі аб прадастаўленні незалежнасці каланіяльным краінам і народам», «Пытанне аб Намібіі», «Пытанне аб каморскім востраве Майота» і г. д. На форуме яшчэ можна было пачуць выкрывальныя інвектывы, накшталт, да прыкладу, той, якая прагучала аднойчы ў выступленні прадстаўніка Шры Ланкі. «Пазіцыя Францыі, — заяўляў ён пры абмеркаванні пытання аб востраве Майота, — не што іншае, як спроба захаваць рэшткі каланіялізму. Гэта не тая пазіцыя, якую можна было б чакаць ад такой палітычна вопытнай краіны, як Францыя. Каланіялізму няма больш месца ў жыцці народаў, яго месца ў мінулым!»

Каланіялізм распаўся як сістэма, але сам па сабе яшчэ арганізуе, і працэс дэкаланізацыі — як гэта можна было бачыць на сесіі Асамблеі — яшчэ працягваецца.

Гэта па-першае. Па-другое, у свеце яшчэ застаецца — пра што таксама нямала гаварылася з трыбуны ААН, асабліва дэлегатамі «трэцяга свету» — каланіялізм відазменены, падноўлены, каланіялізм, які, тужачы па салодкім «цяжары белага чалавека» і чапляючыся за ранейшыя пазіцыі, націскае ўжо не столькі на курок і гашэтку, колькі на эканамічныя рычагі, сядзіць, калі трымацца талстоўскай метафары, на шыі слабейшага ўжо не з бізуном і ружжом, а з пернікам і долярам (фунтам стэрлінгаў, маркай, франкам). Адзін прамоўца гаварыў пра «эканамічную несправядлівасць», другі — пра «традыцыйны эгаізм багатых і магутных», трэці, ставячы кропкі над «і», — пра «неакаланіялісцкае разграбленне і дыскрымінацыю». Гутарка, словам, ішла пра неакаланіялізм.

І вось у гэтым аб'яднаным, шматнацыянальным хоры, у гэтым змаганні з каланіялізмам, з усімі відамі несправядлівасці і прыгнёту прагучаў — я быў таму сведкам — і голас Льва Талстога.

Меў рацыю яго сучаснік, які сказаў: «Нам не дано предугадать, как слово наше отзовется». Як і дзе, у якім геаграфічным пункце зямнога шара і ў якім сацыяльна-жыццёвым кантэксце.

«Прысутнасць» Талстога на Асамблеі ААН пацвердзілася потым, амаль дзівосным чынам, і яшчэ раз — калі на трыбуну ўзняўся дэлегат Фіджы, другой маленькай, астраўной, атрымаўшай толькі нядаўна незалежнасць краіны. Ён гаварыў пра нялёгкі лёс свайго пяцісоттысячнага народа. «У нас такое ўражанне,—звяртаўся пасланец Фіджы да залы, — што той край свету, дзе мы знаходзімся, часта забываюць. Нам пагражаюць стыхійныя бедствы, мы не можам пазбавіцца ад адсталасці, мы маем патрэбу ў дапамозе, але нас абыходзяць...» І вось, слухаючы горкія нараканні фіджыйца, я зноў прыгадаў, нельга было не прыгадаць, талстоўскі трактат «Дык што ж нам рабіць?», словы з якога прыводзіў прадстаўнік Сейшэльскіх астравоў. Справа ў тым, што дэлегат Фіджы мог бы з яшчэ большай пераканаўчасцю і большым правам, чым яго сейшэльскі калега, спаслацца на славуты трактат, дзе менавіта на прыкладзе... ціхаакіянскага вострава Фіджы вялікі Талстой, узброіўшыся адпаведнымі лічбамі і фактамі, паказваў, што такое «грашовае насілле», якую ролю адыгрывала яно ў эканамічным і палітычным заняволенні народаў англійскімі і амерыканскімі каланізатарамі.

Павінен сказаць, што талстоўская мудрасць, яго асобныя празарэнні не раз прыходзілі на памяць — чытач гэта ўжо, напэўна, заўважыў — у тыя дні, у час сесіі. Завязвалася, скажам, на пасяджэнні чарговая сварка паміж даўно варагуючымі дзяржавамі, і ўзнікала думка аб псіхалагічным фактары, аб тым, што, мабыць, і тут, у палітыцы, дзейнічае так альбо інакш закон, сфармуляваны Талстым у дачыненні да сямейных узаемаадносін: спачатку рознагалоссі з'яўляюцца прычынай варожасці, а потым ужо варожасць становіцца ў сваю чаргу крыніцай рознагалоссяў. Асамблея давала нямала нагод для роздуму аб нялёгкім і супярэчлівым адзінстве нашага роду чалавечага, аб магічным значэнні асабістых кантактаў, і ў гэтай сувязі нельга было не ўспомніць вядомую сцэну абмену позіркамі паміж П'ерам Бязухавым і напалеонаўскім маршалам. Або ўзяць наступны запіс у блакноце: «Падумаў сёння, што выказаныя тут думкі, а таксама стэнаграмы, рэзалюцыі, дэкларацыі, у якіх гэтыя думкі фіксуюцца, ужо самі па сабе — дасягненне. Нават незалежна ад таго, які практычны вынік, які палітычны эфект будуць мець яны, гэтыя думкі (стэнаграмы, рэзалюцыі, дэкларацыі). Гаварыў жа Талстой, што калі думка выказана, то яна ў нейкай меры ўжо і здзейснена».

«Як там на сесіі? — пытала з усёй сур'ёзнасцю ў сваім пісьме дачка-школьніца. — І яшчэ напішы, што мне цяпер чытаць. Без цябе я не ведаю». «На сесіі, — адказваў я, — нам да ўсяго ёсць справа, да палітыкі, гісторыі і геаграфіі адначасова, да таго, што робіцца ў Паўднёвай Радэзіі і каму павінен належаць Усходні Цімор, да таго, як жывецца людзям на Сейшэльскіх астравах і на занядбаным усімі адзінокім востраве Фіджы. Ці ведаеш такія краіны? Пашукай іх на глобусе ці ў атласе. А вось што датычыць твайго чытання, то, не задумваючыся, раю: чытай Талстога. Спытайся ў маці, дзе ён стаіць. Бяры і чытай, як толькі зробіш урокі. Не памылішся. Я тут пераканаўся ў гэтым лішні раз. Прыеду — раскажу больш падрабязна».

ПА СЛЯДАХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ «ЛіМа»

«ПРА ЭЛЕКТРАВУДЫ І ПАЛЯВАННЕ НА ЗУБРА»

Пад такім загалоўкам у «Літаратуры і мастацтве» за 15 лютага 1985 года быў надрукаваны крытычны артыкул, у якім ішла гаворка аб браканьерах, якія на рэках і ў лясах Барысаўшчыны наносяць непапраўную шкоду рыбе і лясной фаўне, у тым ліку і занесенай у «Чырвоную кнігу».

У працяг гаворкі, узнятай аўтарам гэтага артыкула, у «ЛіМе» за 3 мая г. г. былі надрукаваны інтэрв'ю са службовымі асобамі, якія адказваюць за ахову прыроды ў розных яе аспектах.

У прыватнасці, у сваім інтэрв'ю начальнік упраўлення па ахове і выкарыстанні жывёльнага свету і запаведнікаў Дзяржкамприроды БССР В. Савіцкі крытыкаваў за марудлівасць у выкрыцці браканьераў абласную і рэспубліканскую пракуратуры, абласное ўпраўленне і Барысаўскі аддзел унутраных спраў.

Гэтыя крытычныя заўвагі газета пераслала ў Пракуратуру БССР.

Як напісаў у рэдакцыю намеснік пракурора Беларускай ССР, дзяржаўны саветнік юстыцыі 3 класа Л. Дзядкоў: «У сувязі з публікацыяй у газеце «Літаратура і мастацтва» Пракуратурай БССР запатрабаваны з Барысаўскага РАУС і праверены ўсе спыненыя крымінальныя справы і матэрыялы аб браканьерстве, якія адбыліся на тэрыторыі раёна за 1976—1983 гады, па якіх злачынцы не ўстаноўлены.

Так, у лістападзе 1976 года ў Зембінскім лясніцтве Барысаўскага раёна з паляўнічага ружжа браканьерамі былі забіты дзве зубрыхі ва ўзросце 6—7 гадоў. Па дадзеным факце УУС Мінаблвыканкома праводзілася расследаванне, па справе апытана больш як 100 сведкаў, даследаваны ружжы маркі МЦ-2112 і «Браўнінг» семнаццаці паляўнічых, якія падазраваліся ў злачынстве. Праведзены трасалагічная і крымінералістычныя экспертызы рэчавых доказаў (страляных гільзаў, слядоў аўтамашыны), аднак злачынства дагэтуль застаецца нераскрытым.

Таксама ў лістападзе 1983 г. у гэтым жа лясніцтве з паляўнічага ружжа была забіта зубрыха. Праведзеным крымінералістычным даследаваннем кулі, вынятай з трупа жывёлы, устаноўлена, што яна з'яўляецца паляўнічай куляй Келі-Мак-Эльвіна і прадназначана для стральбы з паляўнічага ружжа 12, 16, 20 калібраў, выраблена заводскім спосабам, і пасля стрэлу на яе паверхні не застаецца слядоў ад сценак канала ствала. Гэта ўскладніла пошук вінаватага, і злачынства таксама засталося нераскрытым.

У 1982—1983 гг. на тэрыторыі раёна знойдзены два трупы зубранят ва ўзросце 1—2 месяцы, труп мядзведзіцы. Устаноўлена, што звяры загінулі ад атручвання мінеральнымі ўгнаеннямі і ад знясілення.

У Барысаўскім раёне носіць распаўсюджаны характар незаконнае паляванне на ласёў. За ўказаны перыяд неўстаноўленымі браканьерамі забіта 7 ласёў. Вывучэнне спыненых спраў паказала, што дазнанне па многіх з іх праведзена некваліфікавана і павярхоўна. Асобныя крымінальныя справы ўзбуджаліся несвоечасова, з боку работнікаў Барысаўскага РАУС не прымаліся ўсе меры для ўстанаўлення браканьераў. Па указанай прычыне Пракуратурай БССР узноўлена расследаванне па чатырох крымінальных справах аб незаконным паляванні на ласёў, і гэтыя справы для арганізацыі дазнання накіроўваюцца ў УУС Мінаблвыканкома. За іх расследаваннем устаноўлены кантроль.

Такім чынам, узнятае газетай «Літаратура і мастацтва» пытанне аб парушэннях законаў аб ахове прыроды з'яўляецца актуальным, браканьерства ў Барысаўскім раёне, як і іншых раёнах, носіць яшчэ распаўсюджаны характар, а барацьба з ім аслаблена.

З мэтай выкаранення недахопаў у дзейнасці праваахоўных і прыродаахоўных органаў па барацьбе з парушэннямі законаў аб ахове прыроды па гэтым пытанні праведзена Рэспубліканская каардынацыйная нарада. На месцы наніравана адпаведнае пісьмо. Пытанні ўмацавання барацьбы з парушэннямі законаў аб ахове прыроды пастаянна знаходзяцца ў полі зроку Пракуратуры БССР».

ПЕРШЫМІ СМЯЯЛІСЯ АКЦЁРЫ

Першай сатырычнай камедыяй, якая мела выразна акрэсленыя жанравыя прыкметы, у рэпертуары беларускага савецкага тэатра лічыцца п'еса Еўсцігнея Міровіча «Кар'ера таварыша Брызгаліна». Святло рампы, як кажуць, яна пабачыла ў 1925 годзе. Драматургія і сцэна тады яшчэ не мелі вопыту па-сатырычнаму завостранага адлюстравання адмоўных з'яў у новай рэчаіснасці. Жыццё ж вымагала, каб мастацтва рашуча выкрывала класава варожыя элементы, розных двурушнікаў і бюракратаў, парушальнікаў партыйнай і дзяржаўнай дысцыпліны. Была свая заканамернасць і ў тым, што менавіта Е. Міровіч першым у нас стварыў такую п'есу і потым сам паставіў яе на падмостках Беларускага дзяржаўнага тэатра (Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы), мастацкім кіраўніком якога ён быў. Папярэдні вопыт камедыёграфа, вядомага яшчэ ў дарэвалюцыйны час, пісьменнік і рэжысёр па-творчы пераасэнсоўвае і знаходзіць надзвычай сцэнічны канфлікт і вельмі выразны вобраз галоўнага персанажа. Шэсцьдзесят гадоў назад на афішы з'явілася гэтая назва — «Кар'ера...».

Першымі слухачамі камедыі былі калегі аўтара, творчая трупа тэатра, будучыя выканаўцы роляў. Па мемуарах сучаснікаў падзей можна даведацца, што чытанне п'есы карысталася такім поспехам, якога артысты не помнілі пасля купалаўскай «Паўлінкі». У фае стаяў смех, рогат, гучалі раптоўныя апладысменты, адрасаваныя дасціпнаму і з'едліваму камедыёграфу. Сцэнічны твор пра сацыяльна небяспечнага чалавека, які «прымазаўся» да новай улады, старанна схаваўшы сваё жандарскае мінулае, і цяпер наўмысна шкодзіць будаўніцтву сацыялістычнага грамадства, нават па першых рэпетыцыйных уражаннях абяцаў стаць падзеяй у тэатральным сезоне. Так яно і было. Галоўную ролю з найвялікшым поспехам выконваў Уладзімір Уладамірскі, з разлікам на якога і была напісана камедыя.

Калі купалаўцы пазней з такім жа поспехам першымі ўспрымалі новыя камедыйныя драматургічныя творы К. Крапівы, А. Макаёнка, Я. Рамановіча, К. Губарэвіча, М. Матукоўскага, ветэраны калектыву прыгадвалі той верасень дваццаць пятага года, калі Еўсцігней Міровіч, разгарнуўшы рукапіс, прачытаў уголас: «Кар'ера таварыша Брызгаліна»... Камедыя з семнаццаці карцін з пралогам і эпілогам». Прыкметная дата ў тэатральным календары Беларусі!

К. ТУР.

«ЭЛІМБЕЛ», ДРУГІ ТОМ

Выдавецтва «Беларуская Савецкая Энцыклапедыя» імя Петруся Броўкі выпусціла чарговы том «Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі», у які ўвайшлі артыкулы на літары Г, Д, Е, Ж, З, І, К у межах слоў «Габой» — «Карціна». Змешчаны разнастайныя навукова выверэныя матэрыялы, што адлюстроўваюць пэўныя этапы з гісторыі нацыянальнай культуры, расказваюць пра яе сённяшні дзень, знаёмяць з жыццём выдатных прадстаўнікоў нацыянальнай літаратуры і мастацтва, тэатра, кіно, расказваюць пра прадстаўнікоў іншых культур, якія нямала зрабілі і робяць на ніве творчых узаемасувязей і супрацоўніцтва.

К. ЯРОШАЎ.

ЛЁС МІХАСЯ ЗАСІНЦА

Лёс Міхася Засінца — лёс хлебароба. Араў, сеяў, жаў. Заўсёдны гэты клопат не прызнае абавязковых выхадных або святочных гуляў. Зямля ўладна кліча да сябе і ў ружовую чысціню красавіцкай раніцы, і ў нудную непагадзь восеньскіх дзён. Таму ягонае жыццё да пэўнага часу ішло па сялянскім мазолістым календары, было непарыўна знітавана з жыццём палескай прыроды, яе буднямі і святамі. Ён быў, напэўна, і не ўсведамляючы гэта, адухоўленай часткай самой прыроды, яе вачамі, яе голасам.

Лёс Міхася Засінца — лёс мастака. Лёс няласкавы, суровы і адначасна шчаслівы, бо даў яму тое, да чаго іншыя імкнуцца ўсё свядомае жыццё — спасціжэнне таямніцы прыгажосці. У трыццаць пяць год — невылечная траўма, ложак. І не на тыдзень, не на месяц, а на доўгія гады... Успомніў — у дзяцінстве, а таксама ў школе, любіў маляваць. У руку папрасіўся пэндзаль. Заморскія дзівосныя краявіды на цыраце падабаліся аднавяскоўцам і жыхарам наваколля. Пасыпаліся «заказы». Здавалася, народная традыцыя маляваных дываноў знайшла свайго дзейснага нястомнага прадаўжальніка. Але гэта быў толькі перыяд станаўлення, не больш, авалоданне прыёмамі дэкаратыўнага пісьма. І яшчэ: часы, калі бытавалі маляваныя дываны, адышлі ці амаль адышлі, стыхія Засінца была зусім у іншым. Пачынаючы мастак, хоць і блізкі да народнага разумення прыгожага, перадусім бачыў хараство ў тым, што акружала яго самога і што, безумоўна, патрабавала іншых, больш разнастайных жывапісных сродкаў, а насамперад — зусім іншага падыходу для адлюстравання рэчаіснасці. Адышоўшы ад малявання насценных дываноў, дзе асоба творцы часцей за ўсё раствараецца або ў працах найбольш здольных выканаўцаў толькі ўгадваецца праз нейкія характэрныя рысы, Засінец прыйшоў да больш яркага выяўлення свайго асабістага светаўспрымання. Ён перайшоў тую ўмоўную мяжу, за якою — самадзейная творчасць.

У наш час, калі гавораць пра самадзейнае мастацтва, дык, часцей за ўсё, з паблажлівай усмешкай, маўляў, ніжэйшая форма, прымітыў ці, як яго цяпер прыгожа называюць, наіўны рэалізм. Што ж, вялікі грузінскі мастак Ніко Пірасманашвілі таксама адносіцца да кагорты мастакоў прымітыву, але праз ягоныя творы ўвесь свет спасцігае грузінскі дух. Таму сытая паблажлівасць часцей за ўсё ідзе ад няведання і неразумення самадзейнага мастацтва як з'явы, яе прыгожага і сапраўды глыбокага зместу.

Бадай што ў нашым беларускім мастацтве яшчэ не было больш яркага і таленавітага самадзейнага жывапісца, чым М. Засінец. Ён пачаў тварыць, будучы сталым чалавекам, за плячамі якога быў пэўны жыццёвы вопыт і які ведаў, што хоча сказаць людзям. Галоўнай тэмай на пачатку яго творчай дарогі стала тэма Вялікай Айчыннай вайны. У лепшых сваіх творах гэтага перыяду жывапісец выходзіў на шырокія і пераканальныя мастацкія абагульненні. Мастак глядзеў на вогненнае мінулае вачамі спакутаванага дзіцяці, у якога, па сутнасці, і не было дзяцінства. Запамінаецца, уражвае карціна «Маці. 1941—1945 гады». Вобраз маці, якая засланіла сваіх дзяцей ад чорнай навалы вайны, адразу асацыіруецца з вобразам Маці-Радзімы. Гэтай задуме падначалена і кампазіцыйнае вырашэнне, і сімвалічна-ўзбуйненая постаць жанчыны, і сам жывапісны лад.

Міхасю Засінцу было дадзена надзвычай тонкае разуменне юнай душы, ён не проста любіў маляваць дзяцей, а жыў іхнімі марамі, радасцямі і бедамі. Адсюль такая раскаваная ўзнёслая паэтычнасць у карцінах «Крынічка», «Бярозавік», «Па шляху дзядулі і бацькі», «На начлег» — у шмат якіх іншых творах, што разам глядзяцца як своеасаблівая натхнёная паэма дзяцінства. Свет прыроды і свет дзіцячы надзіва натуральна зліваюцца пад пэндзлем мастака, хораша дапаўняюць адзін аднаго. Расказаць змест карціны «Купанне сонца» можна ў некалькіх словах. Блакітнае крыло рэчкі з белымі пасмамі ад аблокаў. На бліжнім беразе дзве дзяўчынкі, на супрацьлеглым — сцяна лесу, адлюстраваная ў вадзе. А ў цэнтры немудрагелістай плоскаснай кампазіцыі — чырвоная кветка сонейка. Здаецца, дзяўчаткі сапраўды купаюць яго, бо вось яно, зусім каля іхніх рук. Наіўна, як у дзіцячым малюнку, а колькі любасці і, галоўнае, мастацкай праўды.

Асобна хочацца гаварыць пра пейзажы мастака, пра ягоны светлы дар прыкмячаць у звычайным, будзённым штосьці цікавае, прыгожае. Ён не выдумляў кампазіцыі. Азёры і рэкі, дрэвы, хаты быццам самі шукалі і знаходзілі сваё месца на палатне ці кардоне, і нараджалі гармонію, суладдзе, песню. І як бы густа ні было на карціне дэталей — ім заўсёды свабодна «дыхаецца», бо кожная на сваім месцы і абавязкова нябачнымі ніцямі далучана да астатніх. Думаецца, што менавіта гэтае беспамылковае адчуванне дэталі і цэлага рашуча вылучае творы Міхася Засінца сярод твораў мастакоў-аматараў. І, вядома ж, пранізлівая шчырасць, жаданне гаварыць толькі пра тое, што па-сапраўднаму глыбока ўразіла, запала ў сэрца. Яркім прыкладам таму — вядомая карціна «Залатая сажалка», каляровая фотарэпрадукцыя якой была змешчана сёлета ў ліпеньскай кніжцы часопіса «Мастацтва Беларусі». Гэты твор, не баючыся памыліцца, можна назваць шэдэўрам самадзейнага мастацтва, які зрабіў бы гонар любой самай прадстаўнічай выстаўцы. Калі толькі гаварыць пра дзівосны каларыт «Залатой сажалкі», яе такую простую і разам з тым надзвычай ёмкую кампазіцыю — значыць вельмі мала сказаць пра карціну. «Золата» сажалкі са стажком сена на беразе, хатаю на другім плане — не толькі ад сонечных промняў, яно — ад **спасціжэння** чалавекам вялікай прыгажосці нашага быцця. Глядзіш на гэты твор і міжволі думаеш: які таленавіты наш народ і як моцны ён светлым жыццесцвярджальным аптымізмам.

Наш сучаснік — духоўна прыгожы чалавек — вось галоўны герой большасці карцін мастака, таму ягоная творчасць такая блізкая і дарагая нам. У 1977 годзе, за пяць год да смерці (20 верасня яму споўнілася б 50), Міхасю Засінцу было нададзена ганаровае званне заслужанага работніка культуры БССР. Так, найперш ён быў Работнікам — сціплым, шчырым, шчодрым. І на зямлі, і ў творчасці. Таму ягоны лёс цяпер назаўсёды з'яднаўся з лёсам беларускага мастацтва.

Уладзімір ЯГОЎДЗІК.

«Залатая восень».

«На сенакосе».

«Веснавы матыў».

НА БАГАКІТНЫМ ЭКРАНЕ

з 16 па 22 верасня

16 ліпеня, 20.05

ЛАЎРЭАТЫ РЭСПУБЛІКАНСКАГА ТЭЛЕВІЗІЙНАГА КОНКУРСУ «ЗЯМЛЯ МАЯ».

Выступае народны хор калгаса імя Урыцкага Гомельскага раёна.

18 верасня, 20.15

«ЛЯ РАСКРЫТАЙ ПАРТЫТУРЫ».

Прагучаць творы Лакатэлі, Рамо, Войціка для камернага аркестра ў выкананні Мінскага камернага аркестра. Вядучая — музыкавед Л. Барадзіна.

19 верасня, 19.45

ДНІ ЛІТАРАТУРЫ ЛЕНІНГРАДА У БЕЛАРУСІ. «ДАРОГАЙ ДРУЖБЫ, ДАРОГАЙ ЖЫЦЦЯ».

Творы ленінградскіх і беларускіх паэтаў М. Дудзіна, А. Пракоф'ева, Б. Кежуна, Г. Гарбоўскага, П. Броўкі, М. Танка, Г. Бураўкіна чытаюць артысты мінскіх тэатраў.

20 верасня, 19.45

ПАКАЗВАЕ ВІЦЕБСК. ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКІ ЧАСОПІС «ДЗВІНА».

Будзе расказана пра свята Скарыны, у якім прымалі ўдзел Р. Барадулін, А. Вольскі, М. Стральцоў, Л. Левановіч; пазнаёміцеся таксама з работамі ганчара М. Траяноўскага з Лёзна.

20 верасня, 20.30

ДНІ ЛІТАРАТУРЫ ЛЕНІНГРАДА У БЕЛАРУСІ. «У СЯМ'І АДЗІНАЙ».

У перадачы прымаюць удзел А. Вольскі, Я. Малішэўскі, Д. Гранін. А. Астроўскі, М. Дудзін.

21 верасня, 18.20

«НАШЫ ГОСЦІ».

Адбудзецца сустрэча з заслужаным артыстам РСФСР В. Гатаевым.

Будуць паказаны фрагменты з фільмаў «Апошні гайдук», «Цені знікаюць апоўдні», «Бацька і сын».

21 верасня, 19.45

П. УСЦІНАЎ. «КРАМНЭГЕЛ».

Спектакль Маскоўскага акадэмічнага тэатра сатыры. Рэжысёр — Хомскі. У ролях Мішулін, Зялінская, Графкін, Пратасаў, Козел, Шырвінт, Менглет, Архіпава і іншыя.

21 верасня, 23.00

«СУСТРЭНЕМСЯ ПАСЛЯ АДЗІНАЦЦАЦІ».

Эстрадная музычная праграма з удзелам А. Лазарук і Я. Догі.

22 верасня, 13.25

«ЭКРАН: ПРАБЛЕМЫ, ГЕРОІ».

У тэлекіназале кінарэжысёр Ю. Лысятаў.

22 верасня, 14.05

МУЗЫЧНЫЯ СПЕКТАКЛІ ТЭАТРАЎ КРАІНЫ. Д. ВЕРДЗІ. «ТРАВІЯТА».

Спектакль Дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета Літоўскай ССР.

Вядучая — музыкавед Э. Язерская.

22 верасня, 19.45

«ФАНТАН».

Прэм'ера дакументальнага фільма Беларускага тэлебачання.

Стужка расказвае пра заслужанага настаўніка БССР, дырэктара школы № 18 г. Гродна І. М. Лашука.

Аўтар сцэнарыя Б. Пастэрнак. Рэжысёр—У. Бокун.

22 верасня, 20.05

КАНЦЭРТ МАЙСТРОЎ МАСТАЦТВАЎ.

У ім выступяць А. Абразцова, М. Біешу, Я. Несцярэнка, А. Салаўяненка, Б. Мінжылкіеў, М. Войтас.

У праграме арыі з класічных опер і народныя песні.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

«ЛІТАРАТУРА І МАСТАЦТВА»

Выходзіць па пятніцах на шаснаццаці старонках.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856 М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
АТ 04400 П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Адрас рэдакцыі: 220600, ГСП. Мінск, вул. Захарава, 19.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай рэдакцыі — 33-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 33-25-25, адказнага сакратара — 33-19-85, аддзела публіцыстыкі — 33-19-65, аддзела прозы і паэзіі — 33-22-04, аддзела крытыкі і бібліяграфіі — 33-22-04, аддзела мастацтваў — 33-21-53, аддзела арганізацыйна-масавай работы — 33-19-65, аддзела культуры — 33-24-62, аддзела інфармацыі — 33-24-62, аддзела мастацкага афармлення і машынапіснага бюро — 33-44-04, фоталабараторыі — 33-24-62, выдавецтва — 23-52-85, бухгалтэрыі — 23-77-65, карэктарскай — 32-20-64.

Рэдакцыя прымае і разглядае апавяданні, нарысы, артыкулы — да 12 старонак, рэцэнзіі, інтэрв'ю, карэспандэнцыі, нататкі — да 6 старонак, вершаваныя творы — не больш як 150 радкоў. Матэрыялы прымаюцца надрукаваныя на машынцы ў двух экземплярах.
Рукапісаў рэдакцыя не вяртае.

Галоўны рэдактар Алесь ЖУК.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Барыс БУР'ЯН, Мікола ГІЛЬ (намеснік галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЁДАЎ, Кастусь ГУБАРЭВІЧ, Віктар КАВАЛЕНКА, Уладзімір НЯФЁД, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Язэп СЕМЯЖОН, Юрый СЕМЯНЯКА, Віктар ТУРАЎ, Паўла УКРАІНЕЦ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ.

Адказны сакратар Пятро СУШКО.